Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЖНІЎНЯ 2007 г. СЕРАДА

№ 142 (26007)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«ЗВЯЗДА» МАЯ...

Увага, конкурс!

Адзін з неафіцыйных лозунгаў «Звязды» — да чытача з любоўю. За амаль 90-гадовую гісторыю існавання газеты супрацоўнікі яе не раз пераконваліся, што пачуццё гэта нязгаснае і ўзаемнае, якому не перашкаджаюць ні адлегласці, ні час.

Напярэдадні юбілею мы з удзячнасцю прымаем віншавальныя званкі і лісты, выслухоўваем добрыя словы і слушныя заўвагі. З цікавасцю гартаем старонкі летапісу «Звязды». Але без вас, шаноўныя чытачы, гэты летапіс няпоўны. Менавіта таму мы абвяшчаем вялікі агульны збор. Ці былі ў вашым жыцці праблемы — дробныя ці вялікія, — якія дапамагла вырашыць менавіта «Звязда»? Можа, камусьці газетная публікацыя стала кропкай у зацягнутай спрэчцы з чыноўнікамі, камусьці — нязменным дарадцам у гаспадарчай працы, а камусьці — пачаткам творчага шляху? А мо ў вашым архіве захаваліся здымкі, дзе вы разам са «Звяздой» — у самым трывіяльным або самым неверагодным месцы? Падзяліцеся, калі ласка, гэтымі гісторыямі і ўспамінамі з рэдакцыяй — вашых лістоў чакаем на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда» — з пометкай «Звязда» мая». Гісторыі абавязкова будуць надрукаваныя ў бліжэйшых нумарах, а аўтараў найбольш цікавых аповедаў і фатаграфій гарантавана чакаюць прызы.

Газеце «Советская Белоруссия» прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь

За асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці, аб'ектыўнае і ўсебаковае асвятленне пытанняў унутранай і знешняй палітыкі краіны газеце «Советская Белоруссия» прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Указ аб гэтым Прэзідэнт Беларусі падпісаў 30 ліпеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена работнікам газеты «Советская Белоруссия»

Адпаведнае распараджэнне кіраўнік дзяржавы падпісаў 30 ліпеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена першаму намесніку галоўнага рэдактара Міхаілу Лябедзіку, загадчыку аддзела камп'ютэрнага набору і вёрсткі Аляксандру Будаю, вядучаму рэдактару стылістычнаму Алене Сухінінай і старшаму карэктару Ірыне Сцяпанавай. Кіраўніком дзяржавы адзначана іх шматгадовая плённая работа, значны асабісты ўклад у развіццё беларускай журналістыкі, рэдакцыйна-выдавецкай справы.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў народную артыстку СССР Эдзіту П'еха з юбілеем

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Вы — неперайзыдзены ўзор тонкага музычнага густу, вытанчанасці, элегантнасці і цудоўнага выканальніцкага майстэрства, па праву маеце тытул каралевы эстрады, чый пранікнёны голас і меладычныя песні, якія кранаюць душу, ведаюць і любяць слухачы розных краін і пакаленняў, — гаворыцца ў віншаванні. — У Беларусі Вас цэняць як шчырага, добрага сябра, чыя творчасць пракладвае масты згоды і ўзаемаразумення паміж народамі».

Сяргей Сідорскі: Ва ўрадзе

«Прарыўныя тэхналогіі, новыя, сучасныя прадпрыемствы — аснова для далейшага развіцця нашай эканомікі»

Тры месяцы таму, калі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі інфармаваў кіраўніка беларускай дзяржавы аб выніках работы прамысловасці краіны ў першым квартале гэтага года, Аляксандрам Лукашэнкам была пастаўлена ўраду задача: ні ў якім разе не збаўляць узятых тэмпаў эканамічнага развіцця. Безумоўна, зрабіць гэта было няпроста, калі мець на ўвазе істотнае павышэнне цаны на энерганосьбіты, якія пастаўляюцца з суседняй Расіі. І ўсё ж сёння можна канстатаваць: гэта не стала сур'ёзнай перашкодай для дзейнасці большасці нашых прадпрыемстваў. Удалося захаваць, нягледзячы на ўсе складанасці, сацыяльную накіраванасць у развіцці эканомікі краіны.

Рост валавога ўнутранага прадукту за першыя шэсць месяцаў — 8,6 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Гэта больш, чым было запланавана. І яшчэ адна лічба: зніжэнне энергаёмістасці прадукцыі склала 14 працэнтаў. Значыць, многія кіраўнікі прадпрыемстваў навучыліся лічыць і эканоміць, рабіць вытворчасць сваёй прадукцыі больш таннай, а значыць — і больш канкурэнтаздольнай. Гэта было адзначана як станоўчы факт на ўчарашнім пасяджэнні Савета Міністраў, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

Тым не менш, кіраўнік беларускага ўрада ўпэўнены, што не трэба захапляцца прыгожымі агульнымі лічбамі — неабходна рэальна ацэньваць стан эканомікі. Так, сёння мы канстатуем, што колькасць стратных прадпрыемстваў па краіне скарачаецца — гэты паказчык зараз не перавышае 18 працэнтаў, але калі зірнуць на сітуацыю па канкрэтных ведамствах, то там лічбы будуць выглядаць крыху інакш. «Ёсць пытанні па некаторых прадпрыемствах», — сказаў Сяргей Сідорскі. Паводле яго слоў, у прыватнасці, па Мінпраму сёння маецца 31 працэнт стратных прадпрыемстваў. Гэта значыць, трэцяя частка эканомікі стратная, і калі адкінуць кафэ, сталовыя (невялікія суб'екты гаспадарання), то за агульнымі лічбамі, лічыць прэм'ер-міністр, мы ўбачым у цэлым не зусім спрыяльную сітуацыю.

Такое становішча не можа задавальняць. Таму неабходна ўважліва паглядзець і прааналізаваць работу стратных прадпрыемстваў — прычым літаральна кожнага з іх — каб у II паўгоддзі фінансава-эканамічныя паказчыкі былі выпраўлены. Спецыяльна створаная рабочая група пад кіраўніцтвам міністра эканомікі Мікалая Зайчанкі дэталёва вывучыць дзейнасць стратных прадпрыемстваў, глыбіню іх крызісу. Гэтая група павінна выпрацаваць радыкальныя прапановы аб тым, якія арганізацыі можна аздаравіць, а ў адносінах да якіх неабходны іншыя меры — аж да ліквідацыі і продажу актываў за сімвалічную цану дзеля засвання новых перспектыўных напрамкаў і захавання працоўных месцаў.

У той жа час як вельмі станоўчы факт работы эканомікі за гэты перыяд прэм'ер-міністр адзначыў высокія тэмпы інавацыйнага развіцця. «Мы назіраем укараненне прарыўных тэхналогій, увядзенне ў строй буйных вытворчасцяў — такіх, як новы трубны цэх на Беларускім металургічным заводзе, — сказаў Сяргей Сідорскі. — Прарыўныя тэхналогіі, новыя, сучасныя прадпрыемствы — аснова для далейшага развіцця нашай эканомікі». Таму, як лічыць прэм'ер-міністр Беларусі, менавіта на гэты напрамак неабходна звярнуць увагу ў будучым пры рэалізацыі асноўных прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

З гэтым пагадзіўся і першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка, які рабіў асноўны даклад аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў I паўгоддзі 2007 года. Паводле яго слоў, беларускія прадпрыемствы павінны навучыцца працаваць па-новаму, шукаць новыя рынкі, у тым ліку і на далёкіх кантынентах. У Беларусі ў I паўгоддзі, дарэчы, прыпынены рост адмоўнага знешнегандлёвага сальда (без уліку энерганосьбітаў). Урад зрабіў усе намаганні для таго, каб сальда гандлёвага балансу было мінімізавана. За I паўгоддзе з беларускай эканомікі за газ і нафту пайшло 2,2 млрд долараў. Цяпер адмоўнае сальда знешнегандлёвага балансу прыпынена на адзнацы 800 млн долараў. Добра, што ўсё гэта назіраецца пры значным росце замежных інвестыцый у нашу краіну (больш як 1 млрд долараў за паўгода), росце экспарту паслуг (у гэтым годзе Беларусь аказала паслуг за межамі краіны таксама больш як на 1 млрд долараў). «Трэба выходзіць на новыя рынкі — такія, як Венесуэла, Іран, Кітай, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты», — лічыць Уладзімір Сямашка.

Тым больш, што запасы гатовай прадукцыі зараз складаюць 3,4 трлн рублёў — а гэта 8 працэнтаў усяго аб'ёму вырабленай прамысловай прадукцыі. «Так што — працуйце і распрадавайце», — заклікаў Уладзімір Сямашка кіраўнікоў беларускіх прадпрыемстваў.

Адной з важных задач урада на бліжэйшую перспектыву Уладзімір Сямашка лічыць неабходнасць хутчэйшага стварэння льготных умоў для вытворчасці айчынных спажывецкіх тавараў.

— Неабходна яшчэ раз разгледзець пытанне аб мэтазгоднасці стымулявання вытворчасці спажывецкіх тавараў, гэтае пытанне разглядаецца ўжо больш як шэсць месяцаў, — сказаў Уладзімір Сямашка. Паводле яго слоў, у выпадку прыняцця такога рашэння толькі ў абутковай падгаліне адлічэнні ў бюджэт не толькі не зменшацца, яны вырастуць у 2,2 раза. Льготныя ўмовы падаткаабкладання абутковых прадпрыемстваў дазволяць праз тры гады павялічыць выпуск абутку з сённяшніх 6 мільёнаў пар у год да 40 мільёнаў. Як заявіў Сяргей Сідорскі, па вытворчасці тавараў шырокага попыту «будзем напрамую дакладваць Прэзідэнту». Прадастаўленыя прэферэнцыі павінны працаваць, а прадпрыемствы павінны выходзіць на прадугледжаныя параметры эфектыўнасці. І марудзіць з гэтым нельга, адзначаліся на пасяджэнні Савета Міністраў.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

«Гарантаваны даход» — больш за 111 тысяч

У сувязі са змяненнем бюджэту пражыткоўага мінімуму з 1 жніўня «планка даплат» пры прызначэнні адраснай сацыяльнай дапамогі павялічыцца да 111 216 рублёў.

Пры гэтым, як нагадала начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Сяргеева, адрасная сацыяльная дапамога можа прадастаўляцца ўсім сем'ям і адзінокім грамадзянам, якія не ў стане забяспечыць сабе варты ўзровень даходу па аб'ектыўных прычынах.

У цэлым за студзень—чэрвень правам на адрасную сацыяльную дапамогу скарысталіся амаль 32 тысячы грамадзян Беларусі, а сам памер штомесячных выплат у разліку на аднаго чалавека склаў 28 тыс. рублёў. Разам з тым, заўважыла Валянціна Сяргеева, ужо ў хуткім часе колькасць атрымальнікаў дапамогі павінна ўзрасці ўтрая. У прыватнасці, гэта можа стаць вынікам рашэння аб павелічэнні «планкі даплат» (або, кажучы інакш, гарантаванага грамадзянам даходу) з цяперашніх 60 да 80 працэнтаў ад бюджэту пражыткоўага мінімуму з новага года.

Сяргей ГРЫБ.

Утерянные **полисы Представительства ЗАСО «ТАСК»** в г. Мин-ске по добровольному страхованию от внезапных заболеваний и несчастных случаев на время поездки за границу **серии ТВ № 0829152, ТВ № 0829153, ТВ № 0829154, ТВ № 0849159** считать **недействительными**.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 07142

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.08.2007 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 940,15
1 латвійскі лат	4 219,95
1 літоўскі літ	851,09
1 чэшская крона	104,79
1 польскі злоты	775,35
1 расійскі рубель	83,97
1 украінская грыўня	428,79

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,5448
10 UAH	50,7778
1000 BYR	11,8917
EUR	35,0015

Курс у гандлёвых кампаніях (на 31.07.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Твае правы

30 ДЗЁН. ДАЛЕЙ — СА ЗГОДЫ

Месцам работы могуць быць не толькі «звыклыя» цэх, поле або офіс. Раз-пораз у значнай частцы з нас узнікае неабходнасць службовай паездкі. Між тым, такія паездкі — тэма для асобнай размовы. У прыватнасці, што лічыцца камандзіроўкай, ці з'яўляецца накіраванне ў яе абавязковым для выканання, колькі можа працягвацца работа «па-за асноўным» месцам і як вядзецца сам адлік «камандзіровачнага» часу? Аб гэтым і іншым — наша гутарка з загадчыкам юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімірам Іванавічам ШЭЛКОВІЧАМ.

АДЗІН ДЗЕНЬ — НЕ ВЫКЛЮЧЭННЕ

Перш-наперш трэба мець на ўвазе, што накіраванне работніка ў службовую камандзіроўку заўсёды афармляецца загадам ці распараджэннем наймальніка з выдачай адпаведнага пасведчання. Гэта ўмова з'яўляецца абавязковай. І ў тым ліку, калі гаворка ідзе аб паездцы ўсяго на адзін дзень.

— Камандзіроўкай лічыцца паездка для выканання службовага задання ў іншы населены пункт, — кажа Уладзімір Шэлковіч. — Прычым варта заўважыць, што камандзіроўкай з'яўляюцца нават службовыя паездкі ў горад, пасёлак або вёску ў межах аднаго раёна.

Разам з тым неабходна заўважыць: у выпадку, калі пастаянная работа мае перасоўны, раз'язны характар ці здзяйсняецца вахтавым метадам, службовыя паездкі да камандзіровак не адносяцца. Такія работы, у прыватнасці, могуць выкарыстоўвацца ў будаўніцтве, энергетыцы, нафтаперапрацоўцы, лясной прамысловасці, сувязі, лясной і воднай гаспадарках, на аўтамабільным, рачным і чыгуначным транспарце, у геалогіі, тапаграфіі і геадэзіі, лесабудаўніцтве, падчас навуковых экспедыцый, транспарціроўкі нафты і газу, выканання задач па ўтрыманню дарог. Пры гэтым за перасоўны, раз'язны ці вахтавы рэжым, за пастаянную работу ў шляху ці работу па-за пастаянным месцам жыхарства павінны выплачвацца надбаўкі — так званае «палявое забеспячэнне».

НА МЕСЯЦ ЗГОДА НЕ ПАТРЭБНА

Накіраванне ў камандзіроўку з'яўляецца абавязковым для выканання. Прынамсі, адмова ад яе без уважлівых прычын будзе парушэннем працоўнай дысцыпліны і можа «пацягнуць» за сабой дысцыплінарнае спагнанне. Разам з тым трэба мець на ўвазе: заканадаўства забараняе камандзіроўкі для цяжарных жанчын і жанчын, у якіх ёсць дзеці ва ўзросце да 3 гадоў. А жанчыны, у якіх ёсць дзеці ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў ці дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў, могуць накіроўвацца ў службовыя паездкі выключна з асабістай згоды.

Якіх-небудзь абмежаванняў па колькасці службовых паездак на працягу года ў нашым заканадаўстве няма. Аднак максімальны тэрмін адной камандзіроўкі не павінен перавышаць 30 каляндарных дзён. А далей патрабуецца тая ж згода.

Праўда, пры неабходнасці выканання мантажных, наладачных ці будаўнічых работ максімум можа і павялічвацца.

— Калі тэрмін службовай паездкі складае больш за 30 каляндарных дзён, то (за выключэннем тых жа мантажных, наладачных і будаўнічых работ) ёсць усе падставы казаць не аб камандзіроўцы, а аб часовым пераводзе на работу ў іншую мясцовасць, — працягвае Уладзімір Шэлковіч. — У выпадку пераводу звычайна работнік часова залічваецца ў штат новай арганізацыі, дзе, уласна кажучы, яму і робіцца выплата зарплаты. Прычым пры часовым пераводзе ў іншую мясцовасць за работнікам захоўваецца яго ранейшае месца. Але варта адзначыць, што часовы перавод пры любой раскладцы магчымы толькі пры адной умове — зноў-такі са згоды непасрэдна работніка.

НЕ «ЗАМЕСТ», А РАЗАМ

Пры службовай камандзіроўцы работніку абавязаны авансам кампенсаваць праезд да месца прызначэння і назад, наём жылога памяшкання, пражывание па-за месцам пастаяннага месца жыхарства (так званыя «сутачныя»), а таксама іншыя выдаткі — вядома, калі апошнія былі зроблены са згоды наймальніка. Дарэчы, непасрэдна памеры тых жа сутачных вызначаюцца ўрадам, і нейкім чынам «зменшыць» іх нельга. Пры гэтым вызначаць «сутачныя» на большым узроўні — поўнае права прыватных камерцыйных арганізацый.

— Тым часам адна з, на жаль, даволі распаўсюджаных сітуацый. Работніку кампенсуюць усе неабходныя камандзіровачныя выдаткі. Аднак менавіта ў сувязі з гэтым не налічваюць за дні службовай паездкі зарплату. Ці мае тут рацыю бухгалтэрыя?

— У такой сітуацыі даводзіцца канстатаваць прамое парушэнне заканадаўства, — падкрэслівае Уладзімір Шэлковіч. — За працоўныя дні знаходжання ў камандзіроўцы за чалавекам захоўваецца яго сярэдняя зарплата, і гэта зарплата павінна налічвацца ў абавязковым парадку. Што ж да выхадных, якія прыпадаюць на камандзіроўку, то яны выкарыстоўваюцца самастойна і ў будучым за іх не прадастаўляюцца адгулы — апроч выпадкаў, калі чалавек быў накіраваны ў іншую мясцовасць на выхадныя ці на святы спецыяльна.

Да слова, зарплата выплачваецца наймальнікам, які накіроўвае ў службовую паездку. Аднак на работніка, які знаходзіцца ў службовай паездцы, распаўсюджваецца рэжым працоўнага часу і часу адпачынку той арганізацыі, куды ён прыбыў.

ХВІЛІНЫ ВЫРАШАЮЦЬ ШМАТ

— Таксама папулярнае пытанне — што «ўваходзіць» у час службовай паездкі? І, у прыватнасці, ці лічыцца «камандзіровачным» дзень, калі работнік выехаў на цягніку толькі за хвіліны да апоўначы?

— Днём выбыцця ў камандзіроўку лічыцца дзень адпраўлення цягніка, самалёта ці аўтобуса або іншага транспартнага сродку з месца пастаяннай работы, а днём прыезду — дзень прыбыцця ўзгаданага транспарту зноў-такі ў населены пункт пастаяннай работы, — тлумачыць Уладзімір Шэлковіч. — Пры гэтым пры адпраўленні транспарту да 24 гадзін уключна днём выбыцця з'яўляюцца бягучыя суткі. А калі цягнік ці аўтобус адыходзіць пасля нуля гадзін — то суткі наступныя.

— Між тым, ці абавязкова з'яўленне на «асноўнай» рабоце ў дзень, калі ад'езд у камандзіроўку адбываецца позна ўвечары? Або, як варыянт, вяртанне з паездкі — ранкам?

— Час заканчэння работы ў дзень выбыцця вызначаецца выключна па дамоўленасці з наймальнікам, — заўважае Уладзімір Шэлковіч. — І такім жа чынам вырашаецца пытанне выхаду на работу ў сітуацыі, калі работнік вяртаецца са службовай паездкі да заканчэння рабочага дня.

Сяргей ГРЫБ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА МІНШЧЫНЕ — 1 МЛН ТОН ЗБОЖЖА

Па стану на 31 ліпеня ў Мінскай вобласці было намалочана 1 млн тон збожжа. Аб гэтым паведаміў учора журналістам першы намеснік старшыні Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Мінаблвыканкама Аляксандр Ліннік.

Сёлета ў вобласці неабходна сабраць збожжа на плошчы 602 тыс. гектараў. На раніцу ўчарашняга дня было скошана 321 тыс. — 53 працэнты. «Ураджайнасць складае 31,1 цэнтнера з гектара. Гэта амаль адзін да аднаго адпавядае ўзроўню мінулага года, які быў на гэту дату». Сёлета ў вобласці чакаецца валавы збор збожжа ў памеры 1 млн 800 тыс. тон. Разам з уборкай збожжа ідзе яго актыўны продаж дзяржаве. «З плана продажу ў 225 тыс. тон прададзена амаль 150 тыс. тон. збожжа», — адзначыў Аляксандр Ліннік.

На ўсёй тэрыторыі вобласці скончана ўборка азімага рапсу. «Ураджайнасць склала 17,5 цэнтнера з гектара. Мы не задаволеныя. Бо ў вобласці ёсць магчымасць атрымліваць ураджай не менш за 25 цэнтнераў». Згодна з інфармацыяй Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, па стану на раніцу 31 ліпеня ў цэлым па краіне скошана 1 млн 234 тыс. гектараў збожжавых і зернебабовых культур. Гэта складае 51 працэнт ад плошчы, што падлягае ўборцы. Намалочана 3 млн 697 тыс. тон збожжа.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

КОНТРРАЗВЕДЧЫКІ АДШУКАЛІ ПОЛЕ КАНОПЛЯЎ

Аператыўная інфармацыя, якая трапіла ў рукі ваенным контрразведчыкам, сведчыла аб тым, што побач з адной з вёсак Барысаўскага раёна Мінскай вобласці на вялікай плошчы свабодна растуць нарказмяшчальныя расліны. Праверыць гэты факт ваенныя вырашылі з супрацоўнікамі міліцыі.

Паводле даных прэс-групы ўпраўлення ваеннай контрразведкі КДБ, на месцы аператыўнікі адшукалі поле з крапівою, у зарасніках якой былі зроблены праходы, а ў глыбіні поля раслі каноплі. Контрразведчыкі ўручную сабралі і знішчылі ў агні 700 кілаграмаў дзікарослых канопляў. Аднак пасля больш дасканалага абследавання мясцовасці было выяўлена, што каноплі растуць на плошчы каля 2,5 га. Проста ўзараць гэты ўчастак з вельмі складаным рэльефам мясцовасці было немагчыма. Тады поле канопляў было апрацавана і знішчана ядахімікатамі. Мясцовыя жыхары расказвалі, што да гэтага часу канаплянае поле наведвалі наркаманы не толькі Барысаўскага раёна, але і ўвогуле Мінскай вобласці.

Сяргей КУРКАЧ.

УПРАВА НА РЭКЛАМУ

Рэкламныя ролікі, якія дэманструюцца па тэлебачанню, стануць цішэйшымі і карацейшымі. Абмежаванні, якія датычацца ўзроўню гуку роліка і паведамленняў аб наступнай трансляцыі рэкламы, а таксама абмежаванні ў часе па працягласці спынення перадач і мастацкіх фільмаў рэкламай уступяць у сілу 16 лістапада 2007 года.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, *«Мінск-Навіны».*

РНПЦ «КАРДЫЯЛОГІЯ» ПАЧАЎ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ПЕРШАЙ У БЕЛАРУСІ АПЕРАЦЫІ ПА ТРАНСПЛАНТАЦЫІ СЭРЦА

Аб гэтым на сустрэчы з журналістамі ў Мінску паведаміў дырэктар РНПЦ Ігар Адзярыха. Дырэктар НРПЦ «Кардыялогія» таксама паведаміў, што на сённяшні дзень у Беларусі ў трансплантацыі сэрца маюць патрэбу каля 100 чалавек. Кошт адной аперацыі складае каля 200 тыс. еўра. Яшчэ столькі ж спатрэбіцца, каб 10 гадоў забяспечваць пацыента неабходнымі яму медыкаментамі. Згодна з сусветнай практыкай, на працягу гэтага перыяду выжывае прыкладна 50 працэнтаў чалавек з перасаджаным сэрцам.

БЫЛЫ СТАРШЫНЯ СВК «ЗАБАЛОЦКІ» ЛЮБАНСКАГА РАЁНА АСУДЖАНЫ ДА ДВУХ ГАДОЎ ЗА СКАЖЭННЕ ДЗЯРЖСПРАВАЗДАЧНАСЦІ

У Мінскай вобласці былы старшыня СВК «Забалоцкі» Любанскага раёна Г.І. Папко за скажэнне даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці асуджаны да двух гадоў пазбаўлення волі. Аб гэтым паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна.

Суразмоўца расказала, што пракуратурай Любанскага раёна была расследавана крымінальная справа ў адносінах да былога старшыні СВК «Забалоцкі». Працуючы на пасадзе старшыні кааператыва, ён сказіў даныя дзяржаўнай статсправаздачнасці. У прыватнасці, каб пазбегнуць адказнасці за зніжэнне паказчыкаў па жывёлагадоўлі ў перыяд з мая 2005 года па кастрычнік 2006 года, Г.І. Папко даваў указанні падначаленаму работніку (галоўнаму бухгалтару) аб зламысным завышэнні даных аб валавым надоі малака. У выніку злачынных дзеянняў у дзяржстатсправаздачнасці завышаны валавы надой малака на 374,9 тыс. кг. Акрамя таго, следствам устаноўлена, што былы старшыня СВК з ліпеня па лістапад 2006 года сістэматычна выкрадаў незаконна налічаныя работнікам у сувязі з прыпіскамі надояў малака грашовыя сродкі на агульную суму Вr764 тыс., якія знаходзіліся ў касе СВК. Таццяна Калініна паведаміла, што Г.І. Папко было прад'яўлена абвінавачанне па арт. 427 ч. 2 і арт. 210 ч. 1 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Прыгаворам суда Любанскага раёна ад 11 ліпеня гэтага года ён прызнаны вінаватым па ўсіх эпізодах прад'яўленага абвінавачання і асуджаны да 2 гадоў абмежавання волі.

Кар. БЕЛТА.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ Ў ЖНІЎНІ

2 чацвер *з 14.30 да 19.30*
4 субота *з 16.30 да 22.00*
9 чацвер *увесь дзень*
10 пятніца *з 12.00 да канца дня*
11 субота *да 10.00*
13 панядзелак *з 12.30 да 17.00*
15 серада *з 20.00*
16 чацвер *да 3.00*
18 субота *з 11.30 да 15.00*
21 аўторак *з 0.30 да 4.00*
23 чацвер *з 12.00 да 14.30*
25 субота *да 21.30*
28 аўторак *з 0.30 да 1.30*
30 чацвер *да 3.30*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НЕВЯДОМЫЯ АБРАБАВАЛІ КВАТЭРУ СЕГАЛЕН РУАЯЛЬ

У прыгарадзе Парыжа Булонь-Біянкур у мінулыя выхадныя невядомыя абрабавалі кватэру экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Францыі Сегален Руаяль.

Як паведаміла ў аўторак газета Parisien, злодзеі праніклі ў кватэру Руаяль учора ў суботу, калі ў доме знаходзіўся толькі адзін з сыноў прадстаўніцы сацыялістычнай партыі.

На думку прадстаўнікоў следства, прысутнасць маладога чалавека спужала злодзеяў, і яны павінны былі хутка рэціравацца, прыхапіўшы пры гэтым, аднак, ноутбук і невялікую суму грошай.

У РАСІІ ЦЯПЕР МОЖНА КУПІЦЬ ЦАЛКАМ ВЁСКУ

«Група кампаній «Удача» стварыла беспрэцэдэнтную прапанову. Упершыню прапаноўваюцца не проста дамы ў вёсках, а вёскі цалкам. Вёскі, размешчаныя ў Цвярской вобласці на берагах рэк і нанесеныя на карту». Такая рэклама сёння — нярэдкасць у расійскіх СМІ. Як паведамляецца, напрыклад, у адной з іх, «прапанова разлічана на тых, хто хоча стварыць сабе радавое памесце, хто задумваецца пра сваю ролю ў гісторыі, хто шукае адасаблення і зліцця з прыродай».

Гэта — прапанова і для тых, хто гатовы выконваць і сацыяльную функцыю: у планах развіцця вёскі як населенага пункта стаіць прыцягненне людзей, якія жадаюць займацца фермерствам ці ўвогуле сельскай гаспадаркай. Як лічыцца, падобныя прапановы разлічаныя на тых, хто хоча не толькі ўзвесці сядзібу, але і ажывіць рускую вёску, адбудаваць і развіць населены пункт, адрадзіць рускі быт і рускую гісторыю. Вось што, напрыклад, прапаноўваецца багатым грамадзянам, якія вырашылі стаць новымі памешчыкамі: два гектары зямлі катэгорыі «землі населеных пунктаў, гэта нанесены на карту свой уласны свет, гэта — ближэйшыя суседзі не «за плотам» і не «цераз дарогу», а ў суседняй вёсцы, гэта — абсалютная экалогія, забяспечаная абсалютным валоданнем усёй тэрыторыі вёскі, гэта — магчымасць фарміраваць свой уласны населены пункт, узводзячы дамы для родных, блізкіх і аднадумцаў, магчымасць увайсці ў гісторыю як аднаму з першых памешчыкаў у навейшай гісторыі Расіі».

ПАМЁР СЛАВУТЫ ІТАЛЬЯНСКІ РЭЖЫСЁР АНТАНІЁНІ

На наступны дзень пасля смерці шведскага рэжысёра Інгамара Бергмана пайшоў з жыцця класік італьянскага неарэалізму Мікеланджэла Антаніёні: ён памер на 95-м годзе жыцця.

Сярод яго работ — «Хроніка аднаго кахання», «Прафесія — рэпарцёр», «Чырвоная пустыня», «Зацьменне» і іншыя. Вялікі кінарэжысёр быў лаўрэатам многіх узнагарод — ён атрымліваў прызы Венецыянскага, Канскага, Берлінскага кінафестываляў, а за ўклад у сусветную культуру быў узнагароджаны ганаровай прэміяй «Оскар».

САБАКУ — НА ГАДЗІНУ

У свеце распаўсюджваецца новая паслуга для тых, хто любіць жывёл, але не мае часу гадаваць іх у сябе дома. Як піша газета «Дэйлі тэлеграф», яны цяпер могуць скарыстацца сістэмай... пагадзіннага пракату жывёл.



Апошняя інавацыя прыйшла з Каліфорніі. У гэтым штаце ўжо вынайшлі пякарню для жывёл, якія прадаюць пячэнне ў форме пастальёнаў (прадстаўнікі гэтай прафесіі найбольш часта церпяць ад пакусаў). Новая задумка падаецца як «унікальная магчымасць для тых, хто любіць сабак, але не можа дазволіць сабе пастаянна мець сабачку, пры гэтым сумуючы без кампаніі чацвераногага сябра». Члены клуба плацяць штогадовыя ўзносы ў памеры 100 долараў, а таксама 40 долараў за дзень «пракату» сабакі ў выхадныя, 24 долары — у будні.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

АСБ «Беларусбанк» сообщает, что в период с 1 августа по 30 сентября (включительно) учреждения банка будут производить выдачу кредитов в белорусских рублях

«К учебному году»

сроком пользования до 1 года с уплатой 13 % годовых (для граждан, постоянно проживающих и работающих в сельских населенных пунктах – 12 % годовых). Предоставление кредита осуществляется как в безналичном порядке, так и наличными деньгами.

Предлагаем также воспользоваться и другими услугами, имеющимися в банке.

Будем рады видеть Вас клиентами АСБ «Беларусбанк».

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка

http://www.belarus-bank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

УП «Минский городской центр недвижимости»

информирует, что аукцион по продаже квартир в доме № 49 по ул. Притыцкого назначенный на 8 августа 2007 года переносится в театральный зал Центрального Дома офицеров по адресу: г. Минск, ул. Красноармейская, 3.

Звязда–90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося 8 дзён

Калектыву рэдакцыі

Ад імя Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу і ад сябе асабіста шчыра і сардэчна віншую вас з надыходзячым вялікім святам — 90-годдзем з дня заснавання газеты «Звязда». Амаль стагоддзе рукі, вочы і душы беларусаў кранаюцца газеты, якая па праву лічыцца самай аўтарытэтнай і самай лепшай сярод беларускамоўных сродкаў масавай інфармацыі. Газеты бываюць рознымі: шматтыражнымі і не вельмі, каляровымі і чорна-белымі, ды галоўнае тое, што наша «Звязда» ніколі не была і, веру, не будзе шэрай і нуднай па зместу, у яе заўсёды будзе шматлікі і ўдзячны свой чытач.

«Звязда» ў лепшы бок адрозніваецца ад іншых выданняў тым, што не засяроджваецца на нейкім вузкім напрамку, а ў кожным нумары праўдзіва, без скептыцызму і прыхарошвання, шляхам асвятлення падзей у палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах дзейнасці беларусаў паказвае развіццё Рэспублікі Беларусь ва ўсіх яго шматгранных выяўленнях. Як гэта ні складана, але для кожнага нумара выданню ўдаецца знайсці прывабны для чытача матэрыял і своечасова, без спазнення яго надрукаваць.

Спалучаючы высокі навуковы ўзровень, практычную накіраванасць і даступнасць слова, «Звязда» стала своеасаблівай трыбунай для абмену перадавымі ідэямі паміж вучонымі, міністрамі, палітыкамі ўсіх узроўняў, прадстаўнікамі грамадскасці і звычайнымі працоўнымі людзьмі. Менавіта таму газета вельмі запатрабавана сярод шырокага кола чытачоў. Яе чытаюць усюды — і ва ўстановах, і ў кватэрах, у скверах і электрычках. Яе не проста чытаюць ад першай паласы да апошняй, а да меркаванняў, выказаных на яе старонках, прыслухоўваюцца.

Мае газета пастаянную «прапіску» і ў кожнай нашай парламенцкай камісіі. І гэта заканамерна. Як чалавек, выбраны на дэпутацкую працу народам, скажу так: «Звязда» — сапраўднае нацыянальнае выданне, газета нашай краіны. Не паважаць яе, не чытаць яе дэпутату — значыць быць адарваным ад беларускага народа. Цяжка пераацаніць значэнне «Звязды» ў захаванні роднай беларускай мовы, якая з'яўляецца важнейшай прыкметай дзяржаўнасці, і ў выхаванні сапраўднай беларускасці ў кожным з пакаленняў жыхароў краіны. Вашу газету паважалі ва ўсе часы. У мяне захавалася паштовая марка саракагадовай даўнасці, прысвечаная юбілею Камуністычнай партыі Беларусі, з выявай не якой-небудзь іншай газеты, а менавіта «Звязды». Дасылаю вам гэта гістарычнае сведчанне.

Ганаруся і ўдзячны газеце за тое, што і сам з'яўляюся не толькі яе чытачом, але і аўтарам шэрагу артыкулаў, надрукаваных у «Звяздзе», які карыстаецца магчымасцю даносіць да выбаршчыкаў інфармацыю аб заканатворчай дзейнасці камісіі, а таксама ўласныя думкі аб жыцці нашай краіны праз публікацыі ў гэтым шаноўным выданні.

Родніць мяне з газетай і тое, што з'яўляюся двайным цёзкаю намесніка галоўнага рэдактара «Звязды», якога завуць гэтак жа, як і мяне, Уладзімірам Здановічам. Наогул, добра ведаю калектыў рэдакцыі і лічу яго своеасаблівым востравам інтэлігентнасці, добразычлівасці і адданасці сваёй справе. Упэўнены, што ваша творчая думка не спыніцца, не замкнецца на дасягнутым і, як і раней, усё, што друкуецца на старонках роднай беларусам газеты, не пакіне раўнадушным ні аднаго чытача.

Дзякуй вам усім за прафесіяналізм, празорлівасць і мудрасць.

Міру і шчасця кожнаму вашаму дому, сямейнага цяпла, утульнасці і дабрабыту.

З вамі і для вас,
Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу
Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ЖНІЎНЫ ВОДАР РУПНАСЦІ

Памятаю леташнія зажынкі ў СВК «Пяршаі-2003» Валожынскага раёна. Спякотны дзень. Камбайны выстраіліся адзін за адным на ўскрайку масіва, нецярпліва гудуць маторы. А поле як карцінка — роўнае, чыстае, ні травінкі, збажына золатам адлівае. Яна настолькі шчыльная, што, здаецца, кінь на яе куртку, не сагнецца. Людзі стаяць радасна ўзрушаныя: вось ён, плён іх рук дбайных, аснова асноў жыцця — хлеб. Старшыня праўлення Яўген Скрундзь пасля кароткага слова з найлепшымі пажаданнямі «на дарогу» дае адмашку рукой. Экіпажы толькі чакалі гэтага знака. Камбайны шнурком рушылі да сваіх загонак. На густым іржышчы, вострым як вожыкавыя калючкі, не раўнуючы, гэтак жа густа, з'явіліся шчыльныя капніцелі саломы.

Пасля першага круга агрэгаты прыпыніліся. Галоўнаму аграному Раману Голубу бераўліва перасыпае з далоні ў далонь прыгаршчню яшчэ цёплага першага намалочанага збожжа майстравіты камбайнер Аляксандр Жамойдзік. Тэхнолаг палёў крочыць насустрач старшыні. Яны пільна разглядаюць зярняты, пра нешта гавораць. Твары іх хмурнеюць. Якраз і аблокі засланяюць дагэтуль яркае сонца. Напружана сочаць за кіраўнікамі экіпажы.

Яўген Яўгенавіч быццам губляе святочны настрой зажынак. Паказвае зярняткі. Яны дробныя, лёгкія.

— Цэнтнераў на шэсцьдзесят разлічвалі, і во на табе, — расчаравана сціскае пальцы старшыня. — Падпаліла гарачыня, наліцца толкам не паспела. А гэтулькі працы ўклалі!..

І падбадзёрваючы камбайнераў, відаць, і сябе, выгукнуў:

— Нічога, хлопцы, будуць і лепшыя ўчасткі! Роспачы — не месца, за работу.

Цяжкі леташні ўраджай «прынёс» у засекі гаспадаркі звыш 8 тысяч тон збожжа. Разлічвалі на большае, але і гэты вынік зусім не благі. З дзяржавай разлічыліся, шматлікае пагалоўе жывёлы забяспечылі фуражом.

...За рулём запыленага «ўазіка» Я. Скрундзь разам з галоўным бухгалтарам Г. Русовіч толькі што аб'ехалі жніўныя палі. Па іх настрою адчуваецца, што справы там ідуць добра. Першае пытанне да іх, вядома ж, пра намалоты.

— Нічога, нешта ёсць, лічыць у свірнах будзем, — сціпла кажа старшыня.

На полі за вёскай Агароднікі, якая прытулілася ў даволі глыбокай лагчыне, ахінулася разлапістымі садамі шырокае поле трыцікале. Назву паселішчу далі, мусіць, агароды з рознымі буракамі, цыбуляй ды морквай, якім тут было вельмі прывольна ў сонечным зацішку. Цяпер хаты тут на пальцах злічыць можна, як і шчодрыя градкі. А вось збажына ўдалася, колас тугі, здаецца, толькі крані — пырсне налітым зернем.

Камбайнер Аляксандр Клімовіч спыніў агрэгат, каб выгрузіць збожжа:

— Круг зраблю — поўны бункер! Хлопцы вунь упарыліся адвозячы, — ківае на вадзіцеля МАЗа Мікалая Сівіцкага, які не вытрымаў, забраўся ў кузаў, падставіў далоні пад цёплы духмяны струмень. — Але спраўляюцца. Прастояў у нас няма.

Яўген Яўгенавіч дадае:

— Аляксандр стала працуе шафёрам. На жніво падахвоціўся сесці за штурвал камбайна. Што казаць, пульсуе хлебаробская жылка, не дае спакою. Ёсць у нас камбайнеры спрактыкаваныя, намнога больш вопытныя, але вось пасуюць перад энтузіязмам і маладосцю.

— Ніхто не ўмее так, як ён, выгружаць збожжа, — падтрымлівае старшыня. — Ніводнага разу не прымусіў чакаць. Ды і ў механізатарскай справе ён не апошні чалавек. Ведае, што ў кожнага свой характар, свае слабасці, і ўмее да кожнага падыскаць свой ключык. Таму і ў калектыве ў нас ціхая, спакойная атмасфера.

Аляксандр Станіслававіч больш за ўсіх намалочвае, лідар.

Пабываўшы на розных участках жніўнага канвеера, пераконваешся, што адладжаны ён як след, збояў не дае. Быў затор на таку — слабаватая сушыльная гаспадарка. Але яна зусім нядаўна падмацавана новым комплексам, які давядзіць да патрэбных кандыцый за суткі 600 тон збожжа. Працуе ён на прыродным газе. Не танным. Але выкарыстоўваецца яно з поўнай аддачай, ашчадна. Кааператыў эканамічна моцны і ў стане своечасова аплачваць блакітнае паліва.

Мяркуюць мець сёлета не менш чым дзесяць тысяч тон збожжа. Гэта — не самамэта. Гэта — у першую чаргу, эканоміка. Прадукцыя раслінаводства — тавар сезонны, круглагадовы ж «манетны двор» знаходзіцца на жывёлагадоўчых фермах. Малаком, свінінай і ялавічынай «куюць» там рубель надзённы, які так патрэбен і на своечасовую выдачу зарплаты, і на абнаўленне асноўных фондаў. Гаспадарка трымае 3200 галоў буйной рагатай жывёлы, 730 кароў, 15 тысяч свіней. На «апетыт» яны, дзякуй Богу, не скардзяцца. А ён — галоўны спусташальнік грамадскай касы. Таму зніжэнне сабекошту фуражу, нарыхтоўка яго пад поўную патрэбнасць самым непасрэдным чынам стымулююць эфектыўнасць жывёлагадоўчай галіны.

За апошнія пяць гадоў валавыя зборы збожжа тут павялічылі ўдвая — з 4,5 тысячы тон. Безумоўна, адпаведна падрос і сабекошт яго вытворчасці: мінеральныя ўгнаенні, новыя інтэнсіўныя гатункі, сучасныя машыны каштуюць не малых грошай. Зразумела, што без пастаяннага, прадуманага ўкаранення прагрэсіўных тэхналогій, дасягненняў навукі няма руху наперад. Адстаўшы аднойчы, назаўсёды застанешся ззаду, канкурэнты не паважаюць слабага і высунуцца яму не дазволяць.

Каб гэтага не здарылася, Я. Скрундзь і яго паплечнікі чуйна трымаюць руку на пульсе часу. Скажам, гаспадарка адной з першых у краіне пачала займацца плюшчэннем збожжа. Здаецца, аперацыя нясхітрая: што тут такога, працірай тое зерне, як рабілі гэта ў вёсцы спакон веку, ды і кідай у кармушку. Не ўсё так проста! Да новай тэхналогіі прыстасавання і захоўвання фуражу ішлі спакваля. Вывучаў старшыня вопыт фінаў і немцаў, англічан. Не прагарэць бы... І вось пабудавалі бетонную траншэю накшталт той, куды сянаж ці сілас трамбуецца. Набылі дзве фінскія плюшчылкі. Чаму вытворчасці гэтай паўночнай краіны? Ды там умовы надвор'я прымусілі мясцовых земляробаў раней за іншых ураджаіць нескладаны спосаб прыстасавання корму без лішніх затрат сродкаў і часу.

У жніво гэта рашаючыя фактары. Пачынаць яго можна раней, калі вільготнасць коласа за 35 працэнтаў. Колькі трэба «спаліць» грошай, каб давесці да ладу, высушыць. Пры тым тэмпература 300—350 градусаў згубна дзейнічае на многія біялагічна актыўныя, карысныя рэчывы ў зерні. Тут жа яны захоўваюцца поўнасцю.

Тое, што летась бясконца дажджлівым жніўнем не дапусцілі страт на ўборцы, яскравае сведчанне пераваг новай тэхналогіі. Праз дзве плюшчылкі фінскай фірмы «Мурска» чатыры чалавекі прапусцілі 5 тысяч 700 тон збожжа. На кожныя трыста тон спатрэбілася па тоне кансерванта АІФ з той жа Фінляндыі. Ён зарэкамендаваў сябе найбольш надзейным, хоць каштуе нямала — тысячу долараў за тону. Дарэчы, распрацоўшчык яго атрымаў у свой час Нобелеўскую прэмію. Але затраты акупляюцца «з гакам» прыбаўкамі ў вазе кормнікаў, надоямі малака. Сёлета тут возьмуць сямітысячны рубеж па надоях — таксама падваенне за пяць гадоў.

Цяпер вільготнае збожжа ад камбайнаў паступае зноў на плюшчылкі. Навокал сховішча стаіць непаўторны водар быццам толькі што спечанага хлеба. Запраўляюць гаспадаркай Іосіф Іосіфавіч Кебіч з сынам Дзмітрыем, які скончыў дзевяць класаў і збіраецца паступаць у будаўнічы каледж. Старэйшы яго брат ужо вучыцца ў Беларускім дзяржаўным аграрна-тэхнічным універсітэце, таксама прайшоўшы бацькавы «ўніверсітэты».

Потым гэтую хлебную масу загорнуць шчыльна ў поліэтыленавую плёнку, зверху нагрувасцяць мяшкі з пяском, каб на кожным квадратным метры стварыць ціск у 700 кілаграмаў. Праз некаторы час корм гатовы для ўжывання.

Як сцвярджае Я. Скрундзь, жывёла аж кармушкі вылізвае, паядаючы гэтую здобраную яшчэ і мікрадабаўкамі масу. Але хвалюе яго тое, што эфектыўнасць прыгатаванага корму магла б быць значна большай. Патрэбна здрабненне яго непасрэдна перад ужываннем.

— Няма такой машыны, — уздыхае Яўген Яўгенавіч. — Тры гады шукаем, просім. Да нас прыязджаюць вучоныя, канструктары, згаджаюцца, што агрэгат у прынцыпе не складаны, абяцаюць зрабіць... Сфатаграфуюцца на фоне траншэі, экзотыка... А мы нясём страты. Бо значная частка фуражу праходзіць праз страўнік жывёлы «транзітам», не засвойваецца. А гэта згубленыя прывагі, надоі, у рэшце рэшт, эфектыўнасць усёй папярэдняй работы. Вучоныя, на жаль, у распрацоўцы тэхналогіі кармлення паўтараюць практыкаў, а не прапануюць больш эфектыўныя метады.

ДАРЭЧЫ. Гаспадаркам Міншчыны даведзена сёлета заданне закласці ў траншэі і поліэтыленавыя рукавы не менш чым 80 тысяч тон сплюшчанага вільготнага збожжа і кукурузы.

Пяршайцы закансервуюць 3,5 тысячы тон. А гэта не толькі выдатны корм, але і эканомія энергарэсурсаў, скарачэнне тэрмінаў уборкі, павышэнне эфектыўнасці галіны.

Мікалай ШЛОМА.

НА ЗДЫМКАХ: камбайнер Аляксандр КЛІМОВІЧ; вадзіцель Мікалай СІВІЦКІ; ідзе плюшчэнне збожжа і яго трамбоўка.

Фота аўтара.

Алкаголікі ў кароткіх штоніках

«Спіртавая багна» паглынае не толькі дарослых, але і дзяцей

Адбылася калегія МУС, падчас якой сярод іншага былі абмеркаваны і вынікі працы па выкананню прэзідэнцкага Дэкрэта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях» і абмяркоўваліся праблемы барацьбы з п'янствам у грамадстве.

Асабліва непакояць міліцыю выпадкі, калі да спіртнога прызвычайваюцца дзеці. За ўжыванне спіртных напояў пастаўлены на ўлік 4,5 тысячы падлеткаў, 83 дзіцяці ўжо маюць медыцынскі дыягназ «алкагалізм». Як падкрэсліў міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, міліцыя будзе засяроджваць сваю ўвагу на ранняй прафілактыцы п'янства і бытавой злачыннасці, каб не дапусціць уцягвання дзяцей у гэтую «багну». Увогуле, праблема крыміналізацыі новага пакалення непарыўна звязана з крызісам сямейных адносінаў.

Зараз на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх знаходзяцца больш за 17 290 дзяцей. Дык вось, амаль палова гэтых цяжкіх падлеткаў — з няпоўных сем'яў, каля тысячы — сіроты. Агульнавядома, што менавіта цяжкія падлеткі схільныя да парушэння закона. Сёлета, праўда, дзякуючы супрацоўнікам міліцыі і работнікам іншых зацікаўленых ведамстваў, удалося адвесці дзясяткі ад крымінальнай сцежкі.

Паводле звестках Міністэрства ўнутраных спраў, за першую палову гэтага года непаўналетнімі здзейснена 3275 злачынстваў, што на 20,6 працэнта менш, чым за аналагічны леташні перыяд. Натуральна, што і ў «турэмныя клеткі» дзеткі сталі трапляць не так часта. Зараз у выхаваўчых калоніях знаходзяцца 445 непаўналетніх.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Крымінал

БОМБУ ШУКАЛІ Ў ШКОЛЕ

Дзяжурнаму ўпраўлення МНС па Віцебскай вобласці патэлефанаваў невядомы і паведаміў, што будынак віцебскай сярэдняй школы № 31 замінірованы. Аб гэтым выратавальнікі паведамілі ў міліцыю.

Паводле даных прэс-цэнтра УУС Віцебскага аблвыканкама, устаноўлена, што «пра бомбу» ў навучальнай установе паведаміў беспрацоўны 16-гадовы жыхар вёскі Баронікі Віцебскага раёна, які быў затрыманы, і супраць яго узбуджана крымінальная справа. Высветлена, што «тэрарыст» тэлефанаваў з аўтамата, што знаходзіцца на тэрыторыі віцебскага «Смаленскага рынку». У выніку яго неразумнага жарту са школы прыйшлося эвакуіраваць 40 школьнікаў і 12 настаўнікаў. Сапёры вайсковай часці ўнутраных войскаў МУС уважліва агледзелі будынак школы, але ніякіх выбуховых устройстваў і г.д. не знайшлі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЫ ЯШЧЭ І ДА ДРЭВА ПРЫВЯЗАЎ

Чым кіраваўся беспрацоўны 34-гадовы мужык з Жыткавіч, калі прымусіў падманам сесці ў сваю легкавушку для «прыемнай размовы» другога мужыка, зараз устанаўлівае следства. Вядома ж толькі, што ён завёз яго ў лес і там даў волю сваім кулакам, збіўшы апошняга на горкі яблык. А ў дадатак яшчэ да дрэва прывязаў. Маўляў, камарам на ласунак. Няшчаснага вызвалілі з вяровак людзі, якія праходзілі праз восем гадзін міма. Крыўдзіцель за здзекі над чалавекам панясе адказнасць.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

УВОДЗІЦЦА АБМЕЖАВАННЕ НА ПРОДАЖ АЛКАГОЛЬНЫХ НАПОЯЎ

У Віцебскай вобласці з 1 жніўня ўводзіцца абмежаванне на продаж алкагольных напояў. Аб гэтым паведамілі ва УУС Віцебскага аблвыканкама.

Рэалізацыя спіртнога, акрамя слабаалкагольных напояў, ва ўсіх магазінах будзе дазволена толькі да 23.00. Пры гэтым у гандлёвых аб'ектах плошчай менш за 25 кв. м забарона на продаж распаўсюджваецца і на слабаалкагольныя напоі (піва і г.д.). У аб'ектах грамадскага харчавання абмежаванне на рэалізацыю алкаголю ўводзіцца на гадзіну пазней. Выключэнне складуць установы першай і вышэйшай нацэначнай катэгорый. Паводле слоў супрацоўнікаў, гэтая мера накіравана на папярэджанне распаўсюджвання п'янства ў рэгіёне, асабліва ў яго сельскіх раёнах і зніжэнне ўзроўню злачыннасці. Эфектыўнасць такой меры пацвярджае вопыт многіх еўрапейскіх краін. Таму ў карысці гэтага новаўвядзення і ў Віцебскай вобласці супрацоўнікі УУС не сумняваюцца, бо толькі за першае паўгоддзе ад атручэння алкаголем у рэгіёне загінулі 226 грамадзян — гэта самы высокі паказчык у Беларусі. Больш як 80 працэнтаў злачынстваў у вобласці ўчынена ў стане алкагольнага ап'янення.

Вольга ДАВЫДАВА, БЕЛТА.

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...СТАЦЬ МІЛЬЯРДЭРАМ,

або Дзе шукаць дрэвы, на якіх растуць залатыя талеры...

Блакітная, руковая мара кожнага чалавека — зарабіць аднаразова мех грошай. Ці нават два мяхі, а можа — пяць або дзесяць. Галоўнае, каб без усялякіх намаганняў. Вось прачнуцца б аднойчы паважаным чалавекам, мільярдэрам, з яхтай каля свайго ўласнага кавалачка марскога берага і з незлічоным лікам грошай на банкаўскім рахунку. Марыць пра цуд вельмі карысна, таму што падсвядома вызначаеш перад сабой шляхі для дасягнення мэтаў. Але гэта так, асабістыя назіранні. Можна, як даведаўся я з невыказнай надзеяй, не толькі ў казках раптоўна стаць буржуем. Прычым шанц гэты міласціва даецца кожнаму. Галоўнае, як кажуць, ведаць запаветнае месца.

Поле цудаў такое ў нас ёсць. Прычым з'явілася яно якраз у той час, калі насельніцтва пачало задумвацца, куды ўкладваць назапашаныя грошы ў беларускіх рублях і замежнай валюце. Можна традыцыйна ў банк, але гэта ўжо, як нашэптваюць у модных серыялах, не папулярна. Калі жадаеш прыбытку, грошы павінны быць «у абарачэнні», гэта ведае ўжо кожнае немаўля. Вось толькі акрамя разумення трэба мець, як мінімум, грунтоўныя веды, а як максімум — яшчэ і назапасіць вопыт фінансавых аперацый. Чым, шчыра кажучы, валодае далёка не кожны чалавек. А вось імкненне адхапіць вялізны кавалак шчасця ў пераліку на грошы досыць у кожнага. Чалавек — натура вельмі разнастайная. Гэтым і карыстаюцца, прычым нават не тоячыся. Хто карыстаецца? Даведаемся.

Долар прадаў — два зарабіў

Здаецца, у нашай краіне людзі не схільныя давяраць свае ўласныя сродкі, якія зароблены руплівай працай, сумніўным арганізацыям. Ды і жахі наконт грашовых пірамід, інвестыцыйных фондаў, акцыянерных таварыстваў-прывідаў і іншых дасканала выпрацаваных механізмаў па «выбіванню» грошай, якія дзейнічалі і яшчэ сустракаюцца на прасторах краін-суседак, заселі ў галаве моцна. Тое, што ў Беларусі няма кампаній аналагічнага характару, безумоўна, заслуга праваахоўных органаў. Махлярскім схемам аб'яўлена бескампрамісная вайна, затое, як пераканаўся карэспандэнт «Звязды», можна абсалютна празрыста, з аплатай усіх падаткаў і адлічэнняў у дзяржаўную казну зарабляць на... марах аб вялікіх грошах. Прычым скаргаў з боку пацярпелых не будзе, і судовую справу яны ніколі не распачнуць, і нават грошы іх ніхто не збіраецца прысвойваць. Іх сумленна папярэджвалі аб рызыцы страты ўласных сродкаў, якімі, дарэчы, яны самі і распараджаюцца. Пры тым усё адбываецца як абяцаюць у казцы пра Пінокіа — спачатку пасадзіш у зямлю тры манеты, а наступнай раніцай яны буйна заквітнеюць залатымі дрэвамі. Прычым, зноў паўтаруся, без усялякага «ўтоенага» сэнсу, дзейнасць арганізацый гэтых законная абсалютна.

Размова ідзе пра заклікі ўступіць у набіраўшую ў нашай краіне моц гульню на міжнародным валютным рынку, які мае назву Forex. Хто часта ездзіць у метро ці гартае газеты, напэўна, бачыў паведамленні і заклікі: «Хочаш зарабіць на біржы? Запішыся на бясплатны семінар». Студэнты, хатнія гаспадыні, часова беспрацоўныя і тыя, хто лічыць сябе асобай, генію якой не пашчасціла адбыцца ў іншых сферах жыцця, асабліва бадзёра, з надзеяй (сам бачыў) упіваюцца ў нумар тэлефона, які надрукаваны пад аб'явай.

Пры тым, што міжнародны валютны рынак Forex і сапраўды існуе ўжо больш за трыццаць пяць гадоў. Кожны дзень мільёны людзей на ўсёй планеце праз Інтэрнэт ці іншым шляхам купляюць праз гэты рынак за свае грошы, якія знаходзяцца на ўласным банкаўскім рахунку, валюту па ніжэйшаму курсу, а прадаюць яе — па вышэйшаму. Розніца, як няцяжка здагадацца, і ёсць прыбытак. Прытым курсы гэтыя вызначаюцца адносінамі адной валюты да другой. Адны з самых папулярных — курс еўра адносна курса долара. Напрыклад, на міжнародным валютным рынку раніцай адзін еўра каштуе два долары. На банкаўскім рахунку ў чалавека ёсць тысяча долараў. Значыць, прадаўшы 1000 долараў па гэтаму курсу, можна набыць 500 еўра (тысячу падзелім на два). Потым, праз тры гадзіны, у абед, суадносіны курса аднаго еўра стануць роўнымі ўжо тром доларам. А на рахунку замест «амерыканцаў», як памятаем, знаходзяцца ўжо 500 еўра. Зноў пераводзім іх у долары, аднак ужо па зменendаму курсу ў тры долары за адзін еўра замест ранішніх двух. Памнажаем 500 еўра на 3 і атрымліваем вынік у 1500 долараў. Вось так з першапачатковых тысячы долараў можна атрымаць за адзін раз яшчэ $500. Курс валюты хістаецца кожны дзень па некалькі разоў, і чалавек, які сядзіць каля манітора і бачыць гэта пры дапамозе спецыяльнай праграмы, аддае каманду камп'ютару, які праз сусветнае «павуцінне» звязваецца з банкам, і пераводзіць адну валюту ў другую.

Менавіта такі занятак і прапануюць у Беларусі створаныя, нібыта пасля дажджу, фінансавыя кампаніі, цэнтры інвестыцый, кансалтынгавыя агенцтвы ці прыватныя асобы. Прычым, зноў жа, красці грошы ў вас ніхто і не збіраецца, Forex працуе бездакорна, рэпутацыя яго ў свеце як інструмента для валютных спекуляцый цудоўная, і ўсё, што зарабляецца, застаецца на банкаўскім рахунку, да якога мае доступ толькі яго гаспадар. За дзень абарот на міжнародным рынку можа дасягнуць чатырох трыльёнаў(!) долараў. Таму, калі абмен валюты пройдзе паспяхова, увесь прыбытак вы атрымаеце цалкам, і ніхто на яго не будзе прэтэндаваць. Гэта гарантавана.

Тады дзе знаходзіцца пастка, дзе падвох? А яго няма. Вы самі сябе падманеце...

У іх пра гэта і падлетак ведае...

Калі аб'ява вас зацікавіла, і магічнае словазлучэнне «міжнародны валютны рынак» прыцягвае да сябе, тады, калі ласка, на азнаямленчы семінар. Дарэчы, адзін з капіталістаў, вядомы Джордж Сорас, зарабіў у пачатку дзевяностых гадоў мільярд долараў менавіта на гульні на рынку Forex. Тады ён адмыслова абрушыў курс англійскага фунта стэрлінга, што выклікала ў краіне фінансавую паніку. Колькі ж яму для гэтага спатрэбілася ўкласці грошай, ніхто не ведае. Прынамсі, і не трэба, яны ў яго і так былі. Пра знакаміты выпадак са спадаром Сорасам абавязкова згадаюць вам на першым, бясплатным пакуль што семінары для будучых біржавых акул — гэта для мяне і тых, хто быў у пакоі на ўводнай лекцыі, прызначанай для юных і не зусім геніяў Forexa. Адны з першых фраз адносна маладога, але па ўсім відаць, ужо мацёрага, апранутага ў якасную белую кашулю і чорныя штаны ад італьянскага дызайнера, «мажора»:



— Гэтай справай вы можаце займацца ў свабодны ад паўсядзённай галечы час (трэба разумець з яго слоў, так ён пазначыў спосаб заробку і вынік ад гэтай дзейнасці для ўсіх прысутных. — **Аўт.**)

Што гэта за дзейнасць, якая выцягне нас усіх з галечы, пакуль не было зразумела.

— Багатыя становяцца яшчэ больш багатымі, і пры гэтым нічога не робяць. Сёння вы зразумееце, чаму так адбываецца. Яны прымусілі працаваць на сябе ўласныя грошы. У заходніх краінах з кожным годам колькасць мільянераў павышаецца. Вы спытаеце, чаму? Зараз зразумееце — працягваў наш гуру. Прысутныя перасталі дыхаць. Бабуля выцягнула ўсё ж такі хусцінку і так і застыла з ёю. — Усё з таго, што яны займаюцца спекуляцыяй на сусветных валютных і іншых біржах. Толькі і робяць, што памнажаюць свой капітал, не прыкладаючы пры гэтым ніякіх намаганняў. Сёння я раскажу вам, як гэта можаце зрабіць і вы...

Ганаровае маўчанне на паўхвіліны парушыла пенсіянерка, якая пачала выкарыстоўваць сваю насоўку па яе прамому прызначэнню. Эфект ад моманту стаў крыху прыглушаным...

Далей пайшоў расказ, дастаткова не зразумелы, перанасычаны спецыяльнымі тэрмінамі і англійскімі словамі. Адзінае, што прыбліжала гэтага далёкага ад нашых паўсядзённых клопатаў у пошуку кавалачка хлеба (таксама тэрмін нашага лектара), да нас, простых смяротных, было тое, што ў яго высокую мову прафесійнага капіталіста нейкім таямнічым, ну проста незразумелым чынам, траплялі ну зусім прастамоўныя выразы і словаўтварэнні з найбольш тыповымі, раздражняючымі слых памылкамі.

Аднак самае галоўнае, што давёў-такі да нашай увагі маладзён той прынцып заробку грошай на хістанні курсаў валют, растлумачыў, што такое міжнародны валютны рынак, а таксама не забыўся сказаць, што займацца гэтым — прыбыткова і пачэсна, бадай, усе мільянеры з ночы да раніцы толькі і робяць, што спекулююць.

— Гэтаму за мяжой падлеткаў вучаць у школе, а вам (трэба разумець, цёмным, гаротным людзям, павінна быць сорамна. — **Аўт.**) толькі зараз адчыняецца, як трэба па-сапраўднаму жыць.

І канешне ж, некалькі ўдарных прыкладаў кшталту:

— Я добра памятаю, калі не прынялі еўраканстытуцыю, паглядзіце на графік росту валют у той дзень, курс еўра значна ўпаў тады, і тыя, хто паспеў, значна падзарабілі.

І зноў пра Джорджа Сораса (магчыма, ужо ў трэці раз, небараку-мільярдэру, напэўна, ікаецца, ведаў бы ён — не палез бы нізавошта на фунт стэрлінг), і пра няўдалую вайну ў Іраку, тады таксама на няўстойлівым долары біржавыя ігракі нагрэлі рукі. І самае галоўнае:

— Сярод тых, хто стаў на трывалы шлях росквіту і дастатку, можаце апынуцца і вы. Запісваецеся на курсы з дваццаці заняткаў, кошт — сто тысяч рублёў. Пачынаем з наступнага тыдня.

Пры гэтым, хто жадае, можа заняткі гэтыя прайсці за тры дні, седзячы ў вучэбным цэнтры з раніцы да вечара, а можа прыехаць, атрымаць заданне, паехаць дахаты, потым наступным днём прыехаць зноў, паказаць выкананае, зноў атрымаць заданне. А можна заплаціць грошы, і дваццаць заняткаў хоць на два гады расцягнуць, па аднаму разу ў месяц. Хто лічыць непатрэбным для сябе некалькі тэм, можа іх не вывучаць.

Вось так, на Захадзе прынцыпам і аналізу функцыянавання сусветных валютных і інвестыцыйных рынкаў вучаць з дзяцінства, і за ўсё жыццё можна так і не спасцігнуць асаблівасцяў. А тут дваццаць заняткаў, на якія можна і не хадзіць, і ты маеш усе шанцы стаць сапраўдным біржавым ігракам.

Ці растуць залатыя дрэвы?

Растуць. Аднак для таго, каб плады на іх паспелі і не зваліліся пры гэтым вам балюча на галаву, трэба ой які доўгі шлях прайсці! Людзі, якія з'яўляюцца ігракамі на валютным рынку, па-першае, спачатку зарабілі першыя вялікія грошы ў іншай галіне, і толькі потым дазволілі сабе такую забаву, а прасцей, «цацку», як валютныя спекуляцыі. Па-другое, яны гэтым займаюцца ўсё жыццё, і тое не застрахаваныя ад правалу. Рызыка ў валютных спекуляцыях заўсёды ёсць, аднак каб звесці яе да разумнага мінімуму, трэба мець вопыт фінансавых аперацый, на практыцы адчуць, як функцыянуе сусветны рынак, умець аналізаваць наступствы, і галоўнае — дасканала і падрабязна ведаць усё неабходнае.

За дваццаць жа ўрокаў, нават калі практыкавацца на спецыяльнай камп'ютарнай праграме, усе прамудрасці спасцігнуць амаль немагчыма.

У нашай краіне Forex функцыянуе наступным чынам: вы заключаеце дагавор з кампаніяй, якая дапамагае размяшчэнню на банкаўскім рахунку прыпачатковай сумы грошай, неабходнай для правядзення валютных спекуляцый. Мінімальная сума, якую вы можаце пакласці, у фірмах, якія актыўна прасоўваюць такую дзейнасць, адрозніваецца. Прыблізна мінімальны рахунак складае трыста долараў. Дык вось, прыклад, які прыведзены ў пачатку для тазо, каб зразумець, як можна на розніцы курсаў зарабіць грошы, значна перабольшаны. Праўда, прынцып такі, а вось суадносінаў адзін еўра—тры долары не існуе. На рэальным Forex адносіны валютнай пары еўра/долар складаюць апошнім часам сярэднюю велічыню ў 1,3. Гэта значыць, што зарабіць можна, калі курс мяняецца, напрыклад, з 1,375 да 1,389. Пры гэтым, мінімальны лік у трыста долараў нават у выпадку хістання вышэй згаданага змянення ўсёй роўна прынясе адзінкі прыбытку. Падлічыць няцяжка — на тры долары больш, чым было (сума складзе 303,054$). Сядзець за камп'ютарам прыйдзецца доўга, і тое калі пашанцуе.

Карэспандэнт газеты, шчыра кажучы, цікавіўся дзейнасцю Форэкса яшчэ некалькі гадоў раней, знаёмая дзяўчына, якая жыве за мяжой, расказала, і нават праінструктавала праз Інтэрнэт. Сама яна працуе аўдытарам у вялікай міжнароднай кампаніі ўжо восем гадоў, два з якіх мітусіцца паміж Англіяй і Злучанымі Штатамі, мае адпаведную, па замежных мерках трывалую адукацыю ў гэтай сферы, бізнэс-асяроддзе і фінансавы рынак ў абедзвюх краінах ведае цудоўна, пастаянна павышае кваліфікацыю, і таму можа сказаць, што ў валютных рынках «крыху разбіраецца». І тое не вельмі рызыкуе гуляць на Forex.

А пра перспектывы зарабіць у нашай краіне чалавеку, які дагэтуль і не чуў нават, што існу е нейкі міжнародны валютны рынак, або, прабачце, і камп'ютарам не ўмее карыстацца, а потым у адзін момант пад чыім-небудзь уплывам возьме, ды і пакладзе ўсе грошы, што адкладвала сям'я на адпачынак ці аўтамабіль, на рахунак для правядзення валютных спекуляцый, адзываецца як «іх і падманваць ніхто не збіраецца. Яны самі збяруць усе накопленыя грошы, а потым іх прайграюць. Лепш залу ігравых аўтаматаў наведваць ці казіно. На Захадзе сур'ёзныя людзі на валютным рынку гуляюць толькі на свабодныя фінансавыя сродкі».

Пасля семінара паспрабаваў і я гульню «ў Форэкс» на праграметрэнажоры. Ён нічым не адрозніваецца ад рэальнай гульні на біржы, толькі валюта даецца ўмоўная. Дык вось, пры наяўнасці на віртуальным ліку трох тысяч долараў, у спрыяльны для ігракоў дзень (пашанцавала, якраз у ЗША аб'явілі, што страты іх эканомікі ў сувязі з рызыкоўнай праграмай па іпатэцы могуць скласці 100 мільярдаў долараў.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

1 жніўня 2007 г. № 29 (83)

МЯСЦОВЫ ІНТАРЭС

ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ ДЛЯ МАЛЫХ ГАРАДОЎ

На Гродзеншчыне распрацаваны праграмы развіцця 30 малых гарадоў і пасёлкаў, дзе вызначаны перспектывы гэтых населеных пунктаў і размешчаных там арганізацый, прадугледжаны меры па стварэнню новых вытворчасцяў і рабочых месцаў. Наколькі ж падрыхтаваны адпаведныя праекты і як яны паўплываюць на жыццё тэрыторый? Гэтыя пытанні былі абмеркаваны на абласной нарадзе ў Шчучыне.

У 2010 годзе агульны аб'ём прамысловай прадукцыі і спажывецкіх тавараў у малых гарадах Гродзенскай вобласці ў параўнанні з 2005 годам запланавана павялічыць у паўтара раза, інвестыцый у асноўны капітал — у 1,8, тавараабароту і платных паслуг — у 1,6 раза. З боку дзяржавы гэтыя планы падмацоўваюцца шэрагам нарматыўных дакументаў па развіццю малых гарадоў і пасёлкаў, згодна з якімі размешчаныя на гэтых тэрыторыях арганізацыі могуць прымяняць асобыя рэжымы падаткаабкладання.

У прыватнасці, з 1 чэрвеня сёлетняга года праблемным суб'ектам гаспадарання, якія зарэгістраваны і дзейнічаюць у малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях, прадастаўляецца дзяржаўная падтрымка па падатку на прыбытак у памеры 50 працэнтаў ад устаноўленай заканадаўствам стаўкі. Яны вызваляюцца ад падатку з карыстальнікаў аўтамабільных дарог і збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Мясцовым Саветам дэпутатаў прадастаўлена права ўстанаўліваць у 2007—2010 гадах ільготы па падатках на нерухомасць, зямельнаму і экалагічнаму для арганізацый, якія рэалізуюць у малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях інвестпраекты па мадэрнізацыі вытворчасці з мэтай стварэння новых рабочых месцаў. Акрамя таго, пастановай урада зацверджаны пералік населеных пунктаў (па Гродзенскай вобласці — 22), дзе прымяняюцца паніжаныя стаўкі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання.

Такім чынам, прававая база па стымуляванню развіцця малых гарадоў і пасёлкаў практычна створана і важна ўмела прымяніць яе на практыцы. У гэтых мэтах разам з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання адпрацаваны пытанні тэхперааўзбраення прадпрыемстваў, асваення канкурэнтаздольных відаў новай прадукцыі, энергазберажэння. Сёлета, да прыкладу, у вобласці рэалізуюцца інвестыцыйныя праекты па тэхнічнаму пераўзбраенню Ваўкавыскага мясакамбіната, па мадэрнізацыі цэха цвёрдых сыроў на сыраробным заводзе ў Ашмянах, па арганізацыі вытворчасці сухіх будаўнічых сумесяў у ААТ «Смаргоньсілікатабетон» і сыраватачна-бялковага канцэнтрату на Шчучынскім масласырзаводзе, па рэканструкцыі вытворчых плошчаў для павялічэння выпуску прадукцыі ў ААТ «Шчучынскі завод «Аўтапровад».

Увогуле ў малых і сярэдніх гарадах Гродзеншчыны за бягучую пяцігодку плануецца ўкараніць у жыццё 387 інвестыцыйных праектаў, з якіх 35 увайшлі ў Дзяржаўную праграму як важнейшыя. І ўжо можна падвесці некаторыя вынікі. Сёлета на першае паўгоддзе ў малых гарадскіх пасяленнях створана 2818 новых рабочых месцаў, 45 малых прадпрыемстваў. А да канца пяцігодкі, згодна з прагнозам, у малых гарадах будзе дадаткова зарэгістравана 270 МП. Пры гэтым асноўнымі накірункамі развіцця прадпрымальніцтва ў вобласці лічаць аграэкатурызм, прыдарожны сэрвіс, імпартазамяшчэнне.

Аднак пры распрацоўцы некаторых праграм мясцовыя ўлады так і не здолелі прапанаваць глыбока падрыхтаваныя інвестпраекты. На думку намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра Русанава, інвестыцыйныя раздзелы праграм Жалудка, Радуні, Скідаля, Юрацішак, Любчы, Росі, Поразава, Астрыны, Казлоўшчыны, Карэлічаў перапрацоўваліся неаднаразова, але ў выніку няма ніводнага цікавага праекта, які садзейнічаў бы развіццю населенага пункта.

— Напрыклад, як зменіцца жыццё ў Юрацішках, калі агароднінасушыльны завод купіць машыны для мыйкі агародніны, а менавіта гэты праект прадстаўлены ў праграме? Аналагічная сітуацыя ва ўсіх вышэйпамянёных праграмах, — зазначыў Аляксандр Русанаў.

— Трэба азнаёміцца з нарматыўнымі дакументамі па стымуляванню прадпрымальніцкай дзейнасці, прыцягненню ў эканоміку малых гарадоў інвестыцый, стварэнню новых рабочых месцаў і актыўна дзейнічаць у гэтым накірунку.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка даў зразумець, што не дапусціць фармалізму ў падрыхтоўцы праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця малых гарадоў і пасёлкаў, канкрэтных інвестыцыйных праектаў, а кантроль за іх выкананнем будзе вельмі строгі. Асабістую адказнасць будуць несці кіраўнікі не толькі тых ці іншых прадпрыемстваў, але і раённых органаў улады, абласных структур.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПРАЦУЕМ І ЖЫВЁМ З ЛЮБОЎЮ...

Падворак Жанны і Міхаіла Русалоўскіх у вёсцы Богіна Браслаўскага раёна — адзін з самых прывабных, экзатычных. Ёсць тут і грот з вадаспадам, і этнаграфічныя інсталяцыі. А ўжо кветак! Вядома, такім падворак стаў не адразу. Жанна па прафесіі мадэльер-закройшчык адзення, цяпер — беспрацоўная. Міхаіл — вадзіцель пажарнай машыны МНС у Відзах. Некалькі гадоў запар яны дружна шчыруюць над «тварам» сваёй сядзібы.

— Увесь свой вольны час мы аддаём працы з кветкамі, з дэкаратыўным дызайнам, — кажа гаспадыня, — хоць вольнага часу ў вясковага жыхара практычна няма. І тым не менш вынік нашых старанняў перад вамі.

Не адзіным хлебам, як кажуць, жыве чалавек. Цяпер амаль усе маладыя сем'і ў Богіне імкнуцца ўпрыгожваць фасады сваіх сядзіб кветкамі, альтанкамі, рознымі фігуркамі і скульптурамі. Як умеюць і робяць гэта Русалоўскія.

На здымку: гаспадыня сядзібы Жанна Русалоўская.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

ПРАЦЭС ПАЙШОЎ. ЦЯПЕР ПАТРЭБНА ФІНАНСАВАЯ ПАДТРЫМКА

Яшчэ год таму работа камунальных службаў Мінскай вобласці выклікала шмат нараканняў — і з боку спажыўцоў іх паслуг, жыхароў рэгіёна, і з боку выканаўчай «вертыкалі». Крытыкаваў дзейнасць камунальнікаў сталічнай вобласці кіраўнік дзяржавы. Цяпер сітуацыя змянілася. Сёлета за 6 месяцаў службы здолелі скараціць колькасць скаргаў і зваротаў грамадзян па пытаннях ЖКГ на 37 працэнтаў і паралельна вывесці большасць сваіх прадпрыемстваў на бясстратную дзейнасць (для параўнання: год таму стратных прадпрыемстваў ЖКГ у Мінскай вобласці было 5, зараз — адно). Сёння старшыні выканкамаў і Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў, гаворачы аб камунальных службах, прыводзяць сталічную вобласць у якасці станоўчага прыкладу арганізацыі работы і аказання паслуг насельніцтву. Мы пацікавіліся, як абласныя камунальнікі ажыццяўляюць на практыцы рэалізацыю Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 студзеня 2007 года № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва», а дакладней падпункта 8.2 пункта 8, які датычыцца правядзення інвентарызацыі і перадачы на баланс спецыялізаваных арганізацый сістэм водазабеспячэння і водаадводу, дарог сельскіх населеных пунктаў і іншых аб'ектаў нерухомай маёмасці. Па інфармацыю мы звярнуліся да генеральнага дырэктара Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі» Аляксандра ЖУРАЎСКАГА.



— Да 1 чэрвеня ў Мінскай вобласці інвентарызацыя была завершана, — адзначыў Аляксандр Браніслававіч. — У ходзе яе правядзення абследавалі ўсе ўнутрыгаспадарчыя дарогі, вуліцы, транзітныя праезды ў сельскіх населеных пунктах. Інвентарызацыя паказала, што сёння ў распараджэнні сельвыканкамаў вобласці знаходзіцца 6504 км вясковых вуліц. Упэўнены, што для выканання падпункта 8.2 пункта 8 Указа № 21 нам неабходна аднесці гэтыя вуліцы да мясцовых дарог з фінансаваннем іх утрымання за кошт сродкаў рэспубліканскага дарожнага фонду. Паводле прыблізных падлікаў, на ўтрыманне вуліц і дарог у сельскіх населеных пунктах вобласці неабходна затраціць 42,5 млрд рублёў.

Згодна з Указам, мы абследавалі ўсе аб'екты водаканалізацыйнай гаспадаркі (ВКГ), правялі ацэнку іх тэхнічнага стану. Фізічны знос сёння складае 70—80 працэнтаў, а ў некаторых выпадках і ўсе сто.

— Адна з тыповых праблем, з якой сутыкаюцца спецыялізаваныя службы падчас прыёмкі на баланс сістэм ВКГ, — адсутнасць адпаведнай дакументацыі на гэтыя аб'екты...

— У нас такое назіраецца ў 80 працэнтах выпадкаў. Адсутнічаюць тэхнічныя пашпарты, выканаўчыя схемы, акты землекарыстання, праекты зон санітарнай аховы і інш.

— Як у такой сітуацыі ажыццяўляецца працэс перадачы на баланс?

— Выйсці два: знайсці грошы, аформіць дакументацыю і перадаць аб'ект нам альбо проста заключыць з эксплуатуючай арганізацыяй дагавор на абслугоўванне.

— На пасяджэнні «круглага стала», прысвечанага абмеркаванню праблем рэалізацыі Указа № 21, які прайшоў на пачатку ліпеня ў Савеце Рэспублікі, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Белахвостаў прывёў прыклад, што ў некаторых рэгіёнах пры адсутнасці дакументацыі аб'екты ВКГ перадаюцца па акту прыёмкі, які адначасова з'яўляецца і дэфектным актам. Вы ў сябе такую схему практыкуеце?

— Пакуль не, аднак ідэя слушная. Мы возьмем яе на ўзбраенне. Будзем прымаць на баланс аб'екты па дэфектнаму акту, але — з улікам спагнання грашовых сродкаў з выканкамаў ці закладання адпаведных сум у мясцовы бюджэт на наступны год.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС.»)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

СПРАСЦІЦЬ ПРАЦЭДУРУ ПЕРАДАЧЫ

Працягваем абмяркоўваць праблемныя моманты рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 студзеня 2007 года № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва», а дакладней пытанні, якія ўзнікаюць у працэсе перадачы на баланс водаканалізацыйных сістэм, вуліц сельскіх населеных пунктаў, вулічнага асвятлення.

Ірына НОВІКАВА, старшыня Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў:

— Інвентарызацыю дарожнай сеткі і сістэм водазабеспячэння мы правялі. Што датычыцца сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення, работу па іх перадачы на баланс ЖКГ мы пачалі яшчэ тры гады таму, задоўга да выхаду Указа № 21. Асаблівасць нашага раёна ў тым, што ў сельскай мясцовасці тут многа шматпавярховых дамоў. Таму мы проста вымушаны былі стварыць адно з самых буйных падраздзяленняў ЖКГ, каб забяспечыць людзей цяплом, водой, ліквідаваць працяканне дахаў і г.д. (На тэрыторыі кожнага з 8 нашых сельсаветаў сёння ёсць свой участак ЖКГ.) Апошнія тры гады мы паступова перадавалі сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення на баланс ЖКГ. Часта рабілі гэта проста па факту, нават не адрамантаваўшы аб'ект. (Пытанне з забеспячэннем вадой вырашаць трэба, а іншых варыянтаў у нас, мясцовых уладаў, не было. Людзям не растлумачыш, што ў водаправода няма ўласніка, альбо ўласнік — стратнае сельгаспрадпрыемства, якое не мае сродкаў на рамонт сістэмы.) Пасля выхаду Указа №21 мы яшчэ раз правялі інвентарызацыю ўсіх сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення. Атрымалася, што, нягледзячы на перададзенае раней, ЖКГ неабходна прыняць яшчэ шмат аб'ектаў. Гэтыя сістэмы фізічна і маральна зношаны, іх стан у большасці выпадкаў нездавальняючы. Сёння пры існуючым аб'ёме фінансавання раённая служба ЖКГ ледзь спраўляецца з утрыманнем таго, што ўжо мае на балансе. Справа — за фінансамі. Сітуацыя зразумелая — іншага ўласніка, акрамя ЖКГ, у водаканалізацыйных сістэм быць не можа, але трэба разглядаць пытанне дадатковага фінансавання ў залежнасці ад аб'ёмаў сістэм (колькасці артсвідравін, працягласці водаправодных сістэм, колькасці водаразборных калонак і г.д.) і іх тэхнічнага стану. А не проста закладаць на кожную адміністрацыйную адзінку пэўную суму.

Па дарогах. Асноўныя дарогі рэспубліканскага і мясцовага значэння, а таксама транзітныя ўчасткі праз населеныя пункты былі перададзены на баланс дарожнікаў. Але засталася яшчэ вялікая колькасць вуліц сельскіх населеных пунктаў, унутрыгаспадарчых дарог, пад'ездаў да могілак, якія знаходзіліся на балансе сельгаспрадпрыемстваў, сельсаветаў альбо ўвогуле ні ў кога на балансе не лічацца і якія практычна нікім не абслугоўваліся. Інвентарызацыя выявіла 197 км такіх дарог. Мы гатовы іх перадаць, але ў нас не гатовы прыняць. Спрэчка вядзецца паміж дарожнымі і камунальнымі службамі. Асабіста я ўпэўнена: боты павінен шыць шавец. Калі цэнтральныя транзітныя вуліцы — за дарожнікамі, то і ўсе астатнія таксама павінны быць у іх на балансе. ЖКГ дастаткова будзе «пераварыць» сістэмы каналізацыі і водазабеспячэння. Гэта таксама агромністы аб'ём работ. А інакш атрымаецца такая сітуацыя: дарожнікі прагрэйдзіравалі свае цэнтральныя вуліцы ў населеных пунктах, за імі з таго ж райцэнтра павінна ісці спецтэхніка ЖКГ — зноў грэйдзіраваць вуліцы тых жа населеных пунктаў, але не транзітныя. Гэта дзяржаўны падыход?

Анатоль МАХАНЬКО, старшыня Акцябрскага раённага Савета дэпутатаў:

— У многіх раёнах вулічнае асвятленне знаходзіцца на балансе сельскіх выканкамаў. Гэта няправільна. Усе электралініі — на балансе РЭСаў. У нашым раёне менавіта так. Задача мясцовых выканкамаў — назіраць за правільным выкарыстаннем электраэнергіі. Мы толькі плацім за спажытую энергію. Раней разлікамі за электраэнергію займаліся камунальныя службы, потым перадалі аплату выканкамам. Здымаюць паказанні лічыльнікаў «Энергазбыт» і РЭС у прысутнасці прадстаўніка сельвыканкама. Гэта зроблена для таго, каб забяспечыць дакладны штомесячны ўлік расходаў.

Рэальнае прамежкавае выйсце — падзяліць вуліцы паміж ЖКГ і ДРБУ.

З водаканалізацыйнымі сістэмамі ўсё проста: інвентарызацыю мы ў раёне правялі, зараз аб'екты ў працэсе перадачы. З дарогамі больш цяжкасцяў. Дарожнікі спасылаюцца на дарожнае заканадаўства, дзе прапісана, што ў іх на балансе павінны быць толькі транзітныя дарогі. А вуліцы? Яны ж нідзе на балансе не знаходзяцца, «павіслі ў паветры». І так не толькі ў нас, а па ўсёй краіне. Камунальнікі іх прыняць не могуць: у іх няма адпаведнай службы. Калі на ўзроўні рэспублікі закладаць у бюджэт расходны артыкул на ўтрыманне дарог вуліц населеных пунктаў, няма розніцы, камунальнай гаспадарцы іх адрасаваць ці дарожным службам. Аднак куды больш лагічна будзе аддаць вуліцы спецыялістам, дарожнікам.

Сяргей БЯЗНОСІК, старшыня Дзеравянчыцкага сельскага Савета дэпутатаў Слонімскага раёна:

— Натуральна, лепш было б усе дарогі вуліц населеных пунктаў у сельскай мясцовасці перадаць камунальнікам, але яны супраціўляюцца, спасылаючыся на адсутнасць у іх адпаведнай тэхнікі. У нашым раёне транзіты абслугоўвае ДРБУ-191. А ёсць яшчэ дарогі ў дробных населеных пунктах, якія на балансе гаспадарак не лічацца. Сельскі выканкам абслугоўваць іх не можа (няма спецтэхнікі і сродкаў). Зараз прапануецца перадаць усе вуліцы ДРБУ-191, аднак я баюся, што карысці з гэтага будзе мала. Яны не робяць рамонт нават па сваіх асноўных дарогах, якія ў іх на балансе, яны проста не «пацягнуць» дадатковую нагрузку. Іншая справа, калі на ўзроўні вобласці будзе прынята рашэнне аб пашырэнні штатаў, парка спецтэхнікі ДРБУ. На маю думку, рэальнае прамежкавае выйсце — падзяліць вуліцы сельскіх населеных пунктаў і частку перадаць на баланс ЖКГ, а частку — ДРБУ.

Што датычыцца водаканалізацыйных сістэм, работа па іх перадачы завершана ў цэнтральных вёсках раёна, дзе ў ЖКГ ёсць свае кацельні. Там камунальнікі прынялі ўсе водаканалізацыйныя сеткі на баланс. Аднак значная частка яшчэ засталася неперададзенай. Калі на водаправод адсутнічае дакументацыя і ў СВК няма сродкаў для яе афармлення, сельгаспрадпрыемства самастойна яго абслугоўвае.

Вулічнае асвятленне адноўлена па ўсіх населеных пунктах раёна. Аплата праводзіцца своечасова. Аднак ёсць пытанне па замене лямпачак. РЭС прапануе нам набываць лямпачкі самастойна і плаціць за выклік спецыяліста. Але гэта няправільна — сеткі ж на балансе РЭСа. Лічу слушнай ідэю ўключыць у тарыф на электраэнергію пэўную суму, якая прадугледжана нарматывамі на абслугоўванне электрасетак. Сюды ж закласці і кошт лямпачкі.

Ала НАВУМЕНКА, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў:

— Згодна з пунктам 8.2 пункта 8 Указа № 21 у нас была праведзена інвентарызацыя сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення, размешчаных у сельскіх населеных пунктах раёна. Сістэма водазабеспячэння часткова знаходзіцца на балансе жыллёвых службаў, часткова — на балансе сельгаспрадпрыемстваў. Нараўлянскі раённы выканаўчы камітэт прапануе Гомельскаму аблвыканкаму перадаць безгаспадарныя вуліцы і дарогі населеных пунктаў раёна працягласцю 41,95 км на баланс «Гомельаблдарбуда». Сёння гэтае пытанне вырашаецца на ўзроўні вобласці. Яшчэ хацелася б скараціць колькасць дакументаў, патрэбных для перадачы дарог, спрасціць саму працэдуру іх перадачы.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

ДЭМАГРАФІЧНАЯ БЯСПЕКА

СТЫМУЛ. ПЛЮС... ПРЭСТЫЖ СЯМ'І?

Буйныя гарады і сельская мясцовасць маюць свае асаблівасці. У тым ліку — у плане дэмаграфіі. Так, не сакрэт, што дзякуючы шматлікаму прытоку моладзі сітуацыя ў гарадах выглядае значна лепш. І ў гэтым плане прыклад Мінскай вобласці, якая па сутнасці не мае сваёй адміністрацыйнай «сталіцы», шмат у чым паказальны. Найбольшая колькасць насельніцтва тут была адзначана ў 1994 годзе. А потым пачаўся спад. Праўда, менавіта апошнім часам паказчыкі нараджальнасці ў рэгіёне пачалі пакрысе павышацца, а паказчыкі смяротнасці — наадварот ісці ўніз. Між тым, чым гэта тлумачыцца, якія дэмаграфічныя шанцы мае самая вялікая вобласць Беларусі, а таксама за кошт чаго плануецца стымуляваць нараджальнасць як у рэгіёне, так і па краіне ў цэлым? Аб гэтым і іншым карэспандэнт «Звязды» гутарыць са старшынёй Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Алай Валянцінаўнай МІКАЛУЦКАЙ.

— Паступовае скарачэнне колькасці насельніцтва з'яўляецца рэаліяй ужо паўтара дзесяцігоддзя. Тым не менш якія асаблівасці мае сітуацыя на Міншчыне?

— Вядома, што зараз у рэжыме натуральнай страты насельніцтва жывуць многія краіны Еўропы, і, на жаль, Беларусь тут не стала выключэннем. Галоўным паказчыкам дэмаграфічнай бяспекі заўсёды з'яўляецца каэфіцыент дэпапуляцыі, інакш кажучы, суадносіны колькасці памерлых і колькасці нованароджаных. Гранічна дапушчальны паказчык у дадзеным выпадку — 1,0. Аднак даводзіцца канстатаваць: Міншчына перайшла гэту крытычную мяжу ўжо даволі даўно. Яшчэ ў 1990 годзе на тэрыторыі вобласці каэфіцыент дэпапуляцыі складаў 0,9, але ў 1995 годзе ён аказаўся ўжо 1,5, а летась — 1,6. Прычым у сельскай мясцовасці яго паказчык быў яшчэ большым — 2,3. І сам па сабе гэта вельмі трывожны факт. Калі не змяніць цяперашні малюнак, да 2100 года рэгіён можа апынуцца ў крайне складанай сітуацыі. Як, дарэчы, і наша краіна ў цэлым.

Калі ж весці гаворку аб спецыфіцы дэмаграфічнага становішча на Міншчыне, то ў першую чаргу варта прывесці некалькі лічбаў. У параўнанні з максімальным паказчыкам насельніцтва вобласці скарацілася на 132 тысячы — па стану на пачатак сёлетняга студзеня яно складала 1 млн 466,8 тыс. чалавек. Аднак калі з 1990 года насельніцтва сельскай мясцовасці сапраўды зменшылася на 161 тысячу, то гарадское — узрасло на 49,2 тыс. чалавек. Пры гэтым асноўная прычына тут на паверхні — міграцыя вяскоўцаў у гарады ў пошуку больш «грашовай» работы і лепшых матэрыяльна-бытавых умоў.

Зрэшты, апроч слаба адрэгуляваных міграцыйных працэсаў, цяперашняя сітуацыя мае і іншыя, характэрныя для ўсёй краіны рысы. Гэта і старэнне насельніцтва, і змяншэнне прэстыжу сям'і, і змена падыходаў да нараджальнасці. Скажам, усё больш распаўсюджанай з'явай становіцца маладзетнасць (арыенцір сем'яў усяго на 1—2 дзяцей), рэзкае зніжэнне нараджальнасці ва ўзроставай групе да 20 гадоў, рост нараджальнасці па-за шлюбам, а таксама нараджэнне дзяцей асобамі, схільнымі да алкагалізму, — у большасці выпадкаў дзеля атрымання дзіцячых дапамог.

— Ёсць меркаванне, што дэмаграфічны крызіс стаў ужо незваротным. Вы з гэтым згодныя?

— Не, бо менавіта зараз у вобласці, як і ўвогуле ў краіне, ёсць спрыяльныя шанцы. Аналіз сведчыць, што 70 працэнтаў нараджэнняў дзяцей прыпадае на жанчын ва ўзросце 20—29 гадоў. А колькасць такіх жанчын будзе ўзрастаць да 2010 года. Да слова, казаць аб пэўным паляпшэнні можна ўжо зараз. У 2003 годзе узровень нараджальнасці складаў 8,7, пазалетась — 9,3, а летась — 9,9 выпадку на тысячу чалавек. Прычым за сёлетнія студзень—май у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ўзровень нараджальнасці ў рэгіёне зноў павялічыўся — на 6 працэнтаў. Таму, на мой погляд, сёння асабліва важна змяніць стаўленне, і перш-наперш маладых людзей, да сям'і. Вядома, што прычынай нізкай нараджальнасці становяцца не толькі і нават не столькі фінансавыя цяжкасці ці адсутнасць жылля, колькі маральныя каштоўнасці. І якраз тут сітуацыя далёка не ідэальная. Так, за сёлетнія студзень—май у параўнанні з мінулым годам колькасць шлюбаў у вобласці павялічылася на 11,9 працэнта. Аднак адначасова колькасць разводаў узрасла на 16,7 працэнта. У выніку, калі летась у сярэднім на 100 шлюбаў прыпадала 59, то зараз — ужо 61 развод.

— Тым не менш скідваць з рахункаў «матэрыяльны» момант таксама не варта. Як заахвоціць жанчыну да нараджэння? Якія стымулы ёсць тут зараз і якія могуць з'явіцца надалей?

— Увогуле дэмографамі даўно заўважаны адзін парадокс: падзенне ўзроўню нараджальнасці знаходзіцца ў прама прапарцыянальнай залежнасці ад узроўню эканамічнага развіцця. І чым вышэй апошні, тым, як правіла, менш дзяцей з'яўляецца ў краіне. Разам з тым недаацэньваць матэрыяльныя моманты сапраўды нельга. І ў гэтым плане для падтрымкі сем'яў з дзецьмі апошнім часам робіцца шмат.

Так, памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, што выхоўваюць дзяцей, пераразлічваюцца штоквартальна ў сувязі са зменаннем бюджэту пражыткавага мінімуму — з 1 лютага, 1 мая, 1 жніўня і 1 лістапада. Да таго ж калі зараз «стандартны» памер дапамогі на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў складае 65 працэнтаў, то ў 2008 годзе яго плануецца павялічыць да 80, а ў 2009 годзе — да 100 працэнтаў БПМ. Дарэчы, варта нагадаць, што бюджэт пражыткавага мінімуму на сёння — гэта 185 360 рублёў. Прычым ужо сёлета былі павялічаны памеры аднаразовых дапамог пры нараджэнні. Пры з'яўленні першага дзіцяці аднаразовая выплата ўзрасла да 5, а другога і наступных дзяцей — да 7 БМП.

Далей. Каб абараніць інтарэсы працуючых жанчын, у нас замацавана норма, паводле якой наймальнік абавязаны працягваць з імі кантракт да моманту, пакуль дзіцяці не споўніцца 5 гадоў.

Асобная гаворка аб шматдзетных сем'ях. Для іх прадугледжваецца 50-працэнтнае зніжэнне аплаты за карыстанне дзіцячымі дашкольнымі ўстановамі і 50-працэнтнае (пры ўмове, што прынамсі трое дзяцей з'яўляюцца школьнікамі) зніжэнне аплаты за падручнікі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС.»)

СТЫМУЛ. ПЛЮС... ПРЭСТЫЖ СЯМ'І?

Дзеці вёскі Іллюшына Ушацкага раёна на ганку дома новазабудаванай вуліцы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС.»)

Маці, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, прадастаўляецца адзін свабодны ад работы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэднядзённага заробку. Плюс да таго, шматдзетным сем'ям пагашаюцца льготныя крэдыты на жыллё: пры наяўнасці 3 непаўналетніх дзяцей памер «спісання» складае 30, чатырох дзяцей — 50, пяці і болей дзяцей — 100 працэнтаў ад сумы крэдыту. Прычым, як чакаецца, надалей гэта палёгка стане больш значнай: сем'ям з трыма дзецьмі плануецца пагашаць 50, з чатырма — 70, а з пяццю і болей дзяцей — 100 працэнтаў ільготнага жыллёвага крэдыту. Апроч таго, ёсць намер падтрымаць і сем'і, што карыстаюцца няльготнымі крэдытамі на будаўніцтва ці рэканструкцыю жылля. З сумы такіх крэдытаў у выпадку нараджэння ці наяўнасці аднаго дзіцяці мяркуецца спісваць 20, дваіх дзяцей — 40, а траіх і больш дзяцей — 50 бюджэтаў пражыткавага мінімуму.

І яшчэ. 1 сакавіка вызначана, што сем'і, сярэднедушавы штомесячны даход якіх не перавышае 60 працэнтаў БПМ, маюць права на забеспячэнне бясплатным харчаваннем дзяцей першых двух гадоў жыцця. Да слова, сем'і і адзінокія грамадзяне з такім жа даходам маюць права і на атрыманне адраснай сацыяльнай дапамогі. Пры гэтым «планка даплат» у рамках адраснай дапамогі павінна ўзрасці: з цяперашніх 60 працэнтаў БПМ да 80 працэнтаў у 2008-м і да 100 працэнтаў — у 2010 годзе.

Заўважу, што ўсё, аб чым ішла гаворка вышэй, датычыцца жыхароў усёй Беларусі. У той жа час свае дадатковыя меры падтрымкі вызначаны і ў Мінскай вобласці. Скажам, з 1 студзеня 2004 года шматдзетным маці, што ўганараваныя ордэнам Маці, у нас робіцца выплата ў памеры 10 базавых велічынь.

Сем'і, дзе налічваецца па пяць і больш дзяцей, за кошт аблвыканкама атрымліваюць дапамогу на падрыхтоўку да школы. Нарэшце, нельга не заўважыць, што падтрымка сем'яў з дзецьмі з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва — толькі з пачатку года такая падтрымка была прадастаўлена больш чым 99 тыс. сем'ям вобласці.

— Прамы ўплыў на агульную колькасць насельніцтва аказвае не толькі нараджальнасць, але і смяротнасць. Якія паказчыкі смяротнасці зараз? І чым яны тлумачацца?

— Найбольшы ўзровень смяротнасці ў вобласці быў адзначаны ў 2003 годзе — 17,3 выпадку на тысячу чалавек. Затым сітуацыя некалькі стабілізавалася, скажам, у 2005 годзе гэты паказчык склаў 16,6, а летась — 16,2. Прычым сёлета ў параўнанні з мінулым годам смяротнасць працягвае зніжацца. Тым не менш нельга не зазначыць, што на Міншчыне яна атрымліваецца большай, чым у сярэднім па краіне. І тлумачэнні гэтаму ў першую чаргу трэба «шукаць» у самой структуры насельніцтва. Вобласць пакрысе старэе, і калі яшчэ ў 1990 годзе доля пенсіянераў складала 17, то зараз — ужо 27 працэнтаў. Прычым зразумела: чым большы сярэдні ўзрост, тым больш і выпадкаў сыходу з жыцця ад хваробаў.

— Дарэчы, якія прычыны смяротнасці з'яўляюцца асноўнымі?

— Аналіз паказвае, што часцей за ўсё жыхары вобласці сыходзяць з жыцця ў выніку захворванняў сістэмы органаў кровазвароту (60,6 працэнта выпадкаў), новаўтварэнняў (10,8 працэнта), захворванняў органаў дыхання (3,6 працэнта) і органаў стрававання (2,9 працэнта). Усё гэта сумныя лічбы. Але яшчэ горш, што практычна кожная дзесятая смерць у вобласці прыпадае на траўмы і атручванні і прыкладна такая ж доля — на іншыя, часам зусім «не абавязковыя» прычыны.

Дарэчы, нялішне заўважыць, што асноўная частка выпадкаў заўчаснай смяротнасці ў вобласці адбываецца з мужчынамі і ў тым ліку — у працаздольным узросце. Не ў апошнюю чаргу з-за гэтага мы вымушаны казаць аб павелічэнні разрыву ў сярэдняй працягласці жыцця паміж жанчынамі і мужчынамі — з 1990 па 2005 год гэты разрыў узрос адразу на 10,8 года. Сярэдні паказчык жыцця па вобласці зараз знаходзіцца на ўзроўні 67,3 года. Аднак калі ў жанчын ён складае 74, то ў мужчын — усяго 61,3 года.

— «Вінаватыя» шкодныя звычкі?

— У асноўным — так. Да прыкладу, на ўліку ў абласным наркалагічным дыспансэры зараз знаходзіцца 62 358 чалавек, сярод якіх 7689 жанчын і 4231 падлетак. Па сутнасці на ўлік прынята 4,3 працэнта насельніцтва вобласці. І кожны з гэтых людзей адносіцца да «групы рызыкі». Так, 70—80 працэнтаў ад агульнай колькасці грамадзян, што паміраюць у выніку атручвання моцнымі напоямі, складаюць менавіта хворыя на алкагалізм. І, да слова, толькі пазалетась падобныя атручванні сталі прычынай сыходу з жыцця амаль паўтысячы жыхароў рэгіёна.

Аднак наступствы ўжывання алкаголю — гэта не толькі атручванні. У нецвярозым стане здзяйсняецца каля 60 працэнтаў усіх злачынстваў, 98 працэнтаў забойстваў у выніку хуліганскіх дзеянняў, 80 працэнтаў забойстваў у бойках. Больш чым 80 працэнтаў дзяцей алкаголікаў маюць розныя нервова-псіхічныя захворванні. Да таго ж злоўжыванне моцнымі напоямі часцяком спрыяе развіццю і прагрэсаванню гіпертаніі, ішэмічнай хваробы сэрца, з'яўляецца прычынай інфарктаў, з алкаголем звязана кожная пятая смерць ад цырозу печані. Увогуле, думка медыкаў тут адназначная — адмова ад злоўжывання зможа скараціць агульную смяротнасць насельніцтва не менш чым на 30 працэнтаў.

Другая і не менш важная праблема — курэнне. У цэлым па вобласці «сябруе» з тытунём 31,1 працэнта насельніцтва, і ў тым ліку 46 працэнтаў мужчын і 14,3 працэнта жанчын. Між тым, якраз курэннем тлумачыцца 40 працэнтаў смерцяў ад ішэмічнай хваробы сэрца і 11,5 працэнта — ад анкалагічных захворванняў. У цэлым жа, паводле ацэнак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, цыгарэты павялічваюць рызыку смяротнасці на 30—80 працэнтаў.

Апроч таго, нельга не спыніцца на такой з'яве, як наркаманія. Зараз толькі «афіцыйна» ў вобласці налічваецца 716 наркаманаў. Прычым ужо з пачатку гэтага года іх колькасць узрасла на 101 чалавека. І само па сабе гэта — вельмі сумная тэндэнцыя.

Словам, прафілактыка п'янства, курэння, наркаманіі, і асабліва сярод моладзі, сёння сапраўды выходзяць на першы план. У дадзеным выпадку дарэчы ўсё: і шматлікія акцыі, і ўцягванне маладых людзей у спорт, і выступленні ў СМІ, і, у рэшце рэшт, работа з праблемнымі сем'мі, якую вядуць інспекцыі і камісіі па справах непаўналетніх, а таксама тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

— Яшчэ адна з «неабавязковых» прычын гібелі людзей — няшчасныя выпадкі на вытворчасці. Ці можна зменшыць колькасць такіх інцыдэнтаў?

— За першую палову года пры непасрэдным выкананні сваіх прафесійных абавязкаў у вобласці загінулі 13 і атрымалі цяжкія траўмы 63 чалавекі. І першая, і другая лічба ў параўнанні з аналагічным перыядам летась зменшылася — на 5 і на 2 адпаведна. Але ў той жа час нельга не прызнаць, што паказчыкі вытворчага траўматызму ўсё яшчэ застаюцца высокімі. І тут ёсць над чым працаваць.

Так, менавіта сёлета ў нас стаў больш жорсткім кантроль за патрабаваннем безумоўнага скасавання кантрактаў з работнікамі за ўжыванне спіртных напояў на працоўным месцы ці ў працоўны час — з пачатку года па гэтай прычыне ўжо звольнена 195 чалавек. Другі значны рэзерв — стварэнне сістэм кіравання аховай працы, і ў першую чаргу на прадпрыемствах, зарыентаваных на экспарт.

Урэшце, таксама адметны напрамак — паляпшэнне непасрэдна ўмоў працы. Так, паводле спецыяльнай абласной праграмы, колькасць месцаў са шкоднымі ці небяспечнымі ўмовамі на Міншчыне павінна скараціцца да 2011 года на 20 працэнтаў.

— Як сцвярджаюць медыкі, здароўе кожнага чалавека шмат у чым залежыць ад харчавання і экалогіі. Як павысіць іх якасць?

— Паводле даных абласнога ўпраўлення статыстыкі, на Міншчыне, як і ў цэлым па краіне, працягвае адзначацца недастатковае спажыванне найбольш карысных у біялагічным плане прадуктаў — мясных, малочных, рыбных, яек, садавіны і агародніны. У той жа час практычна кожны чацвёрты чалавек мае лішнюю вагу, што вядзе да рызыкі развіцця пухлін нырак, прамой кішкі, лёгкіх, да цукровага дыябету. У сувязі з гэтым зараз у вобласці распрацоўваецца спецыяльная праграма па рацыянальнаму, збалансаванаму і бяспечнаму харчаванню насельніцтва. І гэта работа вядзецца ў рамках праграмы дэмаграфічнай бяспекі.

Прычым у той жа абласной праграме дэмаграфічнай бяспекі ўжо вызначаны спецыяльны напрамак, прысвечаны фарміраванню здаровага ладу жыцця і спрыяльнага асяроддзя. Асноўныя ж мэты вызначаных тут мерапрыемстваў па ахове глебы, паветра і вады — забяспечыць жыхароў Міншчыны якаснай пітной вадой і зноўтакі бяспечнымі прадуктамі харчавання.

— Між тым, узгадаем, што абласная праграма дэмаграфічнай бяспекі была прынята менавіта сёлета. Якімі павінны аказацца яе галоўныя вынікі?

— Варта паўтарыцца, што кардынальна змяніць дэмаграфічнае становішча за вельмі кароткі час немагчыма, дзеля гэтага патрэбны дзесяцігоддзі. Тым не менш праграма на 2007—2010 гады мае даволі канкрэтныя мэты, у прыватнасці, сярод іх — павелічэнне агульнага каэфіцыента нараджальнасці да 10—11 выпадкаў на кожную тысячу насельніцтва, зніжэнне да такога ж узроўню каэфіцыента смяротнасці, а таксама выхад да 2011 года на сярэднюю працягласць жыцця па вобласці 70—72 гады. Прычым паляпшэнне павінна адбыцца як у гарадах, так і ў вёсках. І ў тым ліку — дзякуючы стварэнню ўмоў для замацавання ў сельскай мясцовасці моладзі.

Сяргей ГРЫБ.

ПРАЦЭС ПАЙШОЎ. ЦЯПЕР ПАТРЭБНА ФІНАНСАВАЯ ПАДТРЫМКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС.»)

Паводле вынікаў інвентарызацыі, раённымі выканкамамі вобласці былі сфарміраваны спісы перадаваемых аб'ектаў ВКГ. У 593 населеных пунктах нам трэба прыняць на баланс 634 артэзіянскія свідравіны, 1030,3 км водаправодных і 110,3 км каналізацыйных сетак, 233 ваданапорныя вежы, 37 каналізацыйных помпавых станцый, 27 адзінак ачышчальных збудаванняў. Для прывядзення ўсіх гэтых аб'ектаў у працоўны стан неабходна затраціць каля 11,5 млрд рублёў. Акрамя таго, на іх утрыманне патрэбна будзе расходаваць 24,6 млрд рублёў у год. Пакуль што на рамонт і рэканструкцыю сетак ВКГ нам не выдаткавана ні капейкі. Думаю, уся справа ў тым, што на бягучы год у мясцовыя бюджэты пад правядзенне дадзеных работ сродкі не закладваліся.

— Увогуле, на якім этапе сёння працэс перадачы на баланс аб'ектаў ВКГ у вобласці?

— Працаваць у гэтым накірунку мы пачалі з красавіка. Пакуль што падрыхтавалі да прыёмкі 6 свідравін. У асноўным работа вядзецца па афармленню дакументацыі. Існуюць зацверджаныя графікі, згодна з якімі мы і працуем. Спяшацца тут нельга. Пра гэта неаднаразова гаварыў і Прэзідэнт краіны.

— Вы ўзгадвалі, што ў шэрагу выпадкаў фізічны знос мяркуемых для перадачы аб'ектаў складае сто працэнтаў, аднак, паводле існуючых нормаў, перадаваць на баланс можна толькі аб'ект у тэхнічна спраўным стане. У былых гаспадароў (СВК) на рамонт сістэм ВКГ часта няма сродкаў. Якое выйсце?

— Калі ў населеным пункце мяркуецца адкрыццё аграгарадка, мы там перакладаем сеткі ВКГ за свае сродкі. У адваротным выпадку выходзім з прапановай да мясцовых уладаў закласці ў бюджэт на наступны год сродкі на рамонт сетак для далейшай іх перадачы. Акрамя таго, на ўзроўні раёна ў бюджэце прадугледжаны асобны расходны артыкул — на капітальны рамонт сетак ВКГ у сельскай мясцовасці.

— Многія СВК тармозяць працэс перадачы аб'ектаў ВКГ, якія пакуль што знаходзяцца ў іх на балансе, па прычыне высокіх тарыфаў на ваду. Пасля перадачы свідравін камунальным службам кошт вады для сельгаспрадпрыемстваў павялічваецца ў 5—10 разоў. Вы сутыкаецеся з падобным супраціўленнем?

— Мы не ставім перад сабой задачы прымаць на баланс аб'екты, «завязаныя» на вытворчасці. Гаворка ідзе пра тыя сістэмы ВКГ, якія абслугоўваюць насельніцтва. Тут у нас вызначылася іншая праблема. Вясковыя жыхары з савецкіх часоў не прывучаны плаціць за ваду і каналізацыю і цяпер усімі сіламі супраціўляюцца ўстаноўцы лічыльнікаў. Яны не разумеюць, чаму цяпер трэба плаціць за ваду, калі заўсёды яна была бясплатнай. Гэта праблема менталітэту, і вырашаць яе трэба агульнымі намаганнямі на ўзроўні дзяржавы.

— Вы сказалі, што ў вобласці сёння 6504 км вуліц сельскіх населеных пунктаў і што больш эфектыўным будзе перадаць іх на баланс дарожным службам...

— Безумоўна. У нас няма спецыялізаванай тэхнікі. Нават у аграгарадках, дзе мы ствараем участкі ЖКГ і дзе павінны абслугоўваць у тым ліку і вуліцы, мы пакуль не маем ні тэхнікі, ні кваліфікаваных спецыялістаў. Па аб'ектыўных прычынах мы сёння не гатовыя абслугоўваць дарогі ў сельскай мясцовасці.

— Перадача на баланс сістэм ВКГ прывядзе да значнага павелічэння вашых асноўных фондаў. Ці прадугледжваецца ў сувязі з гэтым пашырэнне штату?

— Я лічу, што ў гэтым няма неабходнасці. У нас іншая задача: да канца года атрымаць ліцэнзіі на ўсе віды паслуг, якія мы аказваем насельніцтву, правесці падрыхтоўку кадраў. На практыцы гэта павысіць якасць нашай працы і дазволіць узняць рэнтабельнасць. Мы паставілі перад сабой мэту — да канца года вывесці ўсе свае 42 прадпрыемствы на бясстратнасць. Упэўнены, мы гэтага дасягнем.

— Што вы назавяце галоўнай праблемай жыллёва-камунальнай гаспадаркі?

— Яна агульнавядомая — неплацяжы насельніцтва. Прыкладна 52 працэнты неплацельшчыкаў — гэта працуючыя і працаздольныя грамадзяне. Плюс — запазычанасці прадпрыемстваў. Нашы службы распрацавалі новыя эфектыўныя метады барацьбы з неплацельшчыкамі, але гэта ўжо нагода для асобнага інтэрв'ю.

— Дзякуй за размову.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

АБ'ЕКТ НЕРУХОМАСЦІ — ЗА АДНУ БАЗАВУЮ

У Беларусі цяпер ёсць каля 12 тыс. аб'ектаў нерухомай маёмасці дзяржаўнай уласнасці, якія не выкарыстоўваюцца, у тым ліку каля 4 тыс. аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці і каля 8 тыс. — камунальнай.

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік дырэктара Фонду дзяржаўнай маёмасці Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Уладзімір Кавалеўскі, найбольшую долю ў ліку такіх аб'ектаў складаюць былыя ваенныя гарадкі, а таксама ўстановы адукацыі, размешчаныя ў сельскай мясцовасці.

З агульнай колькасці аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія не выкарыстоўваюцца, плануецца прадаць каля 1 тыс. аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці і больш як 2,1 тыс. камунальнай, здаць у арэнду адпаведна больш як 200 і 650 аб'ектаў.

Пастановай урада ад 27 красавіка 2007 года № 541 зацверджаны пералік маёмасці, якая не выкарыстоўваецца і знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, што падлягае ўвядзенню ў гаспадарчы абарот з 1 мая 2007 года па 30 красавіка 2008-га. У адпаведнасці з гэтым пералікам 69 аб'ектаў будуць выстаўлены на продаж на аўкцыёнах з устанаўленнем пачатковай цаны продажу, роўнай адной базавай велічыні, а адзін будзе перададзены ў бязвыплатнае карыстанне недзяржаўнай юрыдычнай асобе пад канкрэтны інвестыцыйны праект.

Інфармацыя аб аб'ектах РЭСПУБЛІКАНСКАЙ УЛАСНАСЦІ, што плануюцца да продажу і здачы ў арэнду, размешчана ў Інтэрнэце на сайце Дзяржкаммаёмасці www.gki.gov.by.

АБ АБ'ЕКТАХ КАМУНАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦІ, што плануюцца да продажу і здачы ў арэнду (па рэгіёнах), можна даведацца на наступных сайтах:

па горадзе Мінску — www. minsk.gov.by;
па Мінскай вобласці — www.minsk-region.gov.by;
па Брэсцкай вобласці — www.brest-region.by;
па Гомельскай вобласці — www.gomel-region.by;
па Магілёўскай вобласці — www.region.mogilev.by;
па Гродзенскай вобласці — www.grodno-region.gov.by;
па Віцебскай вобласці — www.fondgosim.vitebsk.by, www.vitinvest.by.com.

АЎТАР ГІМНА — РАБОТНІЦА РАЙВЫКАНКАМА

Неўзабаве на ўрачыстых мерапрыемствах Акцябрскага раёна будзе гучаць свой гімн. Для гэтага пастараліся загадчыца аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама Вольга Чумакова, якая з'яўляецца аўтарам тэкста, і музыканты раённага цэнтра забаў Дзмітрый Бяжкоў і Андрэй Шарапаў, якія пераклалі тэкст на музыку.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

КОНКУРС АЖЫВІЦЬ РАБОТУ

Гомельскі абласны Савет дэпутатаў прыняў рашэнне арганізаваць у наступным годзе правядзенне конкурсу сярод сельскіх, пасялковых, гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання па пытаннях жыццезабеспячэння насельніцтва.

Як патлумачыў старшыня абласнога Савета Валерый Сяліцкі, асноўнай мэтай конкурсу з'яўляецца павышэнне ролі органаў улады ў вырашэнні пытанняў, якія маюць мясцовае грамадскае значэнне, у тым ліку і сацыяльна-эканамічнага развіцця адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак.

З мэтай заахвочвання пераможцаў конкурсу аблвыканкам выдзяляе з бюджэту вобласці значныя фінансавыя сродкі. Напрыклад, сельскія, пасялковыя, гарадскія (гарадоў раённага падпарадкавання) Саветы дэпутатаў, якія зоймуць першае, другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца дыпломамі і адпаведнымі грашовымі прэміямі ў 500, 400 і 300 базавых велічынь. Пераможцы ж сярод органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (дамавыя, вулічныя, квартальныя, пасялковыя, сельскія камітэты і іншыя органы, у тым ліку і адзінаасобныя) атрымаюць адпаведна па 50, 40 і 30 базавых велічынь.

Пры падвядзенні вынікаў конкурсу будзе ўлічвацца выкананне шэрагу паказчыкаў па пытаннях жыццезабеспячэння насельніцтва.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НА ДНЕ

БАЦЬКОЎ ВУЧЫЛІ, ЯК НЕ ПРАПІЦЬ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ

У Магілёўскім раённым судзе шукаюць нетрадыцыйныя метады працы з сацыяльна неўладкаванымі сем'ямі ў сувязі з выкананнем Дэкрэта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях».

Днямі ў Вяйнянскім сельскім Савеце адбылася незвычайная сустрэча: судовыя выканаўцы, міліцыянеры, сацыяльныя работнікі, нарколаг і прадстаўнік пракуратуры тлумачылі групе спецыяльна запрошаных вяскоўцаў пра сістэму дзяржаўнай абароны дзяцей у праблемных сем'ях, пра небяспеку п'янства і рызыкоўнага ладу жыцця.

На прафілактычную гутарку прыйшлі 6 чалавек: нягледзячы на сур'ёзнасць сітуацыі і выразны пахмельны сіндром, запрошаныя на ганку палілі і смяяліся. Рабілі выгляд, што і не ведаюць, навошта іх паклікалі на выхаванне. А калі пачалася размова па справе, сталі паводзіць сябе даволі агрэсіўна.

Судовыя выканаўцы Магілёўскага раённага суда растлумачылі, што дзяржава будзе абараняць правы і інтарэсы дзяцей, і каб не давялося пайсці на крайнія меры, яны хочуць заклікаць нядбайных бацькоў да нармальнага ладу жыцця, абудзіць у іх элементарныя чалавечыя пачуцці.

Старэйшы сын 30-гадовай Вольгі (імя зменена) даўно жыве са сваякамі, разам з маці — 10-гадовы хлопчык і 5-гадовая дачка. Мужа няма. У хаце — вечны «рамонт» і п'яны сужыцель. Некалькі месяцаў таму ўзяла сябе ў рукі, перастала піць, а цяпер у каторы раз — зрыў. Ёй трэба задумацца пра свой лёс і сваіх дзяцей.

З усёй кампаніі запрошаных цвярозасцю і разважлівымі прамовамі вылучалася маладая жанчына. Галіне (імя таксама зменена) — 27 гадоў. Сёння ёй няма дзе жыць — бацькоўская хата згарэла, Галіна блукае па чужых кутках. Была ў Расіі на сумнеўных заробках, цяпер вярнулася і шукае працу. Двое дзяцей — 8-гадовы хлопчык і 3-гадовая дзяўчынка — выхоўваюцца ў дзіцячым доме.

— Я сама вінаватая і нікога не абвінавачваю, што так у маім жыцці атрымалася, — сказала Галіна. — Проста я хачу папрасіць дапамогі. Хачу забраць сваіх дзяцей, нарэшце займець сваё жыллё і працу. Проста нармальна жыць.

Жанчыне паабяцалі дапамогу ў працаўладкаванні на мясцовы цяплічны камбінат, і калі зарэкамендуе сябе станоўча — пакой ў маласямейным інтэрнаце ёй неўзабаве дадуць. А далей усё атрымаецца — толькі б было жаданне. А пачаць, паводле парад жанчын, трэба з наведвання сваіх дзяцей у дзіцячым доме, дзе маці не было ўжо вельмі даўно.

— Усе хочуць дапамагчы, ніхто не зацікаўлены ў крайніх мерах, — сказала памочнік пракурора Магілёўскага раёна Алена Сафонава. — Цяжка глядзець у вочы дзецям, якіх звозяць ад бацькоў. Што б там ні было, яны хочуць быць з маці. Але трэба, каб і маці прытрымлівалася нармальнага ладу жыцця. Трэба толькі захацець! Праўда, за восем гадоў працы Алены толькі аднойчы жанчына звярнулася ў пракуратуру па дапамогу ў аднаўленні ў бацькоўскіх правах. Ёй аддалі дачку, аднак высветлілася, што другое дзіця за прайшоўшы час усынавілі і, як ні плакала маці, яго ўжо немагчыма вярнуць.

> Старшыня сельскага Савета толькі за апошні час адправіў у ЛПП чатырох чалавек

У Вяйнянскім сельсавеце робяць усё, што могуць, каб перавыхаваць п'яніц. Тут налічваецца прыкладна два дзесяткі сацыяльна небяспечных сем'яў, дзе ёсць дзеці. Праблемных бацькоў выхоўваюць у школе і спрабуюць абудзіць сумленне на агульных сходах. Іх дасылаюць на кадзіроўку — некаторых па некалькі разоў. Да іх звяртаецца з эмацыянальнымі прамовамі мясцовы праваслаўны святар айцец Мікалай — гавораць, п'яніцы плачуць і раскайваюцца, аднак сваё «цвёрдае» рашэнне пачаць новае жыццё адкладваюць на заўтра, а сёння вырашаюць адзначыць яго «апошняй» пляшкай таннага віна.

Старшыня сельскага Савета Мікалай Чаранкоў толькі за апошні час адправіў у ЛПП чатырох чалавек, іншых спрабуе ўладкаваць на працу — хоць і падазрае, што праз тыдзень-другі можа і не адшукаць тых работнікаў. Таму з уласнага вопыту працы з п'яніцамі Чаранкоў зрабіў выснову: трэба ўжываць да нядбайных бацькоў жорсткія меры.

— Трэба іх адпраўляць у раёны, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі і дзе ёсць патрэба ў працоўнай сіле, — выказаў старшыня сваю прапанову. — Там рабіць для іх лагеры, каб расцілі збожжа і рапс. А то тут п'яніцы ляжаць цэлы дзень ля возера, потым ноччу па падвалах поўзаюць. І ніякай рады няма. Гэта проста бяда!

Загадчыца аддзялення псіхалагічнай дапамогі і рэабілітацыі раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Алена Запойкіна ўпэўненая, што дапамогі вартыя толькі тыя людзі, якія самі жадаюць выпраўлення і караскаюцца.

І прывяла красамоўны прыклад: цяпер яна паедзе ў суседні сельсавет, дзе жыве жанчына, якая нядаўна нарадзіла чацвёртае дзіця. Ёй дзяржава выдаткавала дапамогу ў памеры 900 тысяч рублёў. Усё, здавалася б, добра. Аднак Алена едзе да яе, каб пракантраляваць расход гэтых немалых грошай: каб яны пайшлі не на гарэлку, а на патрэбы дзіцяці. Таму што ў гэтай маці ўжо адабралі траіх дзяцей, і яна на судзе спакойна заявіла: «Забірайце! Я сабе яшчэ нараджу». Так і здарылася.

— Гэта добра, што наша дзяржава дапамагае шматдзетным маці, — лічыць Запойкіна. — Аднак трэба даваць яе, на маю думку, далёка не ўсім. Таму што жыць і піць за кошт дзяржаўнай дапамогі на дзяцей, як гэта здараецца, недапушчальна!

Так, на некаторых нядбайных бацькоў не дзейнічаюць ніякія меры, нават самыя крайнія. Адну жанчыну пазбавілі бацькоўскіх правоў у дачыненні да васьмі дзяцей, яна п'е і жыве за кошт грошай на 9-е дзіця, якога яшчэ толькі рыхтуюцца адбіраць. Між тым, яна зноў цяжарная.

— У хатах, дзе жывуць праблемныя сем'і, даводзіцца бачыць жахлівыя карціны, — расказаў судовы выканаўца Павел Палянскі. — Бялізны няма, альбо яна выглядае, як рубероід. Аднойчы я бачыў, як маленькія блізняткі спалі ў шафе, закіданыя анучамі. Гэта каб не змерзлі, бо ў доме не было ацяплення.

Між тым судовы выканаўца ўпэўнены, што п'яніц, якія топяць у алкаголі свае праблемы, усё ж можна пераканаць. Цяжка, але можна. Трэба толькі «дзяўбці» няспынна.

— Мы такія выязныя сесіі праводзім з пачатку года ў розных сельскіх Саветах Магілёўскага раёна, — паведаміў Павел. — І ў выніку нашых гутарак дзесятак чалавек вырашылі закадзіравацца. Некаторым дапамаглі працаўладкавацца. Плён ёсць: сёлета пададзена менеі іскаў аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў. У нашым раёне стала менш сацыяльна небяспечных сем'яў.

Увогуле, удзельнікі сустрэчы ў Вяйнянскім сельсавеце засталіся задаволеныя, што хоць адна жанчына з кампаніі выпівохаў папрасіла дапамогі, каб вярнуцца да нармальнага жыцця. Спадзяюцца, што і іншыя, нягледзячы на дэманстратыўную абыякавасць, таксама нешта засвоілі з пададзенага ўроку.

У сельскім Савеце вырашылі на наступныя падобныя мерапрыемствы запрашаць больш шырокае кола людзей: каб тыя, хто яшчэ толькі становіцца на слізкі шлях п'янства, паглядзелі і спужаліся аблічча закаранелых алкаголікаў і таго, што яны зрабілі з сабой і сваімі дзецьмі.

Ілона ІВАНОВА.

Магілёўскі раён.

А на мой погляд...

«Падчас водпуску мабільны тэлефон не павінен працаваць на прыём...»

РУП «Белтэлекам» абвясціла пра пачатак працы ў беларускай сталіцы першых кропак доступу да бесправаднога Інтэрнэта (Wi-Fi). Як паведамляе прадпрыемства, зараз такая паслуга існуе ў будынку чыгуначнага вакзала, будынку аэрапорта «Мінск-2», некаторых гасцініцах горада... Цяпер, калі вы маеце сучасны laptop, вы можаце чытаць сваю электронную пошту, чакаючы цягнік ці рэйс самалёта.

Якіх сучасных тэхналогій асабіста вам не хапае сёння? Ад якіх тэхналогій вы, магчыма, жадалі б пазбавіцца, хоць бы на нейкі час? Напрыклад, адключыць мабільны тэлефон на час водпуску ці месяц не глядзець тэлевізар...

Уладзіслаў ХІЛЬКЕВІЧ, каардынатар інфармацыйнай дзейнасці Праграмы развіцця ААН у Беларусі:

— Усё, што я хачу, я маю, бо ў нашым офісе гэта заахвочваецца. Калі ты жадаеш мець нейкую тэхніку, ты пішаш заяву і не на заўтра, але праз некалькі месяцаў, як правіла, ты атрымліваеш яе. Таму пытанне для мяне вельмі цяжкае. Як пытацца ў капрызлівага дзіцяці, які мае шмат цацак, што яму набыць яшчэ на дзень нараджэння. Такое пытанне ўводзіць дзіця ў ступар... Мне асабіста, напэўна, не перашкодзіў бы ўласны laptop. Хоць не ведаю, што б з дзвюма я сёння рабіў.

Што датычыцца другога пытання, то гэта на сто працэнтаў мабільны тэлефон. Бо гэта пастаяннае матанне нерваў. І датычыцца не толькі водпуску, але і выхадных дзён, вечароў. Калі ты на нешта настроіўся, то гэта першы фактар, які будзе цябе пастаянна тузаць. Таксама, магчыма, я атрымліваю занадта шмат электронных пісьмаў. Я не адмовіўся б ад іх наогул, але магутныя фільтры паставіў бы.

Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў:

— Персанальны камп'ютар я маю толькі на працы. І ён мой добры, надзейны памочнік у атрыманні інфармацыі, якая звязана непасрэдна з дзейнасцю Цэнтрвыбаркама і з абстаноўкай у свеце. Па крайняй меры аб выбарах у іншых дзяржавах я ў першую чаргу атрымліваю звесткі праз Інтэрнэт.

Ад чаго я хацеў бы пазбавіцца? Я добра адключаюся ад усёй непатрэбнай (і нават патрэбнай) інфармацыі, калі іду ў водпуск. Я пасяляюся ў цешчы на дачы і амаль увесь час праводжу на прыродзе. Нават не гляджу тэлевізар.

Мікалай ДУБОВІК, намеснік старшыні Камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

— Пачну з другога пытання, бо мне прасцей на яго адказаць. У водпуску як ніколі разумееш, што наколькі добра мець мабільную сувязь, настолькі гэта і дрэнна. Варта ўключыць тэлефон — дзень, лічы, прапаў. І я лічу, што падчас водпуску мабільны тэлефон не павінен працаваць на прыём. Бо калі ты хочаш адпачыць ад працы, то робіш нямшмат тэлефанаванняў, а табе, як правіла, падчас водпуску наконт працы тэлефануюць яшчэ больш.

А на першае пытанне мне адказаць цяжка. Я падтрымліваю сучасныя змены ў лепшы бок. І падтрымліваю бесправадны Інтэрнэт. Бо ў мяне дома сын шмат працуе ў Інтэрнэце, адключае тэлефонную сувязь. Гэта стварае нязручнасці. Нам не маглі дазваніцца, а мы часам не ведалі пра гэта. А бесправадная сувязь не перашкаджае іншым. Таму я за тое, каб такія навінкі атрымлівалі развіццё. І карыстацца бесправадным Інтэрнэтам павінны мець магчымасць людзі не толькі ў аэрапорце, на вакзале, але і дома.

— А ці не жадаеце вы, як падарожнік, мець GPS-навігатар для арыентавання па электроннай карце?

— Сапраўды, у працяглых падарожжах без гэтай рэчы абысціся дастаткова складана. Калі мы шлі на ўсюдыходах у экспедыцыі (Мікалай Дубовік пабываў не так даўно і ў Арктыцы, і ў Антарктыдзе. — **Аўт.**), мы цалкам арыентаваліся па GPS. Гэты прыбор найбольш дакладны, ён кампактны. Раней гэта рэч была сакрэтнай, яе мелі толькі ваенныя. А зараз любы чалавек яе можа мець. Таму гэтую рэч я хацеў бы мець. Хоць звычайна яна патрэбная для доўгіх падарожжаў. У звычайным жыцці можна абысціся без яе.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Наша бяспека

Міліцыя — супраць п'яніц і вадзіцеляў-ліхачоў

Узровень злачыннасці ў Магілёўскай вобласці застаецца адным з самых высокіх у краіне — за паўгода па лініі крымінальнага вышуку ў рэгіёне зарэгістравана каля 10 тысяч злачынстваў.

Аднак начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Канавалаў заявіў на прэс-канферэнцыі, што зрухі да лепшага ўсё ж такі ёсць: цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў стала меней на 19 працэнтаў, іх раскрывальнасць дасягнула 80 працэнтаў. Крымінагенным горадам застаецца Бабруйск: менавіта там не раскрытыя яшчэ два забойствы — састарэлай жанчыны і ўдзельніка крымінальнай групы. А таксама не раскрытае ўчыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў у Магілёве — чалавека моцна збілі ў рэстаране.

Барацьба з алкагалізмам

Магілёўская міліцыя працуе над папярэджаннем злачынстваў. Напрыклад, у сферы сямейна-бытавых зносінаў, дзе амаль усе правапарушэнні ўчыняюцца п'янымі людзьмі.

Раскрываюцца такія злачынствы, як правіла, хутка: іх учыняюць звычайна сваякі альбо сябры-сабутэльнікі. Муж пабіў жонку, брат забіў брата, жанчына парэзала сужыцеля і гэтак далей — звычайныя гісторыі ў кантэксце спажывання алкагольных напояў, і часцей за ўсё — нелегальнага паходжання, сурагатаў.

— Дэалкагалізацыя насельніцтва — праблема з праблем, — сказаў Аляксандр Канавалаў. — Мы змагаемся з незаконным абаротам алкагольных напояў: за першае паўгоддзе канфіскавалі больш за 34 тоны сурагатнага спірту і больш за 40 тон брагі. І ў ліпені да гэтай колькасці дадалося 93 тоны фальсіфікаванага алкаголю. Аднак у справе барацьбы з п'янствам не ўсё залежыць ад міліцыі. Трэба выкарыстоўваць усе сілы і магчымасці, каб пераламаць псіхалогію чалавека і пераканаць яго, што гарэлка не ратуе ад праблем, а наадварот.

Бяспека на дарогах

Сёння кіраўніка Магілёўскага УУС таксама турбуе абстаноўка на дарогах, бяспека дарожнага руху. За 6 месяцаў на дарогах вобласці зарэгістравана 484 дарожна-транспартныя здарэнні — гэта больш, чым у першым паўгоддзі летась. У аварыях паранена больш за паўтысячы чалавек. Загінула 86 чалавек.

— Прычын некалькі, — сказаў начальнік абласнога УУС. — Па-першае, гэта парушэнні хуткаснага рэжыму: нягледзячы на вялікія магчымасці сучасных аўтамабіляў, трэба памятаць аб абмежаваннях. Ды і нашы дарогі да вельмі вялікіх хуткасцяў не прыстасаваныя. Другое — парушэнне правілаў абгону. Трэцяе: адсутнасць вопыту ў маладых вадзіцеляў, а ў нас у вобласці штомесяц аўташколы выпускаюць 1,5 тысячы чалавек. І да гэтага трэба дадаць і недысцыплінаваных пешаходаў.

Як і раней, Дзяржаўтаінспекцыя будзе весці прафілактычную працу, аднак Аляксандр Канавалаў мяркуе, што да парушальнікаў правілаў дарожнага руху варта ўжываць больш жорсткія меры адміністрацыйнага ўздзеяння: маюцца на ўвазе пазбаўленне правоў на кіраванне аўтатранспартам і максімальныя штрафныя санкцыі.

Праўда, гэта не азначае, што караць будуць усіх і скрозь — да гэтай справы кіраўнік міліцыі раіць падыходзіць дыферэнцыявана, каб адчувальнае спагнанне накладаць не на тых, хто памыліўся аднойчы, а на нахабных і недысцыплінаваных вадзіцеляў, якія не робяць высноў з папярэджанняў і заклікаў берагчы жыцці людзей.

Ілона ІВАНОВА.

Рэха публікацыі

ЗА НАСТАЎНІКА ЗАКІНЬЦЕ СЛОВА!

У Год дзіцяці, і не толькі, мы звяртаем увагу на становішча нашых дзяцей. Не дзіўна, бо ўсё, што мы робім, — для будучыні; гэта значыць, і дзеля нашых дзяцей. Вось чаму цікава было прачытаць у газеце «Звязда» заметку Надзеі Нікалаевай «Праполка буракоў — фінансавая дапамога для школы...», дзе яна апісвае, у якую кабалу трапілі дзеці адной з вёсак Докшыцкага раёна. Як аказваецца, вінаватае ва ўсім кіраўніцтва Порплішчанскай сярэдняй школы. Неабходнасць зарабіць трошачкі грошай на падрыхтоўку школы да новага навучальнага года, на тое, каб тым жа дзецям было прыемна сесці за парты 1 верасня, прымусілі дырэкцыю школы заключыць дагавор з мясцовым саўгасам аб вырошчванні буракоў. На самай справе прапалоць тры радкі буракоў даўжынёй 500 метраў вельмі цяжка. Правільней было б сказаць: не дзіцячая гэта праца, і нічога агульнага гэтая праца не мае з працоўнай практыкай. Практыка вучня — гэта працяг вучэбнага працэсу. Але не гэта галоўнае. Галоўнае, што любая праца, якую мы прапаноўваем вучням, павінна прыносіць задавальненне. Калі не маральнае, то хоць бы матэрыяльнае.

І журналіст газеты, і аўтар ліста вельмі ўважліва разгледзелі толькі адзін бок жыцця вясковых дзяцей. Але ў матэрыяле можна заўважыць яшчэ некалькі праблем, аб якіх неабходна гаварыць, паколькі такое можа здарыцца не толькі ў Докшыцкім раёне.

Напрыклад, у які час і дзе жывуць героі ліста, што яны ўсіх і ўсяго баяцца? Аўтар пісьма ў газету просіць не называць яго прозвішча, «каб у школе не вылічылі, чый сваяк паскардзіўся ў газету». Бацькі ідуць палоць буракі і пускаюць сваіх дзяцей толькі таму, «каб гаспадарка выдзеліла ім сотку для сенакосу». У школе існуе канфлікт «дырэкцыя—бацькі—вучні», таму што «і бацькі, і дзеці баяцца сказаць што-небудзь супраць». Між тым, канфліктуючыя прызнаюць, што і дзецям, і іх бацькам вельмі цяжка быць «у апазіцыі». Журналіста газеты «Звязда» «прасілі гэту тэму на старонках газеты не абвастраць»... Думаю, што каментарыі да сказанага непатрэбныя.

Не вельмі разбіраемся ў сельскай гаспадарцы і не бяромся каментаваць тэхнічны ўзровень гаспадаркі, дзе пашчасціла жыць дзеючым асобам нашага артыкула, але некалькі слоў хочацца сказаць. Няўжо кіраўнікі сельскай гаспадаркі не бачаць, які год на календары? Сёння 2007 год! А ў вас няма тэхнікі для вырошчвання буракоў. Яе даўно трэба было купіць, бо яна ёсць. Няўжо вілы, граблі і каса з сярпом — гэта ўся ваша тэхніка на мехдвары?

А цяпер мы звернем увагу на адно пытанне, якое патрабуе каментарыяў. Як жывуць настаўнікі Порплішчанскай сярэдняй школы? З газет відаць, што выконваць неўласцівыя абавязкі для іх стала прывычнай справай. Докшыцкі раённы аддзел адукацыі не турбуецца, чаму настаўнікі ў час водпуску павінны палоць буракі? А навошта турбавацца, калі гэтае пытанне абмяркоўвалася на педагагічным (?) савеце. Кіраўнікі адукацыі раёна не заўважылі абсурду: на педагагічным савеце дзялілі радкі буракоў для праполкі! Гэта тое самае, каб калгаснікі сабраліся на свой галоўны сход і складалі расклад урокаў для мясцовай сярэдняй школы... А як жа з новымі педагагічнымі тэхналогіямі? Хто і калі будзе ўкараняць інавацыі? Міністэрства адукацыі чакае ад нас укаранення профільнага навучання. Да яго ж трэба рыхтавацца з падручнікамі і метадычкамі ў руках. Пагадзіцеся, у радках з буракамі і пустазеллем аб гэтым нават думаць немагчыма. Цікава, колькі радкоў выдзелілі дырэктару школы і старшыні прафкама настаўніцкага калектыву? Адным словам, цяжка даводзіцца настаўнікам Порплішчанскай сярэдняй школы. Незаслужана грузяць на сельскага настаўніка ўсё, што магчыма і немагчыма: фарбуем вучэбныя кабінеты, паліва нарыхтоўваем, прадукты для школьных сталовых кансервуем, над сем'ямі, якія п'юць спіртное, шэфствуем...

Хто ж заступіцца за настаўніка?

Уладзімір РАЗУМОВІЧ, старшыня прэзідыума Беларускай асацыяцыі дырэктараў школ, дырэктар экалагічнай гімназіі № 3 г. Баранавічы.

«ВЕЛЬМІ ХАЦЕЛАСЯ ГРОШАЙ...»

...На працягу таго месяца ў міліцыю паступіла каля дзесятка заяў ад уладальнікаў «Жыгулёў», якія нанач ля пад'ездаў пакідалі свае машыны — нехта ўзламваў у іх замкі, краў аўтамагнітолы. Аператыўнікі выязджалі на чарговы выклік, добрасумленна збіралі ўлікі, здымалі адпячаткі пальцаў. Але з такімі — у міліцэйскай базе даных злачынца не значыўся.

Як і трэба было чакаць, да пары...

Напрыканцы мінулага года ў адным з мікрараёнаў горада быў за бойку затрыманы 20-гадовы слесар Яўген К. У яго, як і належыць у такіх выпадках, знялі адпячаткі пальцаў. Сумненняў не заставалася: затрыманы не проста хуліган, а яшчэ і злодзей. Які, дарэчы, лічы, тут жа папрасіў ручку і ліст паперы, напісаў першае пасля школы сачыненне. Тэма яго была «Чыстасардэчнае прызнанне», назва — «Яўка з павіннай». Паводле яе — хлопцу не хапала грошай. І таму ён знайшоў «бізнэс»: па начах — краў аўтамагнітолы, днём — збываў іх на рынку...

Суд улічыў чыстасардэчнае прызнанне хлопца, які ўпершыню трапіў на лаву падсудных, і прызначыў, мо, не самае суровае пакаранне — тры гады пазбаўлення волі з утрыманнем у папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму. Апроч таго злачынцу прыйдзецца кампенсаваць страты пацярпелым аўтаўладальнікам...

Сумны фінал, але заканамерны: тады хацелася хлопцу грошай, цяпер, і напэўна куды болей — свабоды.

Валерый КАЗУБАЎ, народны засядацель суда Савецкага раёна, *г. Гомель.*

Бернд ШТАНГЕ:

«Мы не станем браць прыклад са зборных Бразіліі ці Германіі. Мы будзем шукаць свой шлях»

Па-за гульнёй

Калі нацыянальную зборную Беларусі па хакею ўпершыню ўзначаліў спецыяліст з далёкага замежжа — канадзец Глен Хэнлан, многія паставіліся да гэтага з насцярогай і вялікім хваляваннем. І менавіта Хэнлан вывеў нашых ігракоў на самае высокае месца ў гісторыі выступлення беларусаў на чэмпіянаце свету. Зараз гісторыя паўтараецца: упершыню галоўным трэнерам нашай нацыянальнай каманды па футболу стаў нямецкі настаўнік, узнікаюць тыя ж хваляванне і насцярога. І ўсё ж у час прадстаўлення Бернда Штанге старшыня беларускай федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас запэўніў, што гэты трэнер нам цалкам падыходзіць, бо адпавядае ўсім нашым патрабаванням, ды і беларускаму футболу будзе карысны свежы позірк на трэніровачны працэс і выкарыстанне новых тактычных схем.

Наколькі хутка замежныя методыкі прыжывуцца на беларускай глебе, дакладна можна будзе сказаць толькі пасля таго, як мы пабачым нашу зборную на справе. Першым іспытам для новага галоўнага трэнера стане таварыскі матч з камандай Ізраіля (22 жніўня). Сваю працу ў праграмзе беларускіх футбалістаў ён пачне з наведвання заўтра гульні брэсцкага «Дынама» ў адборачным раўндзе Кубка УЕФА. Калі вас цікавіць, хто з ігракоў зборнай застанецца ў складзе каманды, адказ на гэта пытанне новы настаўнік пакуль даць не гатовы. Аднак на шэраг іншых пытанняў, якія былі зададзены нямецкаму спецыялісту адразу пасля аб'яўлення яго галоўным трэнерам, ён адказаў.

— Якія першыя словы вы скажаце сваім новым падначаленым і як бы вы ахарактарызавалі сябе як трэнера? — цікавілася я.

— Ігракам я сказаў бы, што камень адным пальцам не падымеш, а мінімум патрэбна два пальцы, а лепей — уся рука. Гэта значыць: каб стаць адзінай камандай і дасягнуць вынікаў, патрэбна заўжды трымацца разам. Яшчэ я скажу, што патрэбна марыць аб чэмпіянаце свету і імкнуцца рэалізаваць гэтыя мары. Ці магу я сам характарызаваць сябе? Сказаў бы, мабыць, што я аптыміст.

— Вы сказалі, што ўсім трэба марыць аб чэмпіянаце свету. Наколькі рэальныя шанцы заваяваць туды пуцёўку са зборнай Беларусі?

— Гэта будзе цяжка, бо толькі пераможца адборачнай групы адразу паедзе ў ПАР, уладальнікі другіх месцаў будуць змагацца ў плэй-оф. Трэба выкласціся на сто працэнтаў, каб трапіць на ЧС-2010.

— Нямецкая зборная знакамітая вялікай дысцыплінай. Наколькі вам патрэбна, каб скамплектаваць зборную. Якой вы бачыце яе?

— Мяркую, што за 15 дзён да таварыскай гульні мы ўжо вызначымся са складам каманды. У вас ёсць цудоўныя ігракі. Патрэбна дапоўніць іх маладымі дынамічнымі футбалістамі і стварыць новую аснову каманды. У зборную адчынены дзверы для ўсіх ігракоў, таму няхай усе жадаючыя грукаюцца ў іх.

Нездарма яе называюць «нямецкай машынай». Як вы плануеце навесці такі ж парадак у нашай камандзе са славянскім менталітэтам?

— Мне знаёмае гэта пытанне. Калі я працаваў у Іраку, мне казалі аб арабскім менталітэце, на Кіпры — кіпрыётскім... Аднак у футболістаў не можа быць рознага менталітэту, ёсць толькі адзін менталітэт — прафесіяналізм. Мы паважаем індывідуальнасць ігракоў, але і яны павінны паважаць трэнера і выконваць пэўныя правілы для карысці зборнай, хоць камусьці яны могуць не спадабацца. Дысцыпліна будзе стопрацэнтная. Толькі так магчыма пракласці шлях да поспеху. Калі ўзнікне нейкая праблема, унутры зборнай будзе жорсткая крытыка, але за межы каманды нічога выходзіць не будзе.

— Колькі часу вам патрэбна, каб скамплектаваць зборную. Якой вы бачыце яе?

— Мяркую, што за 15 дзён да таварыскай гульні мы ўжо вызначымся са складам каманды. У вас ёсць цудоўныя ігракі. Патрэбна дапоўніць іх маладымі дынамічнымі футбалістамі і стварыць новую аснову каманды. У зборную адчынены дзверы для ўсіх ігракоў, таму няхай усе жадаючыя грукаюцца ў іх.

— Якому стылю гульні вы аддалі перавагу — зборнай Германіі ці Бразіліі?

— Гэта дзве цудоўныя каманды, але Бразілія і Германія далёка, і таму мы не будзем нікога капіраваць, бо мы ствараем беларускую зборную з яе традыцыямі, якія развіваліся яшчэ ў Савецкім Саюзе. Мы будзем шукаць свой шлях.

— Якой тады тактычнай схемы вы будзеце прытрымлівацца?

— У нас будзе 4 абаронцы, а далей усё пабачыце на полі. Схемы будуць вар'іравацца.

— У вашым трэнерскім штабе будуць беларускія трэнеры?

— Я прывёз з сабой асістэнта Харальда Ірмшэра, з якім даўно працуем разам. Дапамагаць мне будуць і беларускія трэнеры, якія ўзначальваюць маладзёжную, юнацкую і іншыя каманды, каб клапаціцца аб рэзерве зборнай. Трэба вызначыцца з трэнерам варатароў.

— Дзе вы будзеце жыць у Мінску?

— У такой жа кватэры, як і вы. Многія спецыялісты трэніруюць зборныя за мяжой, а самі жывуць у Германіі, ЗША і г. д. Аднак мы кіраваць працэсам з-за мяжы не будзем, бо гэта непрымальна, — запэўніў Бернд Штанге. — Дадому я паеду толькі на Каляды.

— Раскажыце, калі ласка, аб вашай сям'і...

— Яна ў мяне інтэрнацыянальная — усе ў розных краінах — Францыі, Германіі і ў Беларусі. Мая жонка Даратэя імкнецца ўсіх нас неяк злучаць. Старэйшы сын працуе ў экспартнай фірме, малодшы — у структурах Еўрапейскага саюза.

— Як вы любіце адпачываць?

— Я хачу паглядзець Беларусь, каб ведаць больш аб краіне, дзе я працую. Акрамя таго, я спадзяюся выступаць за зборную ветэранаў Беларускай федэрацыі футбола, каб трымаць сябе ў форме.

Ірына ПРЫМАК.

Фота Пятра ФАМІНА.

ПЫТАННЕ З НАГОДЫ

Старшыня беларускай футбольнай федэрацыі Генадзь Нявыглас запэўніў, што перад тым, як пачаць пошук кандыдатаў на пасаду галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай, ва ўсіх ігракоў каманды цікавіліся, ці варта запрашаць замежнага спецыяліста. Усе, паводле яго слоў, успрынялі гэту ідэю станоўча. Калі ж стала вядома імя новага настаўніка, «Звязда» вырашыла даведацца, што прадстаўнікі беларускага футбола могуць сказаць менавіта пра Бернда Штанге, паколькі ён станоўча паўплывае на выступленне нашай зборнай.

Аляксандр КЛІМЕНКА: Раз яго федэрацыя назначыла — значыць, Штанге добры спецыяліст. Асабіста я мала што ведаю пра яго. Магу толькі заўважыць, што нямецкія трэнеры славяцца сваімі законамі, дысцыплінай. Магчыма, гэта пойдзе на карысць нашай камандзе. Веданне Штанге рускай мовы — вялікі плюс. Аднак я лічу, што, каб канкрэтна сказаць нешта пра яго як пра спецыяліста, спачатку трэба паглядзець некалькі матчаў пад кіраўніцтвам Штанге, пабачыць, ці будуць нейкія адрозненні.

Генадзь БЛІЗНЮК: Ці моцна паўплывае нямецкі трэнер на выступленне зборнай, мне пакуль сказаць цяжка. Канешне, калі ён пабудуе новыя тактычныя схемы, наладзіць патрэбную атмасферу ў камандзе, будзе добра. Думаю, што час усё расставіць на свае месцы і пакажа, наколькі правільна было запрашаць трэнера з Германіі.

Павел Рыгоравіч ГЛЕБ (бацька Аляксандра і Вячаслава Глебаў): Я, безумоўна, сачу за выступленнем беларускай зборнай, і не толькі таму, што за яе гуляюць сыны. З імі я не абмяркоўваў назначэнне новага трэнера, бо ў нас іншых размоў хапае. А вось з сябрамі, вялікімі футбольнымі балельшчыкамі гутарыў на гэту тэму. Ведаю, што Штанге працаваў у Іраку. Немцы трэніруюць ва ўсім свеце. Мне здаецца, што пры Штанге ў зборнай будзе вялікая дысцыпліна.

Аляксандр КУЛЬЧЫ: Не мае значэння, хто ўзначальвае нашу зборную, бо ігракі прыязджаюць выступаць не за канкрэтнага трэнера, а за сваю краіну. І ўсё ж мне падаецца, што з нямецкім трэнерам будзе цікава папрацаваць.

ГЭТЫЯ ЛЕТНІЯ ДАЖДЖЫ...



в. Будслаў, Мядзельскі раён.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У БЕЛАРУСІ З'ЯВІЦЦА СВАЕ «ДРАКОНЫ»

Капітан нацыянальнай зборнай Беларусі па баскетболу Ягор Мешчаракоў плануе адкрыць сваю школу. Аб гэтым спартсмен паведаміў пасля падвядзення вынікаў работы летняга баскетбольнага лагера для дзяцей і падлеткаў «Мінскія драконы». Лагер быў арганізаваны ўпершыню і меў вялікую карысць. За пяць дзён звыш 80 юных баскетбалістаў з розных беларускіх абласцей удасканальвалі сваё ігравое майстэрства. Набор у сваю школу (хутчэй за ўсё яна будзе называцца «Мінскія драконы») Ягор Мешчаракоў плануе пачаць у верасні.

Ірына ПРЫМАК.

Крымінал, здарэнні

КАНВЕРТ З БЕЛЫМ ПАРАШКОМ

27 ліпеня ўвечары 38-гадовая жыхарка вёскі Вейна Магілёўскага раёна, інжынер будаўнічай арганізацыі, знайшла пад дыванком пры ўваходзе ў кватэру канверт з белым парашком, які па выгляду нагадваў пральны. Натуральна, жанчына спужалася: адразу ўзгадаліся амерыканскія канверты са спорамі сібірскай язвы.

Парашок белага колеру, якога ў канверце было каля двух грамаў, даследавала санэпідэмслужба — небяспечных мікраарганізмаў там не выяўлена. Вядзецца таксама хімічная праверка рэчыва. Вывучаюцца абставіны здарэння.

Алена КАЗЛОВА.

АСТУПІЎСЯ

Трагічны выпадак здарыўся ў пасёлку Гарадзішча Баранавіцкага раёна.

Дваццацігадовы хлопец вырашыў наліць вады ў ёмістасць для летняга душа. Узлез на лесвіцу і аступіўся. Хлопец упаў і памёр ад траўмы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДАХІ Ў ТОЙ ДЗЕНЬ ЛЮДЗЕЙ НЕ ЎТРЫМАЛІ

27 ліпеня ў Бялыніцкім раёне адразу два чалавекі скінуліся з дахаў. Адзін няшчасны выпадак зарэгістраваны раніцай у вёсцы Галоўчын: з даху хлява скінуўся 33-гадовы мужчына і разбіўся да смерці.

У гэты ж дзень пасля абеду ў суседняй гаспадарцы, паблізу вёскі Карпаўка падчас працы ўпаў з даху хлява 27-гадовы рабочы. Яму пашанцавала болей: з пераломам шыйкі бядра ён шпіталізаваны ў раённую бальніцу.

Алена КАЗЛОВА.

ЯМУ ЗАКОН — НЕ ЗАКОН?

Падобна на тое, што гэта сапраўды так. За парушэнне яго 26-гадовы гамяльчанін сеў на лаву падсудных і атрымаў пакаранне ў выглядзе шасці месяцаў арышту.

Яго віна заключаецца ў тым, што гэты малады чалавек, як паведамляе прэс-служба ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Гомельскай вобласці, арганізаваў дзейнасць у абласным цэнтры аддзялення грамадскага аб'яднання «РНА» (Рускага нацыянальнага адзінства), якая не прайшла дзяржаўную рэгістрацыю ва ўстаноўленым законам парадку. Год таму ён і яшчэ адзін чалавек былі папярэджаныя пракуратурай аб тым, якія вынікі могуць быць, калі яны не спыняць вырабляць наглядную агітацыйную літаратуру, распаўсюджваць друкаваную прадукцыю, што завозілася з Расіі і прапагандавала ідэі РНА, праводзіць сходы, наносіць на сцены будынкаў эмблемы гэтага аб'яднання.

Але малады чалавек да гэтых папярэджанняў не прыслухаўся і на аснове закона панёс пакаранне. У адносінах да яго сябра выдзелена асобная судовая вытворчасць, бо той некуды з'ехаў з Гомеля і зараз знаходзіцца ў вышуку.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

АХВЯРЫ ЦІХАГА ПАЛЯВАННЯ

На Брэстчыне за апошні тыдзень зноў пацярпелі людзі ад атручэння грыбамі. Кобрынская пенсіянерка разам з іншымі грыбамі памылкова ўзяла бледную паганку. Да медыкаў жанчына звярнулася толькі праз тры дні, калі штосьці паправіць было позна. Жанчыну выратаваць не ўдалося.

Яшчэ тры чалавекі атруціліся грыбамі ў Ляхавіцкім раёне. Але яны своечасова выклікалі «хуткую дапамогу» і былі шпіталізаваныя. Зараз людзям нічога не пагражае. А медыцынскія работнікі нагадваюць зноў і зноў, што збіраць трэба толькі добра вядомыя грыбы і вельмі добра іх апрацоўваць.

Яна СВЕТАВА.

Сталіца

ПАЎМІЛЬЁНА. У РАЗЛІКУ НА КОЖНАГА

Сярэднестатыстычны жыхар сталіцы штомесяц робіць пакупкі на суму амаль у паўмільёна рублёў. Пры гэтым, як адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Міхаіл Еўтухоўскі, усё большую долю ў агульнай структуры выдаткаў займаюць нехарчовыя тавары — за апошнія гады яна павялічылася з 38 да 45,6 працэнта.

НЕХАРЧОВЫЯ ТАВАРЫ — У ЛІДАРАХ

Яшчэ адным сведчаннем паступовага росту даходаў і пакупніцкага попыту ў сталіцы можна назваць агульнае павелічэнне тавараабароту гандлёвых пунктаў. Сёлета тут адзначаны своеасаблівы рэкорд — «плюс» 21,6 працэнта адносна аналагічнага перыяду летась. Прычым калі рост па прадуктах харчавання склаў 14,2, то зноў-такі па нехарчовых таварах — адразу 33,4 працэнта. Па сутнасці продажы павялічыліся па ўсіх пазіцыях. Так, мінімальная «прыбаўка» ў 2 працэнты ў параўнанні з мінулым годам адбылася па тэлевізарах. Тады як 51-працэнтны максімум зафіксаваны па сінтэтычных мыйных сродках.

Зараз, заўважае Міхаіл Еўтухоўскі, у сталічных крамах можна набыць практычна любы тавар — на розны густ і па рознай цане. Пры гэтым дэфіцыту не будзе назірацца і надалей. І ў тым ліку — на садавіну і агародніну. Дарэчы, нялішне заўважыць, што па традыцыі яе значная частка трапляе на мінскі рынак з Малдовы. Аднак сёлета, у сувязі з незвычайнай засухай, у гэтай краіне загінула значная частка ўраджаю.

— У Беларусі ёсць ужо значная колькасць гаспадарак, што спецыялізуюцца на вырошчванні агародніны, таму ў нас проста не можа быць недахопу тых жа памідораў ці агуркоў, — лічыць Міхаіл Еўтухоўскі. — Што ж да садавіны, вырабіць якую немагчыма па кліматычных прычынах, то яе «пошук» і завоз у дастатковай колькасці з-за мяжы — у інтарэсах саміх гандлёвых прадпрыемстваў. Таму праблем тут не ўзнікала ніколі.

РЫНАК АДКРЫТЫ ДЛЯ ЎСІХ

Між тым, тэма імпарту — асабліва. Сёлета доля айчынных тавараў у агульным аб'ёме продажу ў сталіцы склала 61,6 працэнта, або практычна на 10 працэнтных пунктаў менш, чым яшчэ два гады таму. Сапраўды, айчынныя вытворцы працягваюць утрымліваць лідарства па прадуктах харчавання — 99,5 працэнта каўбасы, 97,6 працэнта мяса і птушкі, 94,9 працэнта малочнай прадукцыі, 93,6 працэнта сыру і 99 працэнтаў масла, што прадаюцца ў Мінску, маюць менавіта беларускае «паходжанне».

Разам з тым па нехарчовых таварах сітуацыя ўжо не выглядае так адназначна. Адносна някепскія паказчыкі рэалізацыі айчыннай прадукцыі назіраюцца толькі па льняных тканінах (96,8 працэнта), тэлевізарах (96 працэнтаў), веласіпедах (94,6 працэнта), трыкатажных вырабах (76,6 працэнта) халадзільніках і маразільніках (76,4 працэнта). А вось па іншай бытавой тэхніцы «па-за канкурэнцыяй» — ужо імпарт.

Ці не галоўнае тлумачэнне падобнай сітуацыі — актыўнае развіццё зборачнай вытворчасці вядомых сусветных фірмаў у суседняй Расіі. Такая прадукцыя завозіцца на тэрыторыю Беларусі без мытнага афармлення. Пры гэтым умоў па аб'ёму продажу менавіта айчынных тавараў падчас атрымання ліцэнзій з мінулага года ў нас няма. Зрэшты, мяркуе Міхаіл Еўтухоўскі, уводзіць якія-небудзь дадатковыя патрабаванні ў дадзеным выпадку на самай справе не трэба — канчатковы выбар павінен застацца непасрэдна за пакупніком. Адно, што сёння пачынае абмяркоўвацца пытанне аб адкрыцці фірменных сеткаў беларускіх прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці ў гіпермаркетах.

Да слова, зазначыў Міхаіл Еўтухоўскі, па той жа прычыне стварэння канкурэнтнага асяродку спажывецкі рынак Мінска адкрыты не толькі для інша земцаў, але і для айчынных вытворцаў з іншых рэгіёнаў. Прынамсі, зараз на паліцах сталічных крамаў можна знайсці прадукцыю адразу 49 беларускіх малаказаводаў, а таксама 26 мясакамбінатаў.

БЛІЖЭЙ — ТАКСАМА АРГУМЕНТ

Ужо з пачатку гэтага года ў Мінску з'явілася 14,6 тыс. квадратных метраў новых гандлёвых плошчаў і да таго ж — 560 «дадатковых» месцаў у пунктах грамадскага харчавання. Пры гэтым не сакрэт, што адной з асабліваснцяў сталічнага рынку апошніх гадоў стала адкрыццё сеткі гіпермаркетаў. Гэты напрамак павінен развівацца і ў будучым. У той жа час, канстатуе Міхаіл Еўтухоўскі, сама па сабе падобная акалічнасць не з'яўляецца перашкодай для існавання дробных крамаў «каля дома».

— Назіраецца практычна адналькавая тэндэнцыя — пасля адкрыцця новага гіпермаркета зніжэнне аб'ёмаў тавараабароту ў навакольных дробных крамах адзначаецца толькі на працягу двух месяцаў, — кажа Міхаіл Еўтухоўскі. — А потым усё вярталася на свае месцы. Словам, падстаў баяцца, што адкрыццё гіпермаркетаў прынясе «лішнія нязручнасці», няма. І больш за тое, тут узнікаюць новыя перавагі: каб захаваць свайго пакупніка, дробныя крамы больш актыўна ідуць на мадэрнізацыю.

Сяргей ГРЫБ.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ЧЭМПІЁН ВЯДОМЫ!

З 70-х гадоў мінулага стагоддзя рэгулярна праводзяцца рэспубліканскія спаборніцтвы па рашэнню шахматных кампазіцый па праграме чэмпіянатаў свету. Спаборніцтвы праводзяцца ў шэсць тураў, па тры заданні ў кожным. На рашэнне трох двухходовак адводзіцца 20 мінут, трохходовак — 60, эцюдаў — 100 мінут. На задачы на кааператыўны і адваротны маты прадугледжваецца па 50 мінут на кожны раздзел, а для шматходовак — па 80 мінут. За правільнае і поўнае рашэнне кожнага задання налічваецца 5 ачкоў.

21 і 22 ліпеня ў Мінску ў шахматна-шашачным цэнтры адбыліся чарговыя спаборніцтвы. Удзел прымалі мацнейшыя рашальнікі з Мінска і абласцей.

У мінулым годзе чэмпіёнам быў Валерый Фрыгін з Магілёва, цяпер жа ён уступіў майстру ФІДЭ прадпрымальніку з Клічава Аляксандру Булаўку — 70,5 ачка (351 мінута). Другім прызёрам стаў інжынер-электроншчык з Гомеля Аляксандр Зайцаў — 70 ачкоў і трэцяе — бабруйчанін Міхаіл Храмцэвіч — 66 ачкоў. Пераможцы былі ўзнаг

СУМЕСНАЕ БЕЛАРУСКА-ГЕРМАНСКАЕ ТАВАРЫСТВА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ «МАРКО»:

ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, ПРАВЕРАНЫЯ ЧАСАМ

Хочаш ісці па жыццю шпарка — набывай абутак «Марко». Гэты слоган пра кампанію з аднайменнай назвай, якая ў мінулым годзе адзначыла сваё 15-годдзе і зараз упэўненымі крокамі ідзе наперад і дынамічна развіваецца, радуючы новымі калекцыямі высакаякаснага абутку не толькі Віцебск, дзе прадпрыемства «прапісана», але і пакупнікоў з усёй Беларусі. Пры гэтым якасць прадукцыі добра вядома і на прасторах СНД.

Наўрад ці будзе сакрэтам той факт, што рост папулярнасці «Марко» — гэты вынік велізарнай работы высокакваліфікаваных спецыялістаў кампаніі, укаранення ў вытворчасць перадавых тэхналогій і прымянення сучаснага абсталявання. Зрэшты на прадпрыемстве на поўным сур'ёзе лічаць: чым бы ні займалася СТАА «Марко», яго задача застаецца нязменнай — даваць спажыўцу толькі тую прадукцыю, якая ні ў якім разе не адставала б ад апошніх модных павеваў, вызначалася пры гэтым зручнасцю ў карыстанні, даступнасцю ў цане і даўгавечнасцю. Менавіта гэтыя якасныя характарыстыкі, а таксама сплаў дзелавых ідэй, перадавой думкі і творчай фантазіі спецыялістаў прадпрыемства сталі залогам агульнага поспеху. Пацвярджэнне гэтаму — мноства ўзнагарод. Да прыкладу, гэты год СТАА «Марко» пачало з перамогі ў прафесійнай намінацыі Нацыянальнага конкурсу «Брэнд года» з прысуджэннем сярэбранага медаля, дзе ўдзельнічала каля 70 прэтэндэнтаў. Адметна, што гэта першае і адзінае прадпрыемства ў Беларусі, якое атрымала такую ўзнагароду. У рамках дадзенага конкурсу «Марко» заваявала і перамогу ў Спажывецкай намінацыі. Па выніках нацыянальнага апытання ў таварнай групе «Абутак» брэндлідарам таксама было названа прадпрыемства «Марко». Час паказвае, галоўнай узнагародай для працоўнага калектыву кампаніі можна лічыць прызнанне і давер пакупнікоў.

Гэта было нядаўна, гэта было даўно...

СТАА «Марко» было заснавана ў 1991 годзе як прыватная кампанія. Абутковую спецыялізацыю фірма набыла праз два гады — у снежні 1993-га з канвеера прадпрыемства сышла першая пара мужчынскага абутку.

Сённяшняя асноўная дзейнасць прадпрыемства — выраб і рэалізацыя скуранога абутку мужчынскага, жаночага і дзіцячага асартыменту, а таксама спартыўнага накірунку.

За перыяд з 1994 года выпуск абутку павялічыўся амаль у 10 разоў і ў 2006 годзе склаў 2 мільёны пар абутку. Сёлетнія магутнасці дазволяць выпусціць 2 мільёны 500 тысяч пар абутку.

Уважліва адсочваючы змяненне сітуацыі на рынку з мэтай забеспячэння ўзрастаючага попыту на прадукцыю, прадпрыемства вядзе пастаянную мадэрнізацыю вытворчасці. Сённяшні тэхналагічны працэс вядзецца на самым сучасным абсталяванні такіх вядомых еўрапейскіх фірмаў, як «DESMA», «PFAFF», «USM», «FORTUNA», «CERIM», «LIEBROCK», «BIMA», «SCHON», што забяспечвае еўрапейскі ўзровень якасці. Прадпрыемства ўкамплектавана больш чым 1000 адзінкамі асноўнага тэхналагічнага і дапаможнага абсталявання.

Улічваючы пераменлівасць беларускага клімату і магчымыя «сюрпрызы» надвор'я, а таксама неадпаведнасць «нашых» і «імпартных» размераў абутку (як правіла замежная калодка не разлічана на славянскую паўнату нагі) на прадпрыемстве зрабілі стаўку на распрацоўку ўласнай абутковай калекцыі, якая шыецца па арыгінальных лякалах і традыцыйна вытрымана ў камфортна-класічным стылі.

* * *

Прадпрыемства «Марко» пастаянна працуе над пашырэннем абуткавага асартыменту, а мадэльеры ўважліва сочаць за змяненнямі моды

* * *

Сённяшнія мадэлі аб'ядноўваюць у сабе камфорт, зручнасць, значны тэрмін эксплуатацыі і знешнюю прывабнасць.

* * *

За 15 гадоў дзейнасці на абутковым рынку Беларусі і за яе межамі брэнд «Марко» заваяваў трывалыя пазіцыі. Галоўная перавага абутку «Марко» — лёгкасць, трываласць, камфортнасць, надзейнасць, гарманічны дызайн і адпаведнасць сучасным тэндэнцыям.

Сённяшнюю вытворчасць нельга ўявіць сабе без высокатэхналагічнага абсталявання. Працаваць на такіх складаных станках давяраюць самым адказным, адзін з такіх — зборшчык абутку Аляксандр ЕЎСЦІХАЎ; на клеевым участку мужчынскага абутку; мастак-мадэльер Вольга ЛУК'ЯНОВІЧ і мастак-мадэльер Іна ВАРАПАЕВА знаёмяць з мадэлямі, якія неўзабаве спажыўцы ўбачаць у продажы.

У аддзеле дзіцячага абутку віцебскага фірменнага магазіна «МАРКО», што па вуліцы Талстога; Ларыса БАРКОЎСКАЯ працуе на ўчастку аддзелкі і выконвае аперацыі, якія надаюць паверхні жаночых боцікаў прыгожа адпрасаваны выгляд; прадавец фірменнага магазіна «МАРКО» Ніна МІКУЛЬСКАЯ ўпэўненая, што выбар жаночых сумачак задаволіць любую модніцу.

**** За 15 гадоў работы СТАА «Марко» інвеставала ў развіццё сваіх вытворчасцяў звыш 28 мільёнаў долараў.***

СТАА «Марко» — гэта:

Абутак
- Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю СТАА «Марко»
- Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю СТАА «Сан Марко»

Вытворчасць абутковых калодак
- Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю СТАА «Вікоп-Фагус»

Скургалантарэя і вытворчасць загатовак абутку
- Прыватнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства «ВІТМА»

Фірменная гандлёвая сетка
- Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко-Сэрвіс»

Піва
- Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю СТАА «Дзвінскі бровар»

Сацыяльна-культурныя аб'екты
- Рэстаран «Залаты леў»
- Фірменныя бары пад брэндам «Николаевское»
- База адпачынку «Ходцы»

Фірменны гандаль СТАА «Марко»

Калекцыя мадэляў «Марко» налічвае больш за 600 узораў мужчынскага, жаночага, падлеткавага дзіцячага і спартыўнага абутку. Як разабрацца ў тым, што неабходна сёння пакупніку, спрагнаваць мяркуемы попыт. Вырашыць гэтыя пытанні дапамагае фірменная гандлёвая сетка.

Першы магазін кампаніі «Марко» з'явіўся ў 1994 годзе. А калі ў 1996 годзе фірменны гандаль значна вырас, то ўзнікла неабходнасць ў стварэнні спецыялізаванага сэрвіснага прадпрыемства. Так з'явілася прадпрыемства «Марко-Сэрвіс», якое зараз ўключае ў сябе 25 магазінаў, дзесяткі грузавых і легкавых аўтамабіляў.

Магазіны «Марко» размешчаны ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі. У бліжэйшай перспектыве «Марко» збіраецца ахапіць фірменнай сеткай усе беларускія гарады з колькасцю насельніцтва звыш 20 тысяч чалавек.

Магазіны «Марко» добра вядомыя і расіянам. У Маскве працуюць 3 фірменныя гандлёвыя аб'екты.

г. Віцебск
- Гандлёвы дом «Марко-Стыль», вул. Талстога, 5, тэл. (+375-212) 37-63-80
- Гандлёвы дом «Марко», вул. Чарняхоўскага, 10, тэл. (+375-212) 22-78-00
- цэнтр абутку «Марко», пр-т Людніка, 16, тэл. (+375-212) 24-09-70
- магазін-салон «Марко», пр-т Маскоўскі, 8, тэл. (+375-212) 27-71-42
- павільён «Марко», Смаленскі рынак, тэл. (+375-212) 36-58-21;

г. Мінск
- вул. Казлова, 2, тэл. (+375-17) 2-849-154
- вул. Кашавога, 35, тэл. (+375-17) 2-307-303
- вул. Чкалава, 35, тэл. (+375-17) 2-190-297
- пр-т Незалежнасці, 43, тэл. (+375-17) 2-847-992

г. Бабруйск
- вул. Мінская, 15, тэл. (+375-17) 58-03-91

г. Полацк
- вул. Камуністычная, 28, тэл. (+375-2144) 4-56-66

г. Наваполацк
- вул. Маладзёжная, 71, тэл. (+3752145) 3-24-88

г. Брэст
- пр-т Маскоўскі, 332, тэл. (+375-162) 42-45-01
- пр-т Машэрава, 39, тэл. (+375-162) 20-30-05

г. Гомель
- вул. Перамогі, 16, тэл. (+375-232) 77-63-66

г. Жлобін
- Мікраграён-1, 1, тэл. (+375-2334) 5-07-91

г. Магілёў
- вул. Ціміразеўская, 36, тэл. (+375-222) 32-75-95
- вул. Першамайская, 40, тэл. (+375-222) 28-74-90

г. Маладзечна
- вул. Б. Хмяльніцкага, 22А, тэл. (+375-1773) 5-35-97

г. Орша
- вул. Леніна, 23, тэл. (+375-2162) 1-16-42

г. Светлагорск
- м-н Першамайскі, 3А, тэл. (+375-2342) 2-31-33

г. Салігорск
- вул. Казлова, 26А, тэл. (+375-1710) 5-05-26

г. Баранавічы
- вул. Савецкая, 105А, тэл. (+375-0163) 41-03-84).

Фірменны гандаль СТАА «Марко» не толькі гонар прадпрыемства, але і неад'емная частка бізнэсу.

Фірменныя магазіны «Марко» — непасрэдныя ўдзельнікі рэкламных акцый і арганізатары шматлікіх выставак-продажаў

СТАА «Сан Марко»

Слова «сан» у еўрапейскіх мовах паводзіцца як «святы» ці як «сын». Відавочна, што апошні перавод найбольш дакладна адлюстроўвае сутнасць дзейнасці дачынай фірмы, якая ўтварылася ў 2003 годзе. Тут акрамя «дараслага» мужчынскага і жаночага абутку вырабляецца дзіцячы і падлеткавы асартымент. Штогод — каля 600 тысяч пар. Акрамя традыцыйных камфорту і бяспекі — асноўных крытэрыяў дзіцячага абутку, тут шмат увагі надаюць колеру, дэкаратыўнаму аздабленню. А самае галоўнае, абутак ад «Сан Марко» выхоўвае добры густ з дзяцінства.

СТАА «Вікоп-Фагус»

Для таго, каб рабіць камфортны абутак, зручны для айчынных вытворцаў, у лістападзе 1999 года «Марко» арганізоўвае прадпрыемства «Вікоп-Фагус». На сёння гэта адзіная на тэрыторыі Беларусі вытворчасць, якая займаецца вырабам абутковых калодак. Адметна, што «Вікоп-Фагус» забяспечвае абутковымі калодкамі не толькі айчынныя прадпрыемствы, але і многія рэгіёны Расіі.

На «Марко» ўпэўненыя, што задача шыць камфортны і зручны для паўсядзённага нашэння абутак у многім вырашана дзякуючы дзейнасці СТАА «Вікоп-Фагус».

Майстры МАРКО могуць многае, нават пашыць мадэльны абутак для гуліверaў. Гэта сцвярджае вядучы мадэльер Таццяна Мяньшых, якая дэманструе рэкламны ўзор мужчынскага абутку 62 памеру.

Працягваючы традыцыі мецэнатаў

СТАА «Марко» ў многім працягвае добрыя традыцыі рускіх прамыславікоў: вернасць дадзенаму слову, сумленнасць і шчырасць у адносінах і, канешне ж, мецэнацтва.

З першага дня свайго існавання «Марко» аказвала дабрачынную дапамогу інвалідам, воінам-інтэрнацыяналістам, гарадскім школам, спартыўным клубам, медыцынскім установам, творчым калектывам, епархіяльнаму ўпраўленню.

Матэрыялы рэкламна-інфармацыйнай старонкі падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У сённяшняй калекцыі прадпрыемства больш за 600 мадэляў абутку на ўсе густы: элегантная і дзелавая, спартыўная і паўсядзённая, летнія басаножкі і зімовыя боты, вясёлыя мадэлі для дзяцей і строгія для прадстаўнікоў бізнэсу і дзелавых колаў.

СТАА «Марко»: 15 гадоў на абутковым рынку. Гістарычныя вехі

1991 год — арганізавана фірма «ЛМ+МК». Пачаўшы як гандлёва-закупачная кампанія, яна хутка пачала развівацца як вытворчая фірма;

1993 год — уведзена лінія па вытворчасці мужчынскага абутку з натуральнай скуры на поліурэтанавай падэшве;

1995 год (4 лістапада) — упершыню на «Марко» сталі выпускаць падлеткавы і дзіцячы абутак;

1996 год (красавік) — выпушчана мільённая пара абутку з таварным знакам «Марко»;

1996 год — створана ТАА «Марко-Сэрвіс»;

1996 год (верасень) — здадзены ў эксплуатацыю асноўны адміністрацыйна-вытворчы корпус фабрыкі «Марко», зроблены поўны перавод вытворчасці з арандуемых на ўласныя;

1997 год — асвоены клеявы метад мацавання, што дазволіла «Марко» пачаць вытворчасць жаночага мадэльнага абутку;

1997 год (люты) — адкрылася ПУВП «ВітМа». На прадпрыемстве пачалася вытворчасць аксесуараў: сумак, кашалькоў, паясоў, рамянёў.

1999 год (лістапад) — зарэгістравана сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства «Вікоп-Фагус», якое не мае аналагаў у Беларусі. На гэтым прадпрыемстве наладжаны выпуск абутковых калодак;

2003 год (красавік) — з канвеера СТАА «Марко» сышла 10-мільённая пара абутку;

2003 год (ліпень) — адкрылася СТАА «Сан Марко»;

2003 год — асвоены новы від зімовага абутку тыпу «ўнты», у якіх сучасныя модныя тэндэнцыі ўдала зліліся з традыцыйнымі для паўночных раёнаў матывамі;

2005 год (сакавік) — пачалася вытворчасць спартыўнага і прагулачнага абутку «Марко-спорт»;

2005 год (ліпень) — на паліцы магазінаў паступіла піва «Николаевское», выпушчанае на СТАА «Дзвінскі бровар»;

2006 год (люты) — на СТАА «Марко» выпушчана 15-мільённая пара абутку;

2007 год — СТАА «Марко» паспяхова прайшло сертыфікацыю на адпаведнасць работы прадпрыемства сусветным стандартам ИСО 9001.

СТАА «Марко» лічыць сваёй асноўнай задачай дасягненне высокага ўзроўню якасці і канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі, своечасовае задавальненне патрабаванняў спажыўцоў, што гарантуе высокаэфектыўную дзейнасць прадпрыемства і рост дабрабыту калектыву.

Прыватнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства «ВІТМА»

Вядома, што моду ствараюць аксесуары. Нават дылетанты ў модзе скажуць, што стыль ствараюць добры абутак і аксесуары. Не дзіўна, што СТАА «Марко» звярнулі ўвагу на скургалантарэйныя вырабы.

Усё пачыналася ў 1996 годзе. На прадпрыемстве «ВІТМА» пачалі перапрацоўваць адходы асноўнай абутковай вытворчасці і шыць з іх партмане, футляры для ачкоў і іншую дробязь. Чарговым этапам развіцця даччынага прадпрыемства стаў выраб скураных сумак. За аснову вытворчасці былі ўзяты апошнія італьянскія тэхналогіі. А каб задаволіць патрэбы асноўнай вытворчасці ў камплектуючых, на прадпрыемстве «ВІТМА» была ўведзена лінія пашыву загатовак верху абутку.

Штогод прадпрыемства выпускае каля 40 тысяч скургалантарэйных вырабаў і 210 тысяч загатовак абутку.

Адметна, што на СТАА «ВІТМА» ўкаранёна сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням СТБ ИСО 9001-2001.

Рэстаран-бар «Залаты леў» запрашае на самае смачнае піва «Николаевское», — кажа афіцыянт Аляксандр РАСПОРСКІ.

Тэхнолог участка варкі піва Святлана ПУХАВА ведае шмат сакрэтаў вырабу гэтага старажытнага напітку.

Знаўцы высока адзначаюць піва «Николаевское» маркі цёмнае, светлае і Пілзнер.

Інжынер Дзмітрый ВЫШЫНСКІ на адным з участкаў вытворчасці піва.

Гэта цікава ведаць...

- ***кожная 4-я пара скуранога мадэльнага абутку, які выпускаецца ў Беларусі, — з канвеера «Марко»;***
- ***прадпрыемства ўкамплектавана больш чым 1 тысячай адзінак асноўнага тэхналагічнага і дапаможнага абсталявання;***
- ***на ўсіх прадпрыемствах «Марко» працуе больш за 2,6 тысячы чалавек;***
- ***штодзень СТАА «Марко» і СТАА «Сан Марко» выпускаюць больш за 10 тысяч пар абутку;***
- ***за 2006 год падатковыя плацяжы ў дзяржбюджэт — 25 мільярдаў 303 мільёны рублёў;***
- ***усе віды абутку, выпушчаныя на СТАА «Марко», маюць сертыфікаты адпаведнасці патрабаванням Нацыянальнай сістэмы сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь і Дзяржстандарта Расійскай Федэрацыі.***



Сёлета «Марко» плануе пачаць будаўніцтва гандлёва-забаўляльнага цэнтра ў Віцебску. Агульная плошча аб'екта больш за 24 тыс. кв. метраў. У гараджан з'явіцца яшчэ адно ўпадабанае месца.

СТАА «Дзвінскі бровар»

Піваварня «Дзвінскі бровар» — гэта астравок піўной Еўропы ў Віцебску.

У знакамітым Законе аб чысціні піва «Reiheitsgebot», выдадзеным у Германіі яшчэ ў 1516 годзе, сказана, што «піва павінна ўтрымліваць толькі тры кампаненты: ваду, солад і хмель». Для прадпрыемства «Марко» Закон аб чысціні піва стаў такім жа абавязковым, як і для нямецкіх півавараў.

Піваваранае прадпрыемства «Дзвінскі бровар» бярэ свой пачатак у 2004 годзе, калі на тэрыторыі колішняга прадпрыемства «Віцебскае піва» пачалося будаўніцтва новай вытворчасці. Каб варыць у Беларусі сапраўднае еўрапейскае піва завод з нямецкага горада Манхайма перавезлі цалкам. Ужо праз год аматары пеністага напою змаглі па заслугах ацаніць піва «Николаевское». Яго галоўнае адрозненне ад іншых марак заключаецца ў тым, што зварана па арыгінальнай рэцэптуры, якая на працягу многіх стагоддзяў прыносіла поспех і перавагу баварскім піваварам.

Сёння «Дзвінскі бровар» — гэта
- вада з уласнай 54-метровай свідравіны, якая прайшла праз спецыяльную шматступеньчатую сістэму ачысткі;
- хмель і солад, якія адпавядаюць патрабаванням нямецкіх півавараў;
- вытворчасць пад кантролем нямецкіх півавараў Privatbrauerei Michelsbrau Babenhaysen/Hessen;
- «Николаевское» — гэта чатыры сарты піва: «Николаевское Пілзнер», «Николаевское моцнае», «Николаевское цёмнае» і «Николаевское светлае»
- ліцэнзійны сорт піва «Урштайн Прэміум» — празрыстае, з чыстым саладавым смакам, з лёгкай хмелевай горыччу і хмельным водарам;
- паводле даных чэрвеня 2007 года, аб'ём продажаў павялічыўся ў 3 разы ў параўнанні з аналагічным перыядам 2006 года;
- разліў у шкляныя бутэлькі і КЕГі робіцца халодна-стэрыльным спосабам.

Стратэгія бізнэсу «Марко» скіроўваецца ў сферу паслуг. Рэстаран, сетка піўных бараў, база адпачынку — гэта толькі першыя крокі да стылю жыцця ад «Марко».

Мікалай МАРТЫНАЎ, генеральны дырэктар СТАА «Марко»:

«МЫ НІКОЛІ ПАД ЧУЖОЕ ІМЯ НЕ ПАДСТРОЙВАЛІСЯ»

Жыццё кожнага з нас, як правіла, складаецца з шэрых будняў, выхадных і святочных дзён незалежна ад абставінаў. Гэта як установленыя парадак. Праўда, незалежна ад такога раскладу на жыццёвым шляху здараюцца моманты, калі чалавеку хочацца спыніцца, перавесці дыханне, проста аглянуцца назад, каб ацаніць зробленае і не думаць пра «бесцельно прожитые годы», якіх, на шчасце, не было.

Безумоўна, што падставай для такіх разважанняў можа стаць пэўная важная прычына, напрыклад, чарговы юбілей. Зазірнуў у пашпарт, а табе ўжо «полтинник» набягае. Хоць рэакцыя можа быць зусім іншая, калі можаш успомніць меладычны напеў пра «мои года — мое богатство». Зрэшты, у чытачоў «Звязды» ёсць рэальная магчымасць пазнаёміцца з сапраўдным юбілярам, якому менавіта сёння спаўняецца 50 гадоў. Гэта — Мікалай Мартынаў — вядомы ў многіх колах чалавек: прадпрымальнік — крыху больш чым за дзесятак гадоў Мікалай Васільевіч змог вывесці абутковую фірму «Марко» да небывалых вышынь, пераўтварыўшы яе ў сапраўдны холдынг з півавараннай галіной, транспартным падраздзяленнем, шырокай сеткай фірменнага гандлю, базай адпачынку... Амаль за тры гады работы ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі спадар Мартынаў стаў зубрам у заканадаўчай справе. Знаёмыя характарызуюць яго як заўзятага паляўнічага, добрага сем'яніна і проста прыгожага мужчыну, які не па чутках ведае, што такое жыццёвыя рэаліі і як змагацца з самымі разнастайнымі праблемамі на вытворчасці, застаючыся пры гэтым спакойным і разважлівым чалавекам. З ім вядзе гутарку наш карэспандэнт.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Мікалай Васільевіч, як вы ставіцеся да ўзросту ці проста да чарговай юбілейнай даты?

— Спакойна. Колькі табе адмерана ў гэтым жыцці — значыць, столькі і пражывеш. Іншая справа — як ты гэта зробіш?

— Вы падводзіце да той думкі, што кожны — каваль свайго шчасця.

— Безумоўна. Няхай табе будзе 20, 30 альбо 50 гадоў. А калі ў душы пуста, то малаверагодна, што для цябе гэтыя лічбы адыграюць вялікую ролю. Галоўнае, на мой погляд, — гэта ўнутраны стан чалавека. Хоць, чаго хаваць, кожнаму чалавеку, асабліва жыццёва актыўнаму, хочацца заўсёды быць маладзейшым. Тым не менш паўтаруся, што мая жыццёвая філасофія — быць маладым душой. А цела падтрымліваць у належнай форме праз актыўны лад жыцця.

— Якому віду спорту вы аддаяце перавагу?

— Сказаць, што я займаюся штангай ці бегам — было б няпраўда. Бо мне здаецца, што ў 50 гадоў можна бегчы ўжо ад інфаркту, хоць хацелася б памыліцца. Апошнім часам я шмат хаджу пешшу. Пахвалюся, што скінуў цэлых 15 кіло ўласнай вагі. Звычайна раз на тыдзень гуляю ў валейбол, наведваю лазню, дзе абавязкова плаваю ў басейне. Пэўна, што мой адказ на ваша пытанне — не рэцэпт для пахудзення, хоць, магчыма, камусьці гэтага хопіць, каб адчуваюць сябе ў добрай форме, не звяртаючы асаблівай ўвагі на гады.

— Зразумела, што такая рытмічнасць вашага жыцця дасягнута не адразу. Я ўжо не кажу пра пачатак 90-х, калі Мікалай Мартынаў пачынаў свой шлях бізнэсмена.

— Канешне, зараз, калі прадпрыемства «Марко» працуе як гадзіннік, я магу сабе дазволіць выкрайць не толькі дзень-другі для адпачынку ў выхадныя, але і час для водпуску. Хоць і пакрыўлю душой, калі пачну скардзіцца на надзвычай непасільную працу днём і ноччу ў перыяд станаўлення. Відавочна, што падсвядома я быў гатоў да розных цяжкасцяў. Зрэшты, абутковы накірунак фірмы «Марко» вызначыўся не ў сярэдзіне 1991 года. Тады ў кампаніі сузаснавальнікаў малога прадпрыемства мы займаліся аптовым гандлем і выпускам вырабаў са штучнага футра. І толькі праз два з паловай года быў арганізаваны выпуск мужчынскага абутку на арандаваных плошчах, а праз паўгода абутковая вытворчасць была пераўтворана ў самастойную юрыдычную асобу — таварыства з абмежаванай адказнасцю.

— Мікалай Васільевіч, у перыяд, аб якім мы гаворым, ужо ў пэўнай ступені быў сфарміраваны абутковы рынак, сярод якіх ужо значыліся абутковыя маркі накшталт «Белвеста», «Ленвеста» і іншых плюс велізарны аб'ём імпарту. Верагодна, што пачатак абутковай справы быў звязаны і з пэўнай доляй небяспекі: а раптам не ўдасца прыжыцца на рынку?

— Безумоўна. Але ж калі вельмі хочаш пачаць сваю справу і паставіць яе на шырокую нагу — рана ці позна пачынаць прыходзіцца, нягледзячы на тое, што будзе заўтра. Чамусьці я быў упэўнены, што прадпрыемства «Марко» не прагарыць. Па-першае, на той час, нягледзячы на буйны росквіт некаторых абутковых тады монстраў, абутку ўсё роўна выпускалася ў некалькі разоў менш, чым у савецкі перыяд. Па-другое, на пачатак 90-х у нашай краіне было ўнікальнае заканадаўства, якое рэальна стымулявала развіццё бізнэсу. Калі больш канкрэтна, то пры ўкладванні інвестыцый у новую вытворчасць прадпрымальнік ці прадпрыемства вызваляліся ад падатку на прыбытак. Гэты фактар мы і скарысталі. Напрыклад, сённяшняе галаўное прадпрыемства «Марко» пабудавана на такіх заканадаўчых умовах. На жаль, гэты закон праз пэўны час быў адменены. Хоць, на мой погляд, ён мог бы яшчэ гадоў 10 праіснаваць. Бо сёння, каб развіцца, неабходны вялікі пачатковы капітал. Неабходныя грошы, каб закупіць высокатэхналагічнае абсталяванне, узвесці ці арандаваць вытворчыя памяшканні і г.д.

— На той час спадар Мартынаў кім быў больш: прадпрымальнікам ці эканамістам?

— Скажу так: у адной асобе ў двух іпастасях. Пры гэтым у мяне за плячыма дзве адукацыі: тэхнікум лёгкай прамысловасці і інстытут, дзе я спецыялізаваўся на паліталогіі...

— Гэта ж зусім розныя рэчы?

— Гэта і так, і не так. Пры выбары перспектывы якраз лепш ацэньваць сітуацыю праз прызму разнапрофільных прафесій, чым праз адну вузкую спецыялізацыю.

— І усё ж за 15 гадоў, праведзеных на ніве бізнэсу, вам давялося атрымліваць дадатковую адукацыю, напрыклад, тую ж эканамічную?

— Не здзіўляецеся, але не. Відаць, не было і часу, і патрэбы, бо, лічыце, за час вядзення вытворчасці я «прапусціў» усю эканоміку праз сябе. Да таго ж на прадпрыемстве «Марко» сабралася прафесійная каманда-штаб упраўленцаў, якія выдатна ведаюць сваю справу. Мая задача — скіроўваць усе ініцыятывы і прапановы ў патрэбнае рэчышча і каардынаваць усю дзейнасць з пазіцыі аднаго з заснавальнікаў.

— Мікалай Васільевіч, што ні кажыце, а назва кампаніі «Марко» сугучна з той амерыканскай фірмай «Марко Поло»...

— Зразумеў, да чаго хіліце. Адразу адкажу, што мы ніколі пад чужое імя не падстройваліся. Назва прадпрыемства «Марко», на думку некаторых, пайшла ад Мартынава і кампаніі. На самай жа справе імя «Марко» — гэта, лічу, удалае спалучэнне скарочаных прозвішчаў заснавальнікаў фірмы. Дарэчы, у мяне нават і ў думках не было, каб зрабіць кар'еру за чужы кошт. І толькі таму, што ўсё сваё свядомае жыццё разлічваў на свае сілы і магчымасці.

— А гэта праўда, што ваш працоўны стаж на абутковым фронце пачынаецца не з пачатку 90-х, а нашмат раней...

— Праўда. Сваю працоўную кар'еру пачаў у дзіцячым узросце, дзесьці гадоў з трох. Наша вялікая сям'я жыла ў вёсцы ў Дубровенскім раёне. Мой бацька быў вялікім майстрам па вырабу валёнак у акрузе. Як зробіць пару — дык адносіш яе два—тры сезоны без праблем! А пакольк і ў той час зімой валёнкі амаль не здымалі з ног, бо іншага абутку не было, якой якасці павінен быць тавар?! Мне прыемна і зараз успомніць, што давялося ўдзельнічаць у такім сямейным «бізнэсе». Маці разам з малымі дзецьмі ўкатвала воўну, а бацька выконваў самую адказную частку работы — фарміраваў воўну.

— А сёння вы можаце зваляць валёнкі?

— Канешне. І зраблю ў лепшых дубровенскіх традыцыях за 2—3 дні. Праўда, наладжваць канвеер па выпуску валёнак на прадпрыемстве «Марко»пакуль няма неабходнасці, бо час патрабуе выпускаць не менш адмысловы, прыгожы і зручны абутак, чым валёнкі. І мы павінны кіравацца гэтым патрабаваннем, бо для поспеху ў бізнэсе заўсёды неабходна сачыць за тэндэнцыямі рынку і своечасова і ў поўным аб'ёме задавальняць яго патрэбы.

— Мяркуючы па размаху развіцця кампаніі, вам гэта з поспехам удаецца.

— Ведаеце, пры нашых аб'ёмах выпуску, а гэта каля 2,5 мільёна пар мужчынскага, жаночага, дзіцячага і спартыўнага абутку ў год, прадукцыі не хапае. Мы сябе адчуваем вінаватымі перад пакупнікамі ў тым, што не можам задаволіць усе заяўкі. І гэта пры тым, што кожны год прадпрыемства павялічвае аб'ёмы тавару. Прычым не стыхійна, а вывераны, пад спажыўца.

— Мікалай Васільевіч, сёння як ніколі можна назваць вас паспяховым чалавекам ў бізнэсе. Хоць так можна меркаваць толькі з пазіцыі дылетанта, бо за пладамі карпатлівай шматгадовай работы неяк убаку застаецца такая рыса, як рызыка. Вы чалавек рызыкоўны?

— Не я гэта прыдумаў, што той, хто не рызыкуе — не п'е шампанскага. Па жыцці вельмі шмат даводзілася і даводзіцца зараз рызыкаваць. Ды што там казаць: бізнэс — гэта таксама рызыка, у многім фартуна. У жыцці даводзілася нешта ставіць на вагі і казаць сабе: калі не рызыкну — не бачыць мне ўдачы. Праўда, гэта не значыць, што я магу зараз паспрачацца з вамі на тое, што змагу падняць нейкую неймаверную вагу, ці ўзняць у паветра самалёт. Рызыка таксама павінна быць разумнай.

— Пра самалёт, зразумела, размовы не будзем весці. А вось пра аўтамабіль хацелася б. Наколькі я ведаю, вы вялікі дока ў аўтамабільнай модзе і вельмі спраўна ўпраўляецеся за баранкай машыны. Любіце хуткую язду?

— Хацелася б, канешне, адказаць амаль па Гогалю: які ж беларус не любіць хуткай язды? Гэта на самай справе так. Ведаеце, па рабоце мне вельмі патрэбен аўтамабіль, прычым падчас і без шафёра. За рулём таго ж паўнапрываднага пазадарожніка, асабліва за горадам, атрымліваеш пэўную долю адрэналіну, а калі паддасі крышку больш газу...

— Вы здольны парушыць Правілы дарожнага руху?

— Я ніколі не сяду за руль пасля келіха шампанскага ці піва — гэта як закон. А вось калі некуды спяшаешся на сустрэчу, ад чаго напрамую залежыць удалым ці няўдалым акажацца працоўны дзень, то замест дазволенай хуткасці ў 90 ці 120 кіламетраў у гадзіну магу крышку перавысіць хуткасць. Праўда, пры ўмове, што дарожная абстаноўка гэта дазволіць і, як кажуць, без фанатызму. Рызыкуеш, канешне, патрапіць у рукі інспектару ДАІ, але ж, упэўнены, што міліцыянеру заўсёды можна патлумачыць свой учынак. Ну, а калі аштрафуе, значыць, так трэба.

— Як чалавек забяспечаны, спадар Мартынаў займаецца мецэнацтвам, дапамаючы маламаёмасным, удзельнічаючы ў рэстаўрацыі некаторых помнікаў культуры ў Віцебску, і іншымі справамі па аказанню адраснай дапамогі. Вы верыце ў Бога ці ў нейкую звышсілу?

— Як праваслаўны чалавек, я не з'яўляюся атэістам. Хоць у кожнага з нас у душы свой бог. Тым не менш у маім разуменні вера ва Усявышняга — гэта зусім не тое, калі хадзіць па вуліцы і на кожным кроку хрысціцца. На мой погляд, верыць — гэта значыць быць шчырым чалавекам, добрым па натуры, не зайдросным. Пры гэтым не абавязкова кожны дзень чытаць нейкую малітву і хадзіць у царкву.

— Мікалай Васільевіч, як чалавеку вядомаму, асабліва ў сваім рэгіёне, вам часта даводзіцца быць на людзях, удзельнічаць у розных праектах. Вы любіце масоўкі? Вам прыемна, калі на вуліцы прахожыя скажуць: вунь Мартынаў пайшоў. Гэта такі паважаны чалавек...

— Канешне, мне не аднойчы даводзілася чуць пра сваю асобу ў самых розных сітуацыях, у тым ліку і ў размовах на вуліцы. Праўда, мне такая папулярнасць не патрэбная. Па натуры я чалавек не публічны і не хацеў бы чуць розныя дыфірамбы ў свой адрас.

— Тым не менш ад публічнасці вам нікуды не дзецца. Акрамя шматлікай работы на шматпрофільнай вытворчасці пад назвай «Марко», вы яшчэ з'яўляецеся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, членам Савета па прадпрымальніцтву пры Прэзідэнце краіны.

— Гэта зусім іншая іпастась. Да таго ж у гэтых структурах шмат заслужаных людзей ад вытворчасці, дзе мая асоба ў прамым сэнсе гэтага слова не больш значная за іншыя.

— Такая грамадская нагрузка станоўча ўплывае на ваш працоўны расклад, як кажуць, на асноўным месцы работы?

— Не шкодзіць — гэта дакладна. У Савеце Рэспублікі за амаль тры гады работы я пачарпнуў шмат чаго новага для сябе. Ды і пастаянныя кантакты з маімі калегамі, якія, лічыце, прадстаўляюць перадавую частку прамыславікоў, людзей ад сельскай гаспадаркі, культуры, спорту і іншых галін эканомікі вельмі шмат значаць.

— На ваш погляд, як чалавека, які ў мінулым годзе з рук кіраўніка дзяржавы атрымаў медаль «За працоўныя заслугі», наколькі важным і эфектыўным можна лічыць ролю Савета па прадпрымальніцтву пры Прэзідэнце краіны?

— Безумоўна, што гэты грамадскі орган — вельмі важны інструмент для фарміравання прадпрымальніцкага асяроддзя ў краіне. У нашай гісторыі было шмат цікавых старонак і не вельмі. Сёння ўжо новыя ўмовы развіцця, якія патрабуюць новых падыходаў у развіцці бізнэсу. Уявіце сабе, што новаспечаны прадпрымальнік кінуты ў акіян праблем, у сувязі з чым ён можа патрабаваць адно, другое, трэцяе. І нам патрэбна збіраць на крупінках усе патрабаванні і прапановы, як фільтр, ачышчаць патрэбнае ад непатрэбнага. У выніку ўзяць частку праблем на сябе, астатнюю — пакінуць на вырашэнне чалавеку, які павінен паказаць свой спрыт і магчымасці арганізаваць справу і развівацца далей, плаўна пераадольваючы канкурэнцыю, упісвацца ў заканадаўства і г.д.

Зрэшты, калі чалавек рашыў адкрыць сваю справу — няхай дзейнічае, не баючыся памыліцца. Як вядома, не памыляецца той — хто нічога не робіць.

— Мікалай Васільевіч, не будзем удавацца ў падрабязнасці таго, колькі шышак набілі вы сабе і калі за больш чым паўтара дзесятка гадоў дзейнасці прадпрыемства «Марко». Тым не менш вы збіраецеся рэалізоўваць сябе далей і пабудаваць у Віцебску маштабны па памерах гандлёва-забаўляльны цэнтр.

— Сапраўды, ёсць такія планы за кошт уласных інвестыцый узвесці за некалькі гадоў шыкоўны комплекс у цэнтры горада. Зараз ідуць узгадненні з гарадскімі ўладамі па графіку работ, прадухіленню магчымых сітуацый, якія б маглі адмоўна паўплываць на работу гарадскога транспарту, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і вырашэнню іншых пытанняў. Мяркую, што сёлета мы пачнём ужо будаўнічыя работы і за некалькі гадоў гандлёва-забаўляльны комплекс будзе ўзведзены ў лепшых традыцыях якасці кампаніі «Марко».

— Вашаму жыццёваму аптымізму і руплівасці можна толькі па-добраму пазайздросціць. Ведаеце, асабіста ў мяне склалася ўражанне, што у вас пры такіх планах і каласальнай загрузцы на многіх накірунках вытворчай і грамадскай дзейнасці проста няма часу на адпачынак, сям'ю, нейкія захапленні...

— Раней здаралася ўсялякае. Напрыклад, год ці два я мог не паехаць адпачыць на мора ці проста паўнацэнна схадзіць ў водпуск, прысвяціўшы яго сям'і ці паездкі па Беларусі. Хоць цяпер, паўтаруся, рабочы графік ужо дазваляе мне мець больш вольнага часу. У выхадны дзень я магу адправіцца на паляванне — гэта маё хобі. Праўда, для мяне важна не забіць жывёлу, а адзін на адзін пабыць з прыродай, падыхаць свежым паветрам, сустрэцца з сябрамі. На сямейным фронце таксама ўсё ў парадку. Жонка, сын і дачка мяне цудоўна разумеюць з самага пачатку станаўлення кампаніі «Марко», таму праблем з тым, што не заўсёды ўдзяляў ім ўдзяляю належную ўвагу, няма, за што ім вялікі дзякуй. Прызнаюся, што такое разуменне ў многім дапамагло мне дасягнуць сённяшніх маштабаў.

— Мікалай Васільевіч, ад усіх звяздоўцаў прыміце віншаванні са знамянальнай для вас датай — 50-гадовым юбілеем. Дазвольце на заканчэнне размовы рытарычнае пытанне: калі б давялося пачынаць усё з нуля з пазіцыі ўмудронага жыццём чалавека, вы зрабілі б нешта на сваім шляху па-іншаму?

— Дзякуй за віншаванне. Што датычыцца таго, як бы я пражываў жыццё ў бізнэсе па-новаму. Думаю, што нічога кардынальна мяняць не стаў бы, бо вялікіх памылак не рабіў, а тыя, што былі, — вучылі мяне жыць, дапамагалі набываць неабходны вопыт. Адназначна, што я прайшоў бы той жа самай сцяжынкай, бо сёння за сваю работу перад роднымі, блізкімі, сябрамі, знаёмымі, работнікамі прадпрыемства «Марко» мне не сорамна.

Гутарыў Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ІМ НЕ ПАТРЭБНА ШКАДАВАННЕ,

або Асноўны бар'ер — у нашай свядомасці

На шляху чалавека з абмежаванымі магчымасцямі — незлічоная колькасць перашкод рознага кшталту. Сацыяльныя, архітэктурна-будаўнічыя, інфармацыйныя... Але ўсе яны пачынаюцца з бар'ера ў нашай свядомасці. Толькі ў тым выпадку, калі кожны з нас успрыме інваліда, як сабе роўнага, можна будзе гаварыць пра безбар'ернае асяроддзе ў нашым грамадстве.

У Беларусі — 580 тысяч інвалідаў. Але мы не памылімся, калі павялічым гэтую лічбу ў тры, а то і ў чатыры разы, бо амаль усе праблемы людзей з абмежаванымі магчымасцямі кладуцца на плечы іх блізкіх. Акрамя гэтага, ёсць такія людзі, якія, атрымаўшы інваліднасць, не афішуюць сваю хваробу, — канстатуе старшыня арганізацыйнага аддзела Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Тамара Крутаўцова, — бо ведаюць, што начальнік папросіць іх пакінуць працоўнае месца.

У сістэме грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» працуе 14 прадпрыемстваў. Іх паўнапраўнымі гаспадарамі з'яўляюцца 20 тысяч інвалідаў. Для гэтых людзей праца з'яўляецца не толькі хлебам, але і душэўнай неабходнасцю. Спецыялізаваныя прадпрыемствы для іх — амаль адзіны шанц рэалізаваць сябе ў гэтым жыцці, бо нідзе не чакаюць невідушчых з шырокімі абдымкамі. Аб гэтым сведчыць тое, што толькі каля 700 інвалідаў па зроку працуюць па-за сістэмай «БелТІЗ».

Сапраўды, стварыць месца працы для інваліда складана. Але асноўная праблема заключаецца не ў матэрыяльных выдатках, а ў нашай свядомасці. Цяжка зламаць стэрэатып наконт таго, што сляпы — бескарысны для грамадства, што яго абавязкова патрэбна ізаляваць. Каб пазбавіцца ад распаўсюджанай думкі, патрэбны час. І не малы.

Насамрэч сярод інвалідаў па зроку вялікая колькасць таленавітых людзей (пасля таго як чалавек страчвае зрок, Бог дае яму вялікія кампесаторныя магчымасці). Многія з іх маюць вышэйшую адукацыю. Напрыклад, на мінскім прадпрыемстве «Светлапрыбор» за станком сядзіць больш як 150 інвалідаў з дыпломам ВНУ. Сярод іх — псіхолагі, педагогі, рэабілітолагі.

— У Еўропе інваліды па зроку маюць магчымасць асвоіць любую прафесію, стаць выдатнымі спецыялістамі ў любой сферы і канкураваць са здаровымі людзьмі, — расказвае Тамара Крутаўцова. — У нашай жа краіне МРЭК чамусьці абмяжоўвае спіс прафесій для інвалідаў па зроку. Большасць з іх, згодна з заключэннем медыкаў, вымушана працаваць за станком. Мы спадзяёмся, што ў нашай краіне спіс рэкамендацый месцаў працы інвалідаў па зроку з вышэйшай адукацыяй пры садзейнічанні Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь пашырыцца.

Вось, да прыкладу, Юрый Васілеўскі, татальна сляпы чалавек, які працуе на заводзе зборшчыкам на працягу 20 гадоў, плануе асвоіць камп'ютар.

— У нас на заводзе ёсць камп'ютарны клас. За камп'ютарам будучыня. І гэта не сакрэт. (Будучыня планеты, магчыма, і за камп'ютарам, а вось будучыня пяцігадовага сына Юрыя залежыць менавіта ад бацькі. — **Аўт.**). Але многія мае знаёмыя, якія самастойна авалодалі камп'ютарнымі тэхналогіямі, усё роўна не могуць знайсці работы, бо не маюць дакумента, які б сведчыў, што інвалід па зроку можа працаваць за камп'ютарам.

Яшчэ адна сацыяльная перашкода для невідушчых і слабавідушчых людзей — адсутнасць магчымасці браць ільготныя крэдыты на сродкі рэабілітацыі (кіёк, гукавы гадзіннік, магнітафон, які даўно трэба было замяніць камп'ютарам). А камп'ютар — рэч не танная, не кожнаму інваліду па зроку ён па кішэні. Тым не менш, ён з'яўляецца на сёння важным сродкам рэабілітацыі, з дапамогай спецыяльных праграм, якія інваліды называюць «гаварылкамі», невідушчы чалавек можа і чытаць, і пісаць, і карыстацца Інтэрнэтам.

У сувязі з тым, што колькасць інвалідаў па зроку вялікая, а сфера дзейнасці вузкая, прадукцыя, якую яны вырабляюць (разеткі, выключалнікі, падаўжалнікі) не заўсёды запатрабаваная, асабліва на ўнутраным рынку.

— У нашу краіну імпартуюць больш якасныя разеткі з Расіі, больш танныя — з Кітая. Канкураваць вельмі складана. Таму і рэнтабельнасць нашых прадпрыемстваў невысокая, — гаворыць дырэктар ПУП «Светлапрыбор» ГА «БелТІЗ» Канстанцін Канойка. — Нідзе ў свеце няма адвёртачнай вытворчасці. Усе прадпрыемствы перайшлі на машынную. Калі ж і на наш завод паставіць электрычнае абсталяванне, то кожны рабочы-інвалід можа стаць патэнцыяльным беспрацоўным.

Чарговым бар'ерам на шляху інвалідаў па зроку з'яляецца жыллё.

— Каля 300 інвалідаў па зроку ва ўзросце да 30 гадоў не працуюць. Жывуць з бацькамі ў вёсках, — адзначае Канстанцін Канстанцінавіч. — Калі б яны нават і захацелі працаўладкавацца ў нас, то гэта было б немагчыма. Бо мы не можам прадставіць ім месца ў інтэрнаце. Яго проста няма. Самае ж балючае на сёння пытанне — кватэрнае. Не зможа інвалід па зроку на сваю зарплату пабудаваць кватэру ў Мінску. Таму такой катэгорыі людзей мэтазгодна выдзяляць сацыяльнае жыллё. Але і тут мы сутыкнуліся з абсурднай сітуацыяй. Да мяне на прыём прыйшоў татальна сляпы чалавек, які скончыў юрыдычны факультэт, але не змог уладкавацца на работу. Ён сказаў, што яму не выдзяляюць сацыяльнае жыллё, бо яго даход на чатыры тысячы беларускіх рублёў большы за пражыткавы мінімум. Я напісаў хадатайства ў вышэйшыя інстанцыі. Не ведаю, чым гэта скончыцца...

Акрамя сацыяльных перашкод, маюцца і архітэктурна-будаўнічыя бар'еры. Гэта, у першую чаргу, адсутнасць у гарадзе гукавых пераходаў (ёсць толькі ў месцы найбольшай канцэнтрацыі інвалідаў па зроку) нягледзячы на тое, што на многіх святлафорах знаходзяцца адпаведныя знакі.

— Два гады таму мне давялося дабівацца, каб зрабілі гукавы святлафор на вуліцы Бельскага, на пераходзе да гаспадарчай крамы, — расказвае невідушчы Юрый Васілеўскі. — Я размаўляў па тэлефоне хвілін 40 з намеснікам старшыні ДАІ горада Мінска. Ён ніяк не мог зразумець, у чым праблема. Гаварыў, што святлафор будзе перашкаджаць астатнім. А потым, калі пранікся, пакінуў мне свой рабочы нумар тэлефона і прасіў звяртацца з любымі пытаннямі. У выніку святлафор усталявалі.

Дапамаглі б арыентавацца ў прасторы інвалідам па зроку і афарбаваныя ў яркі колер палоскі ў метро ў пачатку і канцы эскалатара, на прыступках пры ўваходзе і на выхадзе з падземнага пераходу.

Таксама нядрэнна было б, каб у крамах знаходзіўся кансультант для сляпых людзей, які б дапамагаў выбіраць прадукты.

Паводле слоў намесніка старшыні Камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ірыны Аляксанавай, праблема стварэння безбар'ернага асяроддзя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі з кожным годам набывае ўсё большую актуальнасць. Пачатак жа дзяржаўнай палітыцы тут паклала прыняцце ў 1991 годзе Закона аб сацыяльнай абароне інвалідаў.

— З наступнага года асобныя катэгорыі грамадзян пазбавяцца некаторых ільготаў. Для інвалідаў жа I і II груп практычна ўсе льготы захаваліся, акрамя пяцідзесяціпрацэнтнай скідкі з кошту праезду на ўнутраных лініях транспарту з 1 кастрычніка да 15 мая і 1 раз у астатні час, а таксама права на бясплатнае ўсталяванне тэлефона з пяцідзесяціпрацэнтнай скідкай па аплаце за карыстанне кватэрным тэлефонам.

На жыццёвым шляху здаровага чалавека незлічоная колькасць калдобінаў і ямак, а што ж тады гаварыць пра сляпых людзей... Бар'ер, бар'ер і яшчэ раз бар'ер. Многае ў сілах дзяржавы. Але самае галоўнае залежыць ад кожнага з нас. Невідушчы чалавек такі ж чалавек, як і мы. І яму не патрэбна шкадаванне, яму проста неабходна разуменне і падтрымка.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.

Эканамічная бяспека

СУПРАЦЬ КАНТРАБАНДЫ ЛОМУ ЁСЦЬ ПРЫЁМЫ

За першую палову гэтага года беларускай міліцыяй спынена дзейнасць 212 нелегальных пунктаў скупкі каляровых і чорных металаў.

Нелагічна, але факт. У Расіі, якая з'яўляецца буйнешым у свеце вытворцам каляровых і чорных металаў, кошт металалому ў адмысловых прыёмных пунктах большы, чым у Беларусі. Розніцу ў цане адразу ж заўважылі ўсюдыісныя айчынныя кантрабандысты і пацягнуліся ў суседнюю краіну «караваны» з медным, алюмініевым ці проста жалезным ламаччам.

Як паведаміла оперупаўнаважаны па асабліва важных справах упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі (УБЭЗ) МУС краіны Вераніка Пасмецьева, толькі за першую палову гэтага года міліцыянеры выявілі 60 злачынстваў, звязаных з крадзяжамі каляровых і чорных металаў, а таксама спынілі дзейнасць 212 нелегальных пунктаў скупкі лому. У дзялкоў падпольнага металічнага рынку канфіскавана 276 тон каляровага і амаль 2 тысячы тон чорнага лому, агульным коштам больш за 1 мільярд рублёў.

За памянёны перыяд было аштрафавана 210 «металістаў». Агульная сума накладзенага на іх штрафу склала больш за 190 мільёнаў рублёў.

Зрэшты, даволі высокія памеры штрафных санкцый (ад 30 да 50 базавых велічынь), відавочна, не вельмі палохаюць кантрабандыстаў. Напрыклад, зусім нядаўна супрацоўнікі службы БЭЗ Магілёўскай вобласці спынілі два грузавікі, якія перавозілі 34 тоны чорнага металу, і выявілі падпольны склад, дзе захоўвалася 5 тон лому.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях адказнасці за парушэнні заканадаўства аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 7 чэрвеня 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 29 чэрвеня 2007 года

Артыкул 1. Унесці ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 76, 2/50; 2003 г., № 83, 2/974) наступныя змяненні:

1. У артыкуле 238:

назву і абзац першы часткі 1 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 238. Ілжывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)

1. Падача індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай юрыдычнай асобы ў гаспадарчы суд заявы даўжніка аб сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве), іншых дакументаў, якія змяшчаюць заведама недакладныя звесткі аб неплацежаздольнасці даўжніка, якая мае або набывае ўстойлівы характар, у мэтах прызнання гэтага даўжніка эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) (ілжывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)) —»;

у абзацы першым часткі 2 словы «2. Ілжывае банкруцтва, якое пацягнула» замяніць словамі «2. Ілжывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва), якая пацягнула».

2. Назву і абзац першы артыкула 239 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 239. Утойванне эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва)

Утойванне неплацежаздольнасці індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычнай асобы, якая мае або набывае ўстойлівы характар, учыненае гэтым індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай, заснавальнікам (удзельнікам) альбо ўласнікам маёмасці гэтай юрыдычнай асобы шляхам прадастаўлення звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, падрабліванне дакументаў, скажэння бухгалтарскай справаздачнасці або іншым спосабам, якое пацягнула нанясенне ўрону крэдытору (крэдыторам) у буйным памеры, —».

3. Артыкул 240 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 240. Наўмысная эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)

1. Наўмысныя стварэнне або павелічэнне неплацежаздольнасці індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычнай асобы, якія ўчынены гэтым індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай, заснавальнікам (удзельнікам) або ўласнікам маёмасці гэтай юрыдычнай асобы ў гаспадарчы суд заявы даўжніка аб сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве), іншых дакументаў, якія змяшчаюць заведама недакладныя звесткі аб неплацежаздольнасці даўжніка, якая мае або набывае ўстойлівы характар, у мэтах прызнання гэтага даўжніка эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) (ілжывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)) —»;

у абзацы першым часткі 2 словы «2. Ілжывае банкруцтва, якое пацягнула» замяніць словамі «2. Ілжывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва), якая пацягнула».

2. Назву і абзац першы артыкула 239 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 239. Утойванне эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва)

Утойванне неплацежаздольнасці індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычнай асобы, якая мае або набывае ўстойлівы характар, учыненае гэтым індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай, заснавальнікам (удзельнікам) альбо ўласнікам маёмасці гэтай юрыдычнай асобы шляхам прадастаўлення звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, падрабліванне дакументаў, скажэння бухгалтарскай справаздачнасці або іншым спосабам, якое пацягнула нанясенне ўрону крэдытору (крэдыторам) у буйным памеры, —».

Артыкул 2. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 63, 2/946) наступныя змяненні:

1. У абзацы другім артыкула 11.30 і абзацы другім артыкула 11.31 словы «ад пяці да дваццаці» замяніць словамі «ад дзесяці да пяцідзесяці».

2. Артыкул 12.13 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 12.13. Неправамерныя дзеянні пры прыняцці мераў па папярэджанню эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва) або пры ажыццяўленні працэдур эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва)

1. Неабгрунтаванае непрыняцце своечасовых мераў па папярэджанню эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва), якія ўстаноўлены ў адносінах да індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычнай асобы, або прадстаўленне не адпаведнага рэчаіснасці абгрунтавання адмовы ў прыняцці такіх мераў, а таксама наўмыснае прыняцце мераў, якія прывялі да эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва), —

цягнуць налажэнне штрафу ў памеры ад дзесяці да пяцідзесяці базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад пяцідзесяці да пяцісот базавых велічынь.

2. Утойванне, адчужэнне, пашкоджанне або знішчэнне маёмасці індывідуальнага прадпрымальніка або юрыдычнай асобы, неплацежаздольнасць якіх мае або набывае ўстойлівы характар, з мэтай сарваць або зменшыць пакрыццё страт крэдытору (крэдыторам), якія ўчынены гэтым індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай, заснавальнікам (удзельнікам) або ўласнікам маёмасці гэтай юрыдычнай асобы шляхам прадастаўлення звестак, якія не адпавядаюць рэ

ДАЎГІ НАШЫ — БЕСПРЫТУЛЬНЫЯ ЖЫВЁЛЫ

У пункт прыёму і часовага ўтрымання жывёл на вуліцы Гурскага мы дабіраліся доўга. Халодны вецер праймаў да касцей, імжэў дробны дождж. Амаль ніхто з сустрэтых людзей не ведаў, дзе гэта знаходзіцца. Таму нам давялося добра паблукаць...

Нарэшце падыходзім да акуратнага двухпавярховага будынка. Унутры — светлыя сцены, людзі ў белых халатах — усё гэта нагадвае звычайную бальніцу. Але пах, які ні з чым не пераблытаеш, адразу пераконвае, што тут утрымліваюцца жывёлы. Кагосьці, напэўна, гэта прымусіць павярнуць назад, але той, хто аднойчы зайшоў у гэтыя дзверы, выйдзе адтуль іншым чалавекам.

У прыёмным пакоі нас сустрэлі ветлівыя жанчыны.

— Ці можна паглядзець жывёл?

— Хочаце каго-небудзь узяць?

— Не ведаем... Многа людзей сюды прыходзіць?

— Так. Адны забіраюць жывёл, іншыя прыносяць знойдзеных на вуліцы, збітых машынай, хворых...

— І сваіх?

— А вы што думаеце, бываюць і такія... Возьмуць сабаку, пародзістага, разумнага, прыгожага. Але не ў стане яго даглядаць: алергія на поўсць, а часцей за ўсё, канешне, проста безадказнасць...

Стала сорамна і няёмка за ўсіх, хто не хоча быць у адказе за тых, каго прыручылі. І прыводзіць сюды свайго гадаванца, і, не гледзячы ў вочы супрацоўнікам пункта, аддае. Можа, знойдзецца добры чалавек, які пагодзіцца ўзяць сабе дарослага сабаку ці ката. А можа, і не...

Выходзім на калідор: абабітыя жалезам дзверы з грозным надпісам «Без сопровождения не входить!». Мы ўсё ж адчыняем дзверы, выціраем ногі аб прамочаны хлоркай кілімок — чысціня перш за ўсё. На кухні: на плітах стаялі агромністыя каструлі. У адной з іх булькала нейкая шэра-карычневая масса (сабак кормяць камбікормам). У другую былі наваленыя неверагодных памераў косці...

У пункт прыёму і часовага ўтрымання жывёл прывозяць кожны дзень з розных раёнаў Мінска. Больш за ўсё заявак паступае ад камунальных службаў прыватнага сектара. Па правілах прытулку, бяздомных або згубленых небаракаў трымаюць толькі на працягу пяці сутак. Усіх, каго не знайшлі гаспадары або не забралі наведвальнікі, усыпляюць...

...Пах проста збівае з ног, і мы разумеем, што наблізіліся да вальераў з сабакамі. У кожнага ёсць свая клетка і будка. Як толькі мы заходзім, пачынаецца жудасная какафонія: сабакі гаўкаюць, выюць, скавычуць, кідаюцца на пруты клетак.

На кожнай клетцы — шыльдачка. «Рычы, 3 месяцы, добры»; «Тыгровы тэр'ер, паўгода, назвалі Дана».

Фота Алены ГОЛУБ.

Калі заходзіш у чыйсьці вальер, суседзі разводзяць гармідар — раўнуюць. Сабакі разумныя, ведаюць, што хтосьці сёння можа знайсці новага гаспадара, а значыць, атрымаць шанц на жыццё. Таму кожны стараецца звярнуць на сябе ўвагу. Хтосьці падае лапу для прывітання, хтосьці адразу лезе «цалавацца». І ва ўсіх сабак адзін выраз у вачах — невыразная туга, мальба і надзея. Такі позірк пранікае прама ў душу, на вачах з'яўляюцца слёзы, і разумееш: не, ты не можаш застацца абыякавым. Як не абыякавыя тыя, хто тут працуе.

Пакідаем гарэзлівых сабак і накіроўваемся да больш спакойных жыхароў гэтага прытулку, коткам. Жывуць яны па двое ў двухпавярховых клетках. Адны сядзяць, забіўшыся ў кут, спужана зіркаючы вочкамі з паўцемры. Іншыя з дапытлівасцю глядзяць, хто да іх прыйшоў.

Калі вочы чалавека і жывёліны сустракаюцца, галоўнае — зразумець, падабаецца вам яна або не, ці гатовы вы прыняць у свой дом і даглядаць яе.

Калі вам яе проста шкада, адкладзіце гэта важнае рашэнне на іншы час. У прытулак кожны дзень прыходзяць сотні людзей, шкадуюць гэтых жывёл, і толькі нямногія забіраюць да сябе. Ім не патрэбна шкадаванне, яны патрабуюць дапамогі.

Працяг гэтай гісторыі быў нечаканым...

Неяк вярталіся дадому пасля вучобы, і ў тралейбусе адчуваем знаёмы пах. Ззаду сядзела дзяўчынка з каробкай на каленях, адкуль раз-пораз даносілася капрызнае бурчанне і скулёж. Дзяўчынка нахілялася і шэптам супакойвала «непаслухмянага» пасажыра, казала, што яны ўжо амаль прыехалі, што хутка яна яго пакорміць і памые. Некаторыя з цікавасцю назіралі за гэтай гісторыяй, усміхаліся, пазіраючы на дзіця, чые вочы зіхацелі ад радасці. А іншыя выказвалі незадаволенасць наконт непрыемнага паху і таго, што ў грамадскім транспарце нельга перавозіць жывёл. Але дзяўчынка не звяртала ўвагі, яна знайшла сябра.

Людзі знаходзяць шлях на вуліцу Гурскага не толькі для таго, каб збыць з рук надакучыўшага гадаванца...

Марына ВАРСЛАВАН,
Алена ГОЛУБ,
студэнткі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ

Жыхары вёскі Малінаўка, што ў Лагойскім раёне, выхадзілі маладога бусла, які пашкодзіў сабе крыло.

На здымку: **Артур АЛХІЛАЕЎ з братам Колем і іх крылаты выхаванец.**

Фота Леаніда ЗАГОРСКАГА.

У ВІДЗАЎСКІМ ПТВ З ЗАПЧАСТАК ДЖЫПА, ГРУЗАВІКА І ЛЕГКАВУШКІ САБРАЛІ ДЗЕЮЧЫ АЎТАМАБІЛЬ-АМФІБІЮ

У Відзаўскім прафтэхвучылішчы (Браслаўскі раён Віцебскай вобласці) навучэнцы і майстры вытворчага навучання з запчастак грузавіка, джыпа і легкавушкі сабралі ўніверсальны транспартны сродак павышанай праходнасці — пазадарожнік-амфібію. Аб гэтым паведаміў намеснік дырэктара Відзаўскага ГПТВ-169 Франц Дубровускі.

Аўтамабіль назвалі «Эксплорэр-Алігатар» — у гонар джыпа «Форд-эксплорэр», кузаў якога яны выкарысталі. Акрамя запчастак амерыканскага аўтамабіля, у ход пайшлі шасі грузавіка ГАЗ-66 і запчасткі ад «Масквіча» і «Волгі». Другое імя — «Алігатар» — машына атрымала за магчымасць пераадольваць водныя перашкоды дзякуючы надзімальнай падушцы, якая працуе ад аўтаномнай пнеўмасістэмы.

Над зборкай і цюнінгам пазадарожніка будучыя слесары-рамонтнікі і вадзіцелі чаравалі на працягу ўсяго трэцяга семестра, а ў канцы навучальнага года адправіліся на машыне ў Мінск на рэспубліканскую выстаўку тэхнічнай творчасці. Паводле слоў Франца Дубровускага, аўтамабіль без перашкод атрымаў дазвол ДАІ на рух па сталіцы, а на самой выстаўцы — высокую ацэнку журы.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

ЕХАЎ «МАН» З СЮРПРЫЗАМ

Як у прамым, так і пераносным сэнсе гэтага слова. Бо інакш і не скажаш, таму што вадзіцель гэтага грузавога аўтамабіля, які прыбыў з Малдовы на пагранічны пункт мытнага афармлення «Новая Гута», што ў Гомельскім раёне, бадзёра заявіў: ніякіх «сюрпрызаў»-нечаканасцяў у кузаве машыны няма. Таму абкладанне тавараў мытнымі пладжамі не павінна быць.

Тым не меней мытнікі і пагранічнікі пачалі рабіць агляд транспартнага сродку. З сабакам. І ў адным патаемным месцы, у спецыяльных скрынях, з пломбамі малдоўскай мытні (зараз яны правяраюцца на т.зв. прадмет фальшывасці) была знойдзена 231 паўлітровая бутэлька каньяку «KVINT «Сюрпрызы». Працяг гэтай справы будзе разглядаць суд.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РАДЫЯЦЫЙНЫ «МЕРСЕДЭС»

У пункце пропуску «Казловічы» беларускія памежнікі затрымалі грузавік «Мерседэс», які «свяціўся» ад радыяцыі.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржкамітэта пагранічных войскаў, дапушчальная норма радыяцыі ў транспартным сродку была перавышана на 0,39 мікразіверта ў гадзіну. Аўтамабіль, дарэчы, вёз з Англіі ў Расію вогнеўпорныя матэрыялы. Радыяцыйны «Мерседэс» правяраюць супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.22	21.08	15.46
Віцебск —	5.06	21.04	15.58
Магілёў —	5.12	20.59	15.47
Гомель —	5.16	20.48	15.32
Гродна —	5.39	21.23	15.44
Брэст —	5.46	21.17	15.31

Месяц

Поўня 30 ліпеня
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Серафіма, Рамана, Сцяпана*
К. *Альфонса, Юсціны, Пятра*

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 01.08.2007

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8—10
Высокі ..... 6—7
Умераны ..... 3—5
Нізкі ..... 1—2

Для бязвоблачнага неба — UV INDEX

З улікам прагназуемай воблачнасці — UV INDEX

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **хх хвілін**.

Надвор'е на заўтра



Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

...у суседзяў

ВАРШАВА	+23 — +25 °C	МАСКВА	+15 — +17 °C
ВІЛЬНЮС	+21 — +23 °C	РЫГА	+22 — +24 °C
КІЕЎ	+15 — +17 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+22 — +24 °C

Без ападкаў

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285–88–81 **№ 18 (236)**

Шыпшына таксама ружа

Шыпшына, ад якой вясной ці ў пачатку лета даносіўся ап'яняльны водар, зараз усыпана вітаміннымі пладамі.

Шыпшыну вырошчваць значна прасцей, чым ружы, — галоўнае, яны не патрабуюць укрыцця на зіму. І разам з тым шыпшына не менш дэкаратыўная, чым ружа. У гарадскіх парках і садах налічваецца да 90 відаў. Шыпшыну ў народзе называюць кладоўкай вітаміну. Каштоўныя ўсе часткі расліны — плады, лісце, сцёблы, карані. У пладах змяшчаюцца арганічныя кіслоты, значная частка вітаміну С, іншыя вітаміны, пекціны, карацін, мінеральныя солі.

У 100 г лісцяў шыпшыны змяшчаецца 400—800 мг вітаміну С. Здаўна яшчэ ў старажытнай усходняй і еўрапейскай медыцыне ружы (шыпшына) лічыліся каштоўнымі за іх цвіценне. Ружа апетая ў вершах і песнях. Гэта сімвал і ўвасабленне кахання. Старажытныя грэкі і рымляне цанілі эфірнае масла з ружаў. Пялёсткі таўклі ў ступках для прыгатавання руковай вады. Выкарыстоўваюцца плады шыпшыны пры розных хваробах печані і жоўцевага пузыра, почак, сэрца, павышанай кіслотнасці страўнікавага соку, туберкулёзе, гіпертаніі.

Адвар з каранёў прымяняюць пры камянях у нырках і гіпертаніі, адвар галінак — пры хваробах страўнікава-кішачнага тракту. Лісце і маладыя карэньчыкі заварваюць як чай і п'юць таксама пры страўнікава-кішачных хваробах, гіпертаніі, хваробах сэрца.

З насення шыпшыны здабываюць алей, багаты на караціноіды. Яго прымяняюць пры трафічных язвах, пролежнях, дэрматозах, апёках, прамянёвых паражэннях скуры.

Збіраць плады трэба ў другой палове жніўня, калі яны набудуць тыповую афарбоўку, да замаразкаў. Падмарожаныя ці высушаныя на сонцы плады робяцца мяккімі, губляюць значную частку вітамінаў (колькасць вітаміну С зніжаецца ў 8—15 разоў), хутка псуюцца. Перад сушкай плады мэтазгодна разрэзаць папалам. Сушаць іх альбо ў духоўцы, пры тэмпературы 60—80 градусаў (пры большай тэмпературы вітаміны разбураюцца), альбо пад дахам у цяні, рассыпаўшы тонкім слоем.

Якія ж віды і гатункі шыпшыны найбольш папулярныя ў садаводаў-аматараў? Гаспадарчае значэнне маюць шыпшына карычная, маршчыністая і звычайная. А гатункі, якія добра зарэкамендавалі сябе ў Беларусі — гэта Вітамінны, Буйнаплодны, Варанцоўскі-3, Расійскі-2, Юбілейны.

Фота Анатоля КЛЕЦЬКА

Каб вызначыць, у якіх пладах больш вітамінаў, памятайце дзве вельмі простыя прыметы:

— пасля выдалення чашалісцікаў на вярхушцы пладоў утвараецца невялікая адтуліна (у малавітамінных відаў яе няма);

— калі чашалісцікі пладоў накіраваныя наперад, то колькасць вітамінаў павышаная, а калі адагнутыя назад, то адносна невялікая. Але гэта не азначае, што такія плады зусім не прыгодныя для вітамінатэрапіі ў хатніх умовах. Проста для прыгатавання настояў ці адвараў з іх трэба браць сыравіны ў 3-4 разы больш.

Найбольш падыходзяць для шыпшыны заходнія і паўднёва-заходнія схілы. Лепш размяшчаць яе так, каб кусты былі закрытыя дрэвамі, платамі ці пабудовамі з боку паўночных і ўсходніх вятроў. Спрыяльныя ўмовы для апылення ствараюцца, калі кусты праветрываюцца лёгкім ветрыкам.

Пасадку лепш за ўсё праводзіць увосень, у каструлю. На другі год прыкаранёвыя парасткі ўкарочваюць на вышыні 60—100 см з мэтай абуджэння і ўтварэння бакавых галінак. У сярэднім атрымліваецца 5—10 галінак або разгалінаванняў. На іх увосень будуць плады. Вясной 3-га года вярхушкі бакавых галінак прышчыкваюць, пакідаючы частку парастка з 3—4 пупышкамі. У далейшым неабходна памятаць толькі адно: усе галінкі пасля 5-гадовага ўзросту трэба выдаляць. Старыя кусты можна амаладзіць, зрэзаўшы надземную частку.

Хачу, каб у мяне было многа лілей

Ліпень — месяц, калі ў садах цвітуць чароўныя лілеі. Якраз у сярэдзіне месяца я завітала на падворак Таццяны і Валерыя Юковічаў, што ў вёсцы Шуневічы Глыбоцкага раёна. І хоць гасцінная гаспадыня сустрэла на прыпынку цягніка (бо да сядзібы было яшчэ добрых кіламетраў пяць), пераблытаць іх двор было немагчыма — адразу звяртаеш увагу на разнаквецце ў палісадніку, пад самымі вокнамі. Прычым уся гэтая прыгажосць спалучаецца з чароўным водарам, які асабліва адчуваўся на зыходзе дня.

Вядома ж, выдзяляюцца пляцістыя ружы, гордая чырвоная манарда красуецца на фоне белай гартэнзіі, кляматысы трымаюцца крыху ўбаку, быццам хочуць каб іх не збыталі з іншымі кветкамі; пачынаюць зацвітаць самых розных адценняў флёксы: белыя, рожавыя, фіялетавыя; тут жа лекавыя эхінацыя і расходнік (очиток); васількі, мяцёлкі астыльбы чырвонай і руковай. І, вядома ж, упрыгажэннем палісадніку з'яўляюцца лілеі. Белыя, жоўтыя, руковыя, з фіялетавай акантоўкай, аранжавыя ў крапінку.

— Мне падабаюцца ўсе кветкі, ад самых ранніх крокусаў да позніх хрызантэм, — гаворыць Таццяна. — Каб іх не прыхапіў мароз, бо цвітуць яны ў мяне аж да снегу, на ноч ім на «галоўкі» адзяваю навалачкі, а калі мароз не адпускае і ўдзень, тады зразаю ўсё гэта і прыгажосць стаіць у мяне ў хаце. І ўсё ж лілеі мяне асабліва радуюць, з іх цвіценнем расцвітае ў мяне душа.

— Яшчэ ў старажытнасці гэтыя кветкі служылі сімвалам нявіннасці і прыметай вытанчанага густу. А самыя старажытныя звесткі аб іх звязаны з Кітаем. Іх бутоны і маладыя парасткі ўжывалі ў ежу, выкарыстоўвалі ў медыцыне. Лілеі — адзін з любімых матываў для малявання. Затым гэта кветка была незаслужана забытая.

— Каб стварыць багатую калекцыю гэтых цыбульных раслін і авалодаць сакрэтамі іх вырошчвання, патрабуецца многа часу, цярпення і ведаў, — працягвае Таццяна. — Яны вельмі адчувальныя да вірусных хваробаў. Ужо ў мінулым стагоддзі быў адкрыты шэраг марозаўстойлівых і вынослівых відаў, а гібрыдныя лілеі паклалі пачатак новым стандартам велічыні кветак. Дыяметр кветкі вагаецца ад 2,5 см да 30 см. Малюткі, такія, як карлікавая лілея, прыгодныя для ракарыя, а двухметровыя гіганты высаджваюць на заднім плане бардзюра. Прыхільнікі лілей часта для іх адводзяць асобную клумбу, але хачу сказаць, што большасць лілей добра адчуваюць сябе сярод кустоў і іншых кветак, вось як у мяне. А пры правільным падборы гатункаў іх кветкі могуць радаваць вока з мая па кастрычнік.

Амаль пра кожную кветачку ў гаспадыні ёсць гісторыя ці легенда аб яе паходжанні. Напрыклад, маргарыткі, якія бы жамчужынкі зіхацяць то тут, то там у палісадніку, маюць многа легендаў. Таццяна расказвае адну з іх, згодна з якой кветку называюць «вечнай прыгажуняй». Расказваецца, як вельмі прыгожую дзяўчыну праследаваў стары. Страціўшы надзею пазбавіцца ад яго, яна звярнулася да багоў. Каб выратаваць дзяўчыну, багі ператварылі яе ў сціплую кветачку, якая цвіце круглы год. У многіх народаў маргарытка з'яўляецца сімвалам дабрыні і сардэчнасці.

Ці яшчэ такая ні чым не прыметная кветка як расходнік (очиток, седум), акрамя ўсіх яе вартасцяў, з'яўляецца і лекавай. Легенда гаворыць, што ў караля не было дзяцей. Слынныя лекары стараліся вылечыць першую асобу дзяржавы, але нікому не ўдавалася. І вось неяк завітаў да яго дзядок і прапанаваў свае паслугі. «Ты што, жартуеш, стары, медыцынскія святцілы спрабавалі вылечыць мяне. Я загадаю цябе пакараць за такое нахабства.» «Пакараць мяне ты заўсёды паспееш, паспрабуй сродак, які я прыгатаваў для цябе.» Ці доўга прымаў той напой кароль, невядома, але ў хуткім часе нашчадак з'явіўся.

Таццяна — аграном па спецыяльнасці, можа таму такая любоў да зямлі, да кветак, усяго, што звязана з зямлёй. Але, на жаль, нават у вёсцы пасада агранома незапатрабаваная. Незапатрабаванымі застаюцца і «залатыя рукі» мужа Таццяны — Валерыя. Два самаробныя трактары, сабраныя з дэталяў, падабраных на звалцы, дапамагаюць у гаспадарцы. Ды часам вясковыя хлопцы на іншамарках пад'язджаюць з просьбай: «Іванавіч, паглядзі, што з маёй машынай». Дэталі з іншамарак не часта выкідваюць на звалку, і тады Валерый, калі не можа дапамагчы, то дыягназ машыне паставіць дакладны.

Кветкі з Таццянінага саду бываюць упрыгажэннем любой урачыстасці: вяселля, дзён народзінаў, школьных святаў. «Я іх даю людзям, а іх у мяне ўсё больш расцвітае», — усміхаецца яна.

Ілля Прарок дзве гадзіны светлага дня ўвалок

2 ЖНІЎНЯ — ІЛЛЁЎ ДЗЕНЬ

У народзе кажуць: калі прыйшоў Пятрок, апаў лісток, калі прыйшоў Ілля, апалі два. Гаварылі, што Ілля лета канчае.

На Іллю да абеду можа быць лета, а пасля абеду — восень. Па народных прыметах у гэты дзень абавязкова ідзе дождж. А таксама калі дождж на Макавея (14 жніўня) і на Узвіжанне (27 верасня) — чакай шчодрага ўраджаю на наступны год.

Ілля — своеасаблівы дзень адліку многіх гаспадарчых работ і хатніх спраў. Калі да Іллі жыта прыбрана, то сяўбу азімых заканчвай да Флора і Лаўра (да 31 жніўня), а калі жыта выспявае пазней, то і сеяць трэба пазней — да Сямёнавага дня (да 1 верасня).

У Іллёў дзень у вёсках выпякалі першыя калабкі і пампушкі са збожжа новага ўраджаю, прыносілі з поля сноп і ставілі ў чырвоны кут хаты: у жніўні жніву канец, хлеб на зіму назапашаны.

Строга забаранялася праводзіць дамашнія ці хатнія работы: касіць, жаць, прыбіраць у хаце, складваць сена. Незахаванне ўсіх гэтых правілаў магло прывесці да пажару, наклікаць на населены пункт і гаспадарчыя ўгоддзі шквалістыя вятры і моцныя дажджы.

Іллёў дзень — крайні тэрмін сенакосу: «Да Іллёва дня ў сене пуд мёду, а пасля — пуд гною».

На Іллёў дзень жывёлу не выганялі ў поле, асцерагаючыся навальніцы і маланкі.

Іллёў дзень — час абнаўлення месца для стаянкі пчальніка (пры качоўцы на разнатраўях). У гэты дзень пчолы маглі раіцца, што сама па сабе з'ява для гэтага часу даволі рэдкая. Аднак «Іллёўскі рой не на карысць», таму што час позні, пчолы не паспеюць запасціся мёдам.

Іллёўскія дажджы ўсе ж лічыліся гаючымі. Жанчыны збіралі «іллёвую» ваду і потым умываліся ёю, ратуючыся ад «дрэннага вока».

З Іллёвага дня ноч доўгая, а вада халодная.

Гэты дзень лічыўся пачаткам паляўнічага сезона. Калі на Іллёў дзень удавалася вярнуцца з палявання са здабычай — удача ўвесь сезон.

На Іллю ў храмах асвячалі ваду і лілеі ў свой калодзеж, каб вада не псавалася.

Расліны — сябры здароўя

◆ Адвар ягад агрэсту прымяняюць пры захворваннях страўнікава-кішачнага тракту, пры запорах і як мачагонны сродак. 1 ст. лыжку ягад агрэсту заліваюць 200 мл кіпеню, гатуюць 10 хвілін, ахалоджваюць, працэджваюць. Прымаюць па 1/4 шклянкі 4 разы на дзень, дадаючы (калі трэба) цукар на смак.

◆ Пры насавым крывацёку са свежых здробненых лісцяў вішні робяць тампон і закладваюць яго ў ноздру.

◆ Водны настой маркоўніку, завараны як чай, ужываюць пры гемароі. 1 ст. лыжку маркоўніку заварваюць 1 шклянкай кіпеню.

◆ Пры расстройстве кішэчніка рэкамендуецца нашча піць гарачы чай са зверабою і крываўніку (тысячалісніку), узятых у роўных частках. Для яго прыгатавання 1 ст. лыжку сушанай сумесі заліваюць 250 мл закіпеўшай вады, але не крутым варам. Настойваюць 8—10 хвілін, працэджваюць і выпіваюць.

1 жніўня

Дзве даты

1498 год — Хрыстафор Калумб упершыню ўбачыў берагі Амерыкі, якую ён спачатку прыняў за востраў. На самай справе Трынідад і з'яўляецца востравам, крыху пазней, увайшоўшы ў вусце дэльты ракі Арынока. Быў адкрыты паўвостраў Парыя — узбярэжжа Паўднёвай Амерыкі.



1767 год — 240 гадоў таму па ініцыятыве і на сродкі магната Міхала Казіміра Агінскага пачалося будаўніцтва Агінскага канала, які злучыў басейны рэк Нёмана і Дняпра. Канал адкрыў магчымасць для экспарту лесу і іншых тавараў праз балтыйскія порты, таму яго будаўніцтва было падтрымана Варшаўскім сеймам 1768 года, які пастанавіў падарыць М.К. Агінскаму мястэчка Лагішын і вёску Мышкаўцы з навакольнымі землямі і дазволіў з пачаткам сплаву браць пошліну «па 8 злотых з вясла ці кола». Завяршылася будаўніцтва канала ў 1783 годзе, а цалкам суднаходным ён стаў у 1840 годзе.

Цытата дня:

«Многія жаночыя праблемы, перад якімі пасуюць найлепшыя псіхіятры, часта вырашае цырульнік другой катэгорыі».

Мэры Манкарці.

Інфарм-укол

ПАХ «НОВАЙ МАШЫНЫ» НЕБЯСПЕЧНЫ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

Знакаміты «пах новага аўтамабіля», які часам так падабаецца пакупнікам, можа быць небяспечны для здароўя!

Паводле слоў экспертаў з амерыканскай арганізацыі «Экалагічны цэнтр», яны вывучалі пахі каля 200 новых мадэляў гэтага і мінулага года. І аказалася, што знакаміты «водар новай машыны» змяшчае ў сабе мноства шкодных рэчываў. У некаторых мадэлях паветра ў салоне насычана парамі клею, фарбаў, вінілу, пластыку.

Яны здольныя выклікаць галавакружэнні, млоснасць, слабасць і іншыя «нядобрыя рэакцыі».

У спіс аўтамабіляў з небяспечным пахам трапіла некалькі Chevrolet (у тым ліку і папулярны ў нас Aveo), Hyundai Accent, Kia Rio і Kia Spectra, Nissan Versa, Subaru Forester і шэраг іншых мадэляў.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

Аўтаадказчык

СКРЫПЯЦЬ МАЕ «ЛАПЦІ»

Што рабіць, калі пачалі скрыпець тармазныя калодкі?

Вячаслаў Гарэцкі, Быхаў

Найперш праверце тэхнічны стан тармазнога дыска. Калі ён не вельмі моцна зношаны, то можна проста перавярнуць адваротным бокам і зноў прыладзіць на месца. У выпадку «безнадзейнай» зношанасці дыск замяніце. Пасля памянёных «працэдур» дайце калодкам час на прыцірку да дыска.

Зусім верагодна, што пераварочваць ці мяняць дыск не спатрэбіцца. Дастаткова зняць фаску шырынёй 5 міліметраў з краю калодкі на левай і правай гранях. Але ні ў якім разе не зачышчайце наждаком паверхню дыска, каб ліквідаваць шум. Нельга таксама наносіць на дыскі змазкі агульнага прызначэння: разам са скрыпам знікнуць і тармазы. Ёсць, праўда, спецыяльная змазка для барацьбы са скрыпам, зробленая на сіліконавай ці каўчукавай аснове. Але перад яе прымяненнем абавязкова пракансультуйцеся ў спецыяліста.

Аўтапарады

ЯК УХІЛІЦЦА АД «ЛЯТАЮЧЫХ КАМЯНЁЎ»

Участак дарогі, які рамантуецца, тоіць для вадзіцеляў нямала непрыемных сюрпрызаў, самымі распаўсюджанымі з якіх з'яўляюцца «лятаючыя камяні». Яны нагадаюць пра сябе бесперапынным грукатам па днішчу аўтамабіля. Аднак найбольшую небяспеку нясуць каменьчыкі, якія вылятаюць з-пад колаў транспартных сродкаў, што рухаюцца ў спадарожным і нават сустрэчным напрамку. Каб не трапіць «пад абстрэл» спадарожных аўто, трэба вытрымліваць як мага большую дыстанцыю. Ухіліцца ад «каменных выкідаў» сустрэчных машын можна наступным чынам: з'ехаць, наколькі магчыма, на правы бок дарогі і рухацца з хуткасцю не больш за 10 кіламетраў у гадзіну. Аднак нават такіх мераў перасцярогі будзе недастаткова, калі насустрач вам выедзе грузавік. Такія аўтамабілі, асабліва з прычэпам, шчодра раскідваюць камяні ва ўсе бакі. Таму пры набліжэнні да грузавіка лепш увогуле спыніцца і міргнуць яму фарамі, каб вадзіцель зменшыў хуткасць і праехаў як мага асцярожней.

Аўтабяспека

П'ЯНАЯ РЫЗЫКА

Памыляюцца тыя вадзіцелі, якія лічаць, што ад аднаго кілішка гарэлкі іх здольнасці кіраваць транспартным сродкам не пагоршацца.

Паводле слоў старшага інспектара спецпадраздзялення «Страла» МУС краіны Марыі Юркевіч, нават самыя нязначныя дозы спіртнога, выпітага вадзіцелем, могуць прывесці да бяды. У прыватнасці, як сведчаць даследаванні, пасля ўжывання 150 грамаў гарэлкі верагоднасць здзяйснення аварыі вадзіцелем павялічваецца ў 5—10 разоў. Пры гэтым небяспека загінуць узрасце больш чым у 2,5 раза, атрымаць раненне — у 2 разы.

Аўтапрам

НАРОДНАЯ «ВОЛГА»

Горкаўскі аўтазавод плануе наладзіць выпуск таннага аўтамабіля.

Кошт народнай «Волгі» будзе складаць каля 3 тысяч долараў. Канцэрн «ГАЗ» плануе штогод выпускаць і прадаваць амаль 1 мільён такіх аўто. Вось толькі дакладна невядома, калі пачнецца вытворчасць народнай «Волгі», бо пакуль распрацоўшчыкі нават не могуць сказаць, як будзе выглядаць гэтая мадэль.

Аўтанавінка

ВОЗ З РУХАВІКОМ УНУТРАНАГА ЗГАРАННЯ

Японскія ўмельцы сканструявалі аўтамабіль з дрэва. Праўда, рухавік, шыны і падвеска ў гэтым транспартным сродку зроблены з традыцыйных для звычайных аўтамабіляў матэрыялаў. А вось усё астатняе, у тым ліку і дыскі — драўляныя. Кошт такога воза з рухавіком унутранага згарання складае 32,5 тысячы рублёў.

Аўтажарт

Едзе па дарозе таксіст. Яго даганяе калега, махае рукой і крычыць:

— У цябе кола грукае!

— Што, што?

— Я кажу: у цябе кола грукае!

— Што?

— Ды кола ў цябе грукае як барабан!

— Кажы гучней, бо ў мяне кола грукае!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.227. Індэкс 63850. Зак. № 4121. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12